Пакуль стаялі ў натоўпе, высветлілі, што Цімаці прыязджае сюды адзін-два разы на тыдзень на сваёй аранжавай машыне. Такой машыны няма ні ў кога ў Маскве! Ён спецыяльна яе ў аранжавы колер пафарбаваў, каб не скралі. Цімаці вельмі веруючы, гэта вынікае з велічыні залатога крыжа, які ён носіць на майку. Яшчэ Цімаці паважаюць усе святары. Ён дае шмат грошай на аднаўленне храма. Праблема толькі ў адным – ніхто не ведае, калі ён прыедзе, вось і чакаюць яго тут дзень і ноч на працягу ўсяго тыдня.
Мы прыкінулі з Сонькой – калі па пяцьсот рублёў два разы на тыдзень, то ў месяц набярэцца чатыры тысячы – нядрэнная прыбаўка да стыпендыі. Трэба стаяць, што б ні здарылася, стаяць.
Праз гадзіну ў стоме мы апусціліся на кукішкі і чакалі так. А яшчэ праз паўгадзіны, калі канчаткова зацяклі ногі, мы адышлі да царкоўнага плота і прыселі каля яго. Так было зручней.

Через час от усталости мы опустились на корточки и ждали так. А ещё через полчаса, когда окончательно затекли ноги, мы отошли к каменному заборчику у церкви и присели около него. Так было удобнее.
Солнце зашло за купола, и от них по площади потянулась длинная тень. Голуби топтались по асфальту. Изредка проходили люди.
Казалось, что так было всегда – церкви, голуби, люди. И даже когда нас не будет, станут жить совсем другие люди, всё равно также будут стоять церкви, а возле них будут бегать серые голуби.
И наверное, все люди, которые когда-нибудь стояли возле церковного забора и смотрели на голубей, думали о том же самом. Мне приятно переживать заново их мысли.

Помню, мама рассказывала мне историю о моей прабабушке. А я пыталась себя представить в этой старушке и почувствовать, что переживала она в то время. Но у меня не получалось. Может, оттого, что я почти ничего не знала про неё…
Я знаю, что её звали Ксения, и знаю один факт из жизни, который позволяет моему воображению нарисовать её. Прабабушка жила в маленькой умирающей деревеньке. Всю свою жизнь, до глубокой старости, она вставала рано утром, до рассвета, и плыла на лодке в соседнее село, где стояла церковь. Прабабушка не пропустила ни одной службы. Всегда поспевала к началу. Она всё время у меня перед глазами. Дряхлая худенькая старушка в зелёной кофте гребёт вёслами и разбивает лунное отражение в реке... Она молилась за всех нас, даже когда мы ещё не родились. А где она теперь?

Сонца зайшло за купалы, і ад іх па плошчы пацягнуўся доўгі цень. Галубы тупалі па асфальце. Зрэдку праходзілі людзі.
Здавалася, што так было заўсёды – цэрквы, галубы, людзі. І нават калі нас не стане, будуць жыць зусім іншыя людзі, усё роўна будуць стаяць цэрквы, а каля іх будуць мітусіцца шызыя галубы.
І напэўна, усе людзі, якія аднойчы стаялі каля царкоўнага плота і глядзелі на галубоў, думалі пра тое ж самае. Мне прыемна перажываць наноў іх думкі.

Памятаю, мама распавядала мне гісторыю маёй прабабулі. А я імкнулася ўявіць сябе старой і адчуць, што перажыла яна ў свой час. Але ў мяне не атрымлівалася. Можа, таму, што я амаль нічога пра яе не ведала...
Толькі тое, што яе звалі Ксеніяй, і адзіны факт з жыцця, які дазваляе майму ўяўленню дамаляваць яе. Прабабуля жыла ў маленькай паміраючай вёсачцы. Усё сваё жыццё, да глыбокай старасці, яна ўставала да світання і плыла ў чоўне ў суседнюю вёску, дзе стаяла царква. Прабабуля не прапусціла ніводнай службы. Заўсёды паспявала да пачатку. Яна ўвесь час у мяне перад вачыма. Лядашчая худзенькая бабулька ў зялёнай кофце старанна вяслуе і вёсламі разбівае адлюстраванне месяца ў рацэ... Яна малілася за ўсіх нас, нават калі мы яшчэ не нарадзіліся. А дзе яна цяпер?
Я ўглядаюся ў нябесную вышыню, па якой плывуць паважныя аблокі, і ўяўляю прабабулю, якую ніколі не бачыла. Мне не здаецца гэта звышнатуральным, што недзе там, зверху, жыве яна і астатнія людзі. Яны ведаюць пра нас, моляцца і просяць.

Я вглядываюсь в небесную вышину, по которой плывут степенные облака, и представляю прабабушку, которую никогда не видела. Мне не кажется это сверхъестественным, что где-то там, сверху, живёт она и остальные люди. Они знают о нас, молятся и просят.
Я живу в городе, где церкви на каждом шагу, но никак не могу зайти и просто поставить свечку за всех, кто был до меня. За прабабушку.
Я стала другой. За последнее столетие всё стало другим.
А каким будет тот мир, в котором будут жить мои дети? Церкви останутся прежними, я в этом уверена. Но вот сочтут ли люди будущего возможным зайти туда и помолиться, вспомнят ли нас? Найдут ли за что вспомнить?
Надо им всё объяснить... Надо, но я не умею. Я не могу выразить словами всё то, что чувствую. Я умею только молчать. Наверное, я должна была родиться немой, но в последний момент Господь наградил меня голосом, чтобы я смогла сама себе покупать в магазине краски и наконец-то выучилась на эту «изошку».

– Слушай, Лен, а Бог есть?
Я испуганно посмотрела на Соньку. Думала, шутит. Но она не улыбалась.
– Наверное, – пожала плечами.
– Тогда давай зайдём, – она указала в сторону входной двери.
– Зачем?
– Ну, ты знаешь, что сделать, чтобы исполнилось желание? Ну там свечки поставить, ещё что-то.
– А чего ты хочешь?

Я жыву ў горадзе, дзе цэрквы на кожным кроку, але ніяк не магу зайсці і проста паставіць свечку за ўсіх, хто быў да мяне. За прабабулю.
Я стала іншай. За апошняе стагоддзе ўсё стала іншым.
А на што будзе падобны свет, у якім давядзецца жыць маім дзецям? Цэрквы застануцца ранейшымі, я ў гэтым упэўнена. Але вось ці палічаць людзі будучыні магчымым зайсці туды і памаліцца, ці ўспомняць пра нас? Ці знойдуць што ўспомніць?
Трэба ім усё патлумачыць... Трэба, але я не ўмею. Я не магу выказаць словамі ўсё тое, што адчуваю. Я ўмею толькі маўчаць. Напэўна, я павінна была нарадзіцца нямой, але ў апошні момант Гасподзь узнагародзіў мяне голасам, каб я змагла сама купляць сабе ў краме фарбы і вывучыцца нарэшце на «мастачку».

– Слухай, Лен, а Бог ёсць?
Я спалохана зірнула на Соньку. Думала, жартуе. Але яна не ўсміхалася.
– Напэўна, – паціснула плячыма.
– Тады давай зойдзем, – яна паказала ў бок ўваходных дзвярэй.
– Навошта?
– Ну, ты ведаеш, што зрабіць, каб споўнілася жаданне? Свечкі там паставіць, яшчэ нешта.
– А чаго ты хочаш?
– Таго самага. Ці ты да ночы збіраешся тут стаяць?
– Не збіраюся.

– Того же самого. Или ты до ночи собираешься здесь стоять?
– Не собираюсь.
– Идём тогда?
– Идём.
Народу в храме было немного. В основном стояли у алтаря.
Купили по свечке, поставили их у образа Божьей Матери. Я забыла даже про желание. Зато Сонька долго выговаривала просьбу, беззвучно шевеля губами.
Бабушка в чёрном собирала огарки с подсвечника, неодобрительно поглядывала на нас и ворчала, что мы в штанах и без косынок. А это вообще недопустимо. «Вот вселится бес, буте знать, что это!»
Стало неловко за наш вид: кофты со стразами, джинсы, у Соньки вообще разрез на спине, и плечо совсем оголилось.
– Пойдём, – потянула её к выходу.
– А теперь он приедет? Мы всё правильно сделали?
– Да приедет, приедет.
На улице было куда комфортнее стоять, здесь мы не привлекали внимания.
Толпа ожидающих заметно увеличилась. Наверное, некоторые подошли после работы. Сонька забеспокоилась, что на всех не хватит денег. На этот раз я не стала её разубеждать. Мне и самой так казалось.
Возле «Олимпийского» остановились длинные автобусы. Из них высыпали школьники с разноцветными ранцами. Началась толкотня. Бегали взволнованные учителя, успокаивали детей. Мы наблюдали за ними через пло-

– Хадзем тады?
– Хадзем.
Народу ў храме было няшмат. У асноўным стаялі каля алтара.
Купілі па свечцы, паставілі іх да абраза Божай Маці. Я забылася нават пра жаданне. Затое Сонька доўга вымаўляла просьбу, бязгучна варушачы вуснамі. Бабуля ў чорным збірала недагаркі з падсвечніка, няўхвальна пазірала на нас і бурчэла, што мы ў штанах і без хустак. А гэта наогул недапушчальна. «Вось уселіцца нячысты, будзеце ведаць!»
Стала няёмка за наш выгляд: кофты са стразамі, джынсы, у Сонькі наогул разрэз на спіне і плячо зусім агаліліся.
– Пайшлі, – пацягнула яе да выхаду.
– А цяпер ён прыедзе? Мы ўсё правільна зрабілі?
– Прыедзе, прыедзе.
На вуліцы было куды больш камфортна стаяць, тут мы не прыцягвалі ўвагі.
Натоўп прыкметна павялічыўся. Напэўна, некаторыя падышлі пасля працы. Сонька занепакоілася, што на ўсіх не хопіць грошай. На гэты раз я не стала яе пераконваць. Мне і самой так падалося.
Каля «Алімпійскага» спыніліся доўгія аўтобусы. З іх высыпалі школьнікі з рознакаляровымі ранцамі. Пачалася штурханіна. Бегалі ўсхваляваныя настаўнікі, супакойвалі дзяцей. Мы назіралі за імі праз плошчу. Вось ім раздалі квіткі, і яны сталі ў чаргу перад турнікетамі, каб нарэшце ўбачыць на вялікай сцэне зорак. А там і «Фабрыка», і Манга, і Джокер... Сонька ледзьве не плакала. Я сядзела ў метры ад яе, абапёршыся спінай аб плот, складала

щадь. Вот им раздали билеты, и они выстроились в очередь перед турникетами, чтобы, наконец, зайти внутрь и увидеть на большой сцене звёзд. А там и «Фабрика», и Манго, и Джокер… Сонька чуть не плакала. Я сидела в метре от неё, облокотившись спиной о забор, составляла из камушков бессмысленную картинку и думала, что всё у нас идёт не так, как должно быть. А вдруг сейчас, в эту секунду, на нас смотрит Бог и скорбит оттого, что мы такие. Мы не сможем оправдаться – не получится. Почему-то стало грустно.

Толпа людей вглядывалась в поток машин и всё ждала, ждала, когда же в нём мелькнёт заветное оранжевое пятно.

з каменьчыкаў бессэнсоўную карцінку і думала, што ўсё ў нас ідзе не так, як павінна быць. А раптам цяпер, у гэтае імгненне, на нас глядзіць Бог і смуткуе з таго, што мы такія. Мы не зможам апраўдацца – не атрымаецца. Чамусьці стала прыкра.

Натоўп узіраўся ў плынь машын і ўсё чакаў, чакаў, калі ж мільгане запаветная аранжавая пляма.

Сергей Лагодин

Перевод на белорусский язык Татьяны Сивец

Сяргей Лагодзін

Пераклад на беларускую мову Таццяны Сівец

Сергей Лагодин родился 11 января 1990 года в с. Нерчинский Завод Забайкальского края. В 2011 году окончил экономический факультет ЗабГГПУ им. Н. Г. Чернышевского. В 2011 году поступил в магистратуру того же учебного заведения на исторический факультет. Публиковался в литературно-художественном журнале «Встречи» № 3 2011 года.

Сяргей Лагодзін нарадзіўся 11 студзеня 1990 года ў с. Нерчынскі Завод Забайкальскага краю. У 2011 годзе скончыў эканамічны факультэт ЗабГГПУ імя М. Г. Чарнышэўскага. У 2011 годзе паступіў у магістратуру той жа навучальнай установы на гістарычны факультэт. Публікаваўся ў літаратурна-мастацкім часопісе «Встречи» № 3 2011 года.

ДЖУЛАЙ

Жил он у самой реки на отшибе. И часто, по весне, его дом затопляла река.

Уже никто не строил своих домов у реки, а те, кто и решался по глупости построить, сразу перебирались подальше – вверх от весенней злой воды. Так и был его дом – один у реки. Да и сам он жил один.

Как я помнил, он всё время жил один, и никто к нему не приезжал. Я как-то спросил у матери, есть ли у этого деда семья. Она в это время месила тесто на хлеб. Тут сразу оставила работу, задумалась и вымолвила:

– Да я и не помню, кто у него и был. Вроде всю жизнь бобылём прожил.

А потом опять начинала своими белыми руками поднимать мучную пыль, приговаривая про себя: «Вот бедный дед Василь, совсем себе никого не нажил. Ведь так и помрёт совсем один».

Мне было его жалко.

Все в деревне его звали дед Василь, а я просто – Дед.

Часто я помогал ему. Мать просила меня:

– Сходи к деду Василию. Мужики привезли на зиму дров ему, а раскалывать-то не кому. Помоги ему, а то он немощный уже.

Меня не надо было просить, я сам ходил к нему. Помогал ему по хозяйству: носил воду, колол дрова. Он никогда не говорил «спасибо». Я и не ждал благодарностей.

ДЖУЛАЙ

Жыў ён каля самай ракі, наводшыбе. І часцяком па вясне яго дом падтапляла рака.

Ужо ніхто не будаваў дамоў каля ракі, а тыя, хто рашаліся на такое глупства, адразу перабіраліся падалей ад вясновай злой вады.

Так і стаяла яго будыніна – адна каля ракі. Ды і сам ён жыў на адзіноце.

На маёй памяці, ён увесь час быў адзін, і ніхто да яго не прыязджаў. Я неяк запытаў у маці, ці ёсць у гэтага дзеда сям'я. Яна тым часам мясіла цеста на хлеб. Тут пакінула працу, задумалася і прамовіла:

– Ды я і не памятаю, ці быў у яго хто. Бадай, усё жыццё бабылём пражыў.

А потым зноў пачала сваімі белымі рукамі ўздымаць мучны пыл, прыгаворваючы:

– Вось бедны дзед Васіль, зусім сабе нікога не нажыў. Так і памрэ самотнікам.

Мне было шкада яго.

Усе ў вёсцы звалі яго дзед Васіль, а я казаў проста Дзед.

Я часта дапамагаў яму. Маці прасіла:

– Схадзі да дзеда Васіля. Мужыкі прывезлі дроў яму на зіму, а пасячы няма каму. Дапамажы, а то ён нямоглы ўжо.

Мяне не трэба было прасіць, я сам хадзіў да яго. Дапамагаў па гаспадарцы: насіў ваду, сек дровы. Ён ніколі не казаў «дзякуй». А я і не чакаў падзякі.

Он вообще был молчаливым, говорил редко. Иногда только бормочет что-то сам себе в свою светлую бороду. Кажется, хочет сказать, начнёт, а не получается говорить длинно. Борода, видимо, съедает все его слова. Таких людей, как дед, называют нелюдимыми.

Я был не совсем прав, сказав, что он жил совсем один. У него была коза, старая. Которая уже давно не давала молока, ходила плохо, а дед её любил. Заботился о ней как о ребёнке. Между козой и дедом я находил некоторые сходства. Например, водил дед козу в поле за деревню, чтобы она там прогулялась. Идут вместе – впереди с костылём, прихрамывая на левую ногу, шёл дед, а следом плелась коза, тоже почему-то прихрамывая на заднюю левую ногу. Да и бороды у них были похожи – седые.

Мне было интересно, почему про него так мало знали в нашей деревне. Деревня же была маленькая, как «крошка» хлебная! Все друг про друга знали абсолютно всё.

Слышал я только, что он приехал в нашу деревню, когда ему было где-то лет тридцать. Был он крепким мужчиной.

– Не красавцем, но девки за ним бегали, – вспоминала наша соседка – старая женщина. – Потому что не пил и хозяйство умел держать.

Зарабатывал он тем, что помогал всем, кто попросит по хозяйству, в общем калымил. То сено летом поможет накосить, то дрова наготовить, то сруб поставить. Его уважали. Ведь не пил и не курил. И притом работал.

У самой реки построил дом и стал там жить.

Ён наогул быў маўчун, гаварыў рэдка. Часам толькі прамармыча штось сабе ў бараду. Здаецца, хоча сказаць, а не атрымліваюцца доўгія прамовы. Барада, мабыць, з'ядае ўсе словы. На такіх людзей, як дзед, кажуць «мармоль».

Я, бадай, не зусім меў рацыю, сказаўшы, што ён жыў зусім адзін. У яго была каза, старая. Якая даўно ўжо не давала малака, хадзіла цяжка, але дзед яе любіў. Клапаціўся пра яе, як пра дзіця. Нешта агульнае я знаходзіў паміж казой і дзедам. Напрыклад, вядзе дзед казу ў поле за вёску, каб яна там папасвілася. Ідуць разам – паперадзе з мыліцай, накульгваючы на левую нагу, дзед, а следам пляцецца каза, таксама чамусьці накульгваючы на заднюю левую нагу. Ды і бароды ў іх былі падобныя – сівыя.

Мне было цікава, чаму пра яго так мала ведалі ў нас. Вёска ж была маленькая як асушак хлебны! Усе адно пра аднаго ведалі абсалютна ўсё.

Чуў я толькі, што прыехаў ён у нашу вёску, калі яму было дзесьці гадоў пад трыццаць. Быў ён дужым мужчынам.

– Не прыгажуном, але дзеўкі за ім бегалі, – узгадвала наша суседка – старая жанчына. – Бо не піў і гаспадарку трымаў.

Зарабляў ён тым, што дапамагаў кожнаму, хто папросіць, калыміў, адным словам. То сена накосіць, то дровы нарыхтуе, то зруб паставіць. Паважалі яго. Бо не піў і не курыў. І да таго ж працаваў. Каля самай ракі паставіў дом і пачаў там жыць.

– А давайце ў яго казу ноччу звядзём, выпэцкаем яе ўсю дзёгцем, раніцаю ён прачнецца, а яна ўся чорная, – Колька заўжды падбіваў хлопцаў на свавольствы.

– А давайте у него козу ночью уведём, вымажем её всю дёгтем, а по утру он проснётся, а она вся чёрная, – Колька всегда подбивал всех мальчишек на шалость.

Он был старше всех нас. У него были большие и сильные руки, поэтому мы его боялись.

– Я не пойду, – мне было страшновато отказывать, но и одинокого деда обижать мне тоже не хотелось.

Все остальные пацаны посмотрели на меня как на припадочного. Всем было понятно, что Колька меня не поймёт и не простит.

– Чё, ты как девка ломаешься?! – начал грозить мне Колька. – Идут все. Или ты не пацан?

– Я не пойду, – повторил я.

В одно мгновение мне прилетел хороший удар в лицо от Кольки. От неожиданности я упал на землю. Попал точно в глаз.

– Пойдёмте отсюда. Пусть посидит и подумает, – довольный Колька. – А если кому проговоришься, то тебе худо будет. Понял? – Колька не простил мне ослушания.

Я ничего не ответил. Он и не ждал ответа. Он понимал, что я ничего не скажу. Я догадывался, что меня потом ждёт.

Я обедал после школы, когда мать зашла и сказала:

– Слыхал, у деда-то Василия козу украли. Он бедный утром рано вышел покормить, а её нет.

– И…

Ён быў старэйшы за ўсіх нас. У яго былі вялікія і дужыя рукі, таму мы яго баяліся.

– Я не пайду, – мне было страшнавата адмаўляць, але і самотнага дзеда крыўдзіць мне таксама не хацелася.

Пацаны пазіралі на мяне як на дзівака. Усім было ячна, што Колька не зразумее і не даруе.

– Чаго як дзеўка манежышся?! – пачаў пагражаць мне Колька. – Ідуць усё. Ці ты не пацан?

– Я не пайду, – паўтарыў я.

У імгненне я атрымаў удар у твар ад Колькі. Я не чакаў і паваліўся на зямлю. Пацэліў ён дакладна ў вока.

– Хадзем адсюль. Хай пасядзіць і падумае, – Колька быў задаволены. – А калі скажаш каму, то табе дрэнна будзе. Уцяміў? – Колька не дараваў мне непаслушэнства.

Я нічога не адказаў. Ён і не чакаў адказу. Ён разумеў, што я нічога нікому не скажу. Я здагадваўся, што мяне чакае пасля.

Я абедаў пасля школы, калі маці зайшла і сказала:

– Чуў, у дзеда Васіля казу ўкралі. Бедны, ранкам выйшаў даць ёй, а казы няма.

– І...

– Ходзіць цяпер, шукае. Шкада дзеда, адна каза ў яго была. І тая прапала. Паеш ды ідзі дапамажы яму ў пошуках, а то шкада старога.

Я ўскочыў і пабег да дзеда.

– А есці хто будзе?! – пачуў я ўслед.

– Ходит теперь, ищет. Жалко деда, одна коза у него была. И та пропала.
– Поешь да иди помоги ему в поисках, а то жалко старого.
Я тут же побежал к деду.
– А кушать кто будет?! – услышал я вслед.
– Потом.
Дед был у себя. Сидел он на завалинке как крючок – что-то тяжелое, невидимое клонило его к земле. Я стоял около калитки, не решался зайти. Отчего-то я чувствовал свою вину, и мне было стыдно.
– Дед Василь, что случилось? – крикнул я ему.
Он посмотрел на меня как в пустоту. Не узнал. Ничего не ответил.
Я не знал, что ему сказать дальше, с чего начать. Все мои слова потерялись. Да и что говорить, ведь я знал, чьих это рук дело. Я всё знал и ничего не мог сделать. Но проговориться мне было нельзя.
Я стоял и не знал, что делать, хотя сердце что-то подсказывало…
Через пять минут я уже был за школой – там во дворе часто собирался Колька с пацанами. Вчера там был и я, пока не получил смачную вяху.
Колька с пацанами был на месте. Было страшно получить ещё, но я решил сразу начать.
– Где коза? – спросил я, собрав всю свою скуластую пацанью волю.
– Какая коза? – Колька улыбался нахально, с вызовом.
– Деда Василия! – хотел сказать я свинцово, но от волнения голос сорвался, и в конце я дал «петуха»: – Я знаю, что ты её украл! Где она?
– Я ничего не знаю, – сказал он спокойным голосом. – А что, ты уже всем растрепал, что это я?

– Потым.

Дзед быў у сябе. Сядзеў ён на прызбе як кручок – штосьці цяжкое, нябачнае хіліла яго да зямлі. Я стаяў каля брамкі, не адважваўся зайсці. Чамусьці я адчуваў сваю віну, мне было сорамна.

– Дзед Васіль, што здарылася? – выгукнуў я.

Ён паглядзеў на мяне як у прорву. Не пазнаў. Нічога не адказаў.

Я не ведаў, што яму сказаць далей, з чаго пачаць. Усе мае словы згубіліся. Ды і што казаць, калі я ведаў, чыіх гэта рук справа. Я ўсё ведаў і нічога не мог зрабіць. Але прагаварыцца мне было нельга.

Я стаяў і не мог даўмецца, што рабіць, хоць сэрца штось падказвала...

Праз пяць хвілін я ўжо быў за школай – там у двары часта збіраліся пацаны. Учора там быў і я, пакуль не атрымаў смачную вяху. Колька з пацанамі быў на месцы. Было страшна атрымаць яшчэ, але я вырашыў пачаць адразу.

– Дзе каза? – спытаў я, сабраўшы ўсю сваю скуластую хлапчыную волю.

– Якая каза? – Колька ўсміхаўся нахабна, з выклікам.

– Дзеда Васіля! – хацеў сказаць я свінцова, але ад хвалявання голас сарваўся, і ў канцы я пусціў «пеўня»: – Я ведаю, што ты яе скраў! Дзе яна?

– Я нічога не ведаю, – прамовіў ён спакойным голасам. – А што, ты ўжо ўсім размянціў, што гэта я?

– Не, я нікому не казаў... Казу ты мусіш вярнуць або...

– Або што?.. Ідзі ты ведаеш куды... – прашыпеў Колька і ў гэты ж самы момант падскочыў да мяне і ўдарыў у сківіцу.

– Нет, я никому не говорил… Козу ты должен вернуть или…
– Или что?.. Иди ты знаешь куда… – ядовито прошипел Колька и в это же самое мгновение подскочил ко мне и ударил в челюсть.
Заболела челюсть. А сердце билось где-то у кадыка, невыносимо больно и до слёз.
Я пошёл обратно к деду. Он был там же – на завалинке. Сидел неподвижно, с закрытыми глазами.
«А вдруг, пока я ходил, он умер», – эта дурная мысль вкралась в мою голову так вдруг, что меня накрыло чувство невосполнимого вакуума. И я, до этого живой, с сильным сердцем, почувствовал, что всё во мне оборвалось в эту пустоту.
– Дед Василь, что с тобой?! – подбежал я к нему и начал трясти за плечи.
Он открыл глаза и посмотрел на меня.
– Пойдём чаевать, – только и сказал.

Он пожарил картошку на сале – до черноты. И заварил очень густой чай, который заставлял часто биться сердце. Глоток, и я чувствовал себя живым.
Вдруг он заулыбался, заговорил.
– Вот сегодня сон мне снился, – начал он. – Снится, что черти меня на сковороде жарят. И этими меня тыкают… вилами своими… Ну, ты понимаешь… И вот что самое странное… Мне не больно, а обидно во сне. Обидно потому, что жарили меня без масла. Представляешь.
Он засмеялся. Я же не нашёл в чертях ничего смешного, но всё равно улыбнулся.
-Хоть бы сала положили, черти… Всё приятнее, – добавил он.

Сківіцу працяў боль. А сэрца білася дзесьці пад кадыком, невыносна балюча і да слёз. Я пайшоў назад да дзеда. Ён быў там жа – на прызбе. Сядзеў нерухома, з заплюшчанымі вачыма.

«А раптам, пакуль я хадзіў, ён памёр», – гэтая дурная думка прыйшла ў галаву так нечакана, што мяне ахапіла адчуванне абсалютнага вакууму. І я, да гэтага імгнення жывы, з моцным сэрцам, адчуў, што ўсё ўва мне абрынулася ў гэтую пустэчу.

– Дзед Васіль, што з табой?! – я падбег да яго і пачаў трэсці за плечы.

Ён расплюшчыў вочы і паглядзеў на мяне.

– Хадзем піць гарбату, – толькі і сказаў.

Ён пасмажыў бульбы на сале – да чарнаты. І запарыў надта густую гарбату, ад якой сэрца пачало тахкаць. Глыток, і я зноў пачуваўся жывым.

Раптам ён заўсміхаўся, загаварыў.

– Вось сёння сон мне сасніўся, – пачаў ён. – Сніцца, што чэрці мяне на патэльні смажаць. І гэтымі самымі мяне тыкаюць... віламі сваімі... Ну, ты разумееш... І вось што самае дзіўнае... Мне не балюча, а крыўдна ў сне. Крыўдна таму, што смажылі мяне без алею. Уяўляеш.

Ён засмяяўся. Я ж не знайшоў у чарцях нічога смешнага, але ўсё адно ўсміхнуўся.

– Хоць бы сала паклалі, чэрці... Усё лепей, – дадаў ён.

На наступны дзень ад маці я даведаўся, што дзед раніцай знайшоў казу, прывязаную да плота. У школе пацаны сказалі, што прывёў і прывязаў яе Колька. Пэцкаць ён яе не стаў.

На следующий день от матери я узнал, что дед утром нашёл козу привязанной к забору. В школе пацаны сказали, что привёл обратно и привязал её Колька. Вымазывать он её не стал.

Река рвала льдом берега.
В апреле весна ворвалась в нашу деревню нахраписто, по-хозяйски, решив все свои дела.
Было солнечно и тепло. Снега не осталось. Только изредка он лежал в лесу, забытый уходящей в спешке зимой.
Это самое время ставить в лесу берёзовый сок. Мы с дедом ходили в лес за целебным соком. Уходили недалеко, сок ставили совсем рядом с деревней. Дед не мог уходить далеко – ноги его подводили, а мне просто нравилось проводить время в лесу.
Когда мы выходили из леса в поле, за которым лежала наша деревня, дед приговаривал и присвистывал в сторону бесконечно сонных полей.
– Джулай, джулай, джулай.
Следом за этим нехитрым ритуалом всегда, замечал я, приходил ветер.
Эти слова были загадочны и не понятны мне.
– Джулай, что это? – спрашивал я.
– Не знаю, – отвечал он. – Мой отец так ещё говорил. Я у него и услыхал.
– Джулай, джулай, джулай, – повторял я и тоже присвистывал.
Дул ветер. Мы подставляли свои лица навстречу ветру, глотая лёгкими весеннюю свежесть.

Рака рвала лёдам берагі.

У красавіку вясна ўварвалася ў нашу вёску настойліва, па-гаспадарску, выра-шыўшы ўсе свае справы.

Было сонечна і цёпла. Снегу не засталося. Ён дзе-нідзе ляжаў у лесе, кінуты збеглай зімой.

Самы час ставіць бярозавік. Мы з дзедам хадзілі ў лес па гаючы напой. Сыходзілі недалёка, сок ставілі зусім побач з вёскай. Дзед не мог хадзіць доўга: ногі яго падводзілі, а мне проста падабалася бавіць час у лесе.

Калі мы выходзілі з лесу ў поле, за якім стаяла наша вёска, дзед прыгаворваў і прысвістваў у бок бясконца сонных палёў:

– Джулай, джулай, джулай.

Следам за гэтым няхітрым рытуалам заўсёды, заўважаў я, прыходзіў вецер.

Гэтыя словы былі загадкавыя і не зразумелыя мне.

– Джулай, што гэта? – пытаўся я.

– Не ведаю, – адказваў ён. – Мой бацька так яшчэ казаў. Я ад яго і пачуў.

– Джулай, джулай, джулай, – паўтараў я і таксама прысвістваў.

Дзьмуў вецер. Мы падстаўлялі твары насустрач яму, паглынаючы лёгкімі вясновую свежасць.

Я вяртаўся са школы, калі пачуў крыкі людзей ля ракі. Роспачныя і гучныя – гэта жанчыны. Крыгаход шумеў ім у адказ. Рака вырашыла перакрычаць гарластых жанок.

Я шёл из школы, когда услышал крики людей около реки. Исступлённые и громкие – это кричали женщины. Ледоход шумел в ответ им. Река решила перешуметь горластых баб.

Мне стало интересно, что там происходит. Ещё издалека я увидел на берегу реки мужчин, женщин и детей – собралась почти целая деревня. Женщины кричали, а мужики бегали и сильно ругались матом… Точно что-то случилось. Я побежал к реке.

То, что я увидел, меня сильно поразило.

Словно корабль, плыл по реке дом деда Василия. Река несла его по течению – величаво и медленно. У почти целого дома отсутствовала только просторная веранда. Дом мог развалиться в любую секунду.

– Где дед Василь? – спросил я.

Никто не ответил мне.

– Где он? – уже прокричал.

Кто-то из мужиков ответил:

– А кто его знает! Кажись, уже утонул.

– Как утонул?

Я не мог в это поверить. Может быть, он успел выйти, прежде чем его дом подхватила река.

– Никто его не видел. Река шибко злая в этом году. Я не видел такую как живу, – сказал ещё кто то.

– А вдруг он в доме? Мало ли что? Поплыли!

– Ты что! Дом сейчас развалится! Ты видел реку! Льда много. Не доплыть. Хануть с концами можно.

Мне стала цікава, што там адбываецца. Яшчэ здалёк я ўбачыў на беразе ракі мужчын, жанчын і дзяцей – сабралася амаль уся вёска. Жанчыны енчылі, а мужыкі мітусіліся і гучна мацюкаліся... Сапраўды штосьці здарылася.
Я пабег да ракі.
Тое, што я ўбачыў, мяне агаломшыла.
Нібы карабель, плыў па рацэ дом дзеда Васіля. Плынь несла яго – велічна і павольна. У амаль цэлага дома адсутнічала толькі прасторная веранда. Дом мог разваліцца ў любую секунду.
– Дзе дзед Васіль? – спытаў я.
Ніхто не адказаў.
– Дзе ён? – ужо крыкнуў.
Хтосьці з мужыкоў прамовіў у адказ:
– А хто яго ведае! Здаецца, ужо патануў.
– Як патануў?
Я не мог у гэта паверыць. Можа, ён паспеў выйсці, перш чым яго дом падхапіла рака.
– Ніхто яго не бачыў. Рака надта злая ў гэтым годзе. Я не бачыў такой колькі жыву, – сказаў яшчэ нехта.
– А раптам ён у доме? Мала што? Паплылі!
– Ты што! Дом зараз разваліцца! Ты бачыш раку! Лёду шмат. Не даплысці. Патонем.
– Ды што ж вы! – з прыкрасцю выгукнуў я.
Я пабег да самай ракі, якая гула ад лёду і, здавалася, не пускала мяне. Трэба было штось рабіць.

– Да что же вы! – с досадой прокричал я.
Я побежал к самой реке, которая гудела ото льда и, казалось, не пускала меня. Надо было что-то делать.
Я прыгнул в воду. Уже в воде я услышал вопль женщин:
– Потонет же! Спасай его!
Сбоку, сверху, снизу – везде был лёд. Он подхватывал меня и выбрасывал из воды, но потом снова топил. Я не проплыл и двух метров, как сразу почувствовал, что иду на дно. Пальто набрало воду, и из-за этого не получалось грести.
Силы стали покидать меня. Я уже не плыл, а барахтался на одном месте, пытаясь не утонуть. Тут меня накрыла и потащила ко дну очередная льдина, выбираться сил уже не было. Я почувствовал свои тяжёлые ботинки, которые уносили меня на дно. Я закрыл глаза.
«Всё…» – было подумал я, как меня подхватила сильная рука и выдернула из этих ледяных оков.
Жадно вздохнул я уже на берегу. Кислород ворвался в мои упругие лёгкие и разорвал их изнутри. Спас и вытащил меня на берег тот самый мужик, с которым я разговаривал несколько минут назад.
– Вот дурак! Что, жить надоело! – начал ругать меня он.
Сводил озноб. Кто-то накинул на меня пальто.
– Да что с вами сегодня! – услышал я женский крик.
Дом уже довольно далеко отплыл. От отчаяния я был готов закричать, как увидел человека, уверенно плывшего к дому.
Это был Колька.

Я скочыў у вір. Ужо ў вадзе я пачуў жаночы енк:
– Патоне ж! Ратуйце!
Збоку, зверху, знізу – усюды быў лёд. Ён падхопліваў мяне і выкідаў з вады, але потым ізноў тапіў. Я не праплыў і двух метраў, як адчуў, што іду на дно. Паліто набрыняла вадой і не давала грэбці.
Сілы сталі пакідаць мяне. Я ўжо не плыў, а боўтаўся на адным месцы, спрабуючы не патануць. Тут мяне накрыла і пацягнула на дно чарговая крыга, выбірацца сіл ужо не было. Я адчуў свае цяжкія чаравікі, якія цягнулі мяне ўглыб. Я заплюшчыў вочы.
«Усё...» – толькі падумаў я, як мяне сціснула моцная рука і выхапіла з гэтых ледзяных кайданаў.
Прагна ўздыхнуў я ўжо на беразе. Кісларод уварваўся ў мае пругкія лёгкія і разарваў іх знутры. Выратаваў і выцягнуў мяне на бераг той самы мужык, з якім я размаўляў некалькі хвілін таму.
– Вось дурань! Табе жыць надакучыла! – пачаў лаяць мяне ён.
Мяне калаціла. Хтось накінуў паліто.
– Ды што з вамі сёння! – пачуў я жаночы крык.
Дом ужо даволі далёка адплыў. З роспачы я быў гатовы закрычаць, як убачыў чалавека, што ўпэўнена плыў к дому.
Гэта быў Колька.
Ён адграбаў рукамі лёд і рухаўся ўсё далей і далей. Лёд у адказ біў яго па целе, руках, галаве. Пару разоў ён сыходзіў пад ваду, але зноў выплываў і плыў далей...

Он разгребал своими руками лёд и плыл всё дальше и дальше. Лёд в ответ бил его по телу, рукам, голове. Пару раз он уходил под воду, но снова выплывал и плыл дальше…

Всё было очень быстро. Он подплыл к дому, который уже начал косится и медленно уходить под воду. Он схватился рукой за бревно, другой – за окно, подтянулся и быстро заглянул. Тут же оттолкнулся от дома и упал в воду.

Я желал теперь только одного, лишь бы он выплыл и доплыл обратно до берега.

Он плыл обратно к берегу, опять сражаясь со льдом. Осталось совсем немного, как вдруг его накрыло большой льдиной – будь она не ладна! Он же почти доплыл!

Вытащили его мужики, которые тут же прыгнули в воду, когда он скрылся вместе со льдиной.

Колька был весь бледно-синий, его трясло.

–Там, там… – говорил ледяными губами Колька, – дед Василь, мёртвый, а рядом… коза… тоже мёртвая.

Уже позже ниже по течению нашли его дом, точнее то, что от него осталось. Река безжалостно разбросала по всему берегу дом, превратив в щепки. А деда и его козу так и не нашли. Забрала их река.

Я нечасто вспоминаю о нём. Так, когда теперь приезжаю в родные края, я иду сразу в знакомый берёзовый лес – там мы собирали сок; выхожу на знакомое поле, где мы часто с ним останавливались, и там жду холодного ветра.

– Джулай, джулай, джулай! – кричу я.

Усё было вельмі хутка. Ён падплыў к дому, які ўжо пачаў касавурыцца і павольна сыходзіць пад ваду. Ён схапіўся рукой за бервяно, другой – за акно, падцягнуўся і хутка зазірнуў. Тут жа адштурхнуўся і ўпаў у ваду.
Я хацеў цяпер толькі аднаго: толькі б ён выплыў і даплыў назад да берага.
Ён плыў, зноў змагаючыся з лёдам. Засталося зусім крыху, як раптам яго накрыла вялікая крыга – хай на яе ліха! Ён жа амаль даплыў!
Выцягнулі яго мужыкі, якія тут жа скокнулі ў ваду, калі ён схаваўся разам з крыгай.
Колька быў увесь бледна-сіні, яго калаціла.
– Там, там... – шаптаў ледзянымі вуснамі Колька, – дзед Васіль, мёртвы, а побач... каза... таксама мёртвая.

Ужо пазней ніжэй па цячэнні знайшлі яго дом, дакладней тое, што ад яго засталося. Рака бязлітасна раскідала па ўсім беразе бярвенні, ператварыўшы іх у трэскі. А дзеда і яго казу так і не знайшлі. Забрала іх рака.
Я не так часта ўзгадваю яго. Толькі калі наведваюся ў родныя мясціны, іду адразу ў знаёмы бярозавы гай – там мы збіралі сок; выходжу на знаёмае поле, дзе мы часта з ім спыняліся, і чакаю халоднага ветру.
– Джулай, джулай, джулай! – крычу я.

Александр Москвин

Перевод на белорусский язык Татьяны Сивец

Аляксандр Масквін

Пераклад на беларускую мову Таццяны Сівец

Александр Москвин родился 25 ноября 1990 году в посёлке Энергетик. В 2009 году с серебряной медалью окончил школу и переехал в Оренбург. Учится на факультете экономики и управления Оренбургского государственного университета. Печатался в различных коллективных сборниках, журнале «День и ночь». В 2011 году как лауреат конкурса «Оренбургский край – XXI век» получил право на издание дебютного сборника стихов «Последний шаман». В том же году стал победителем конкурса сценариев ОАО РЖД «Сапсан, я тебя люблю». По сценарию был снят короткометражный фильм в рамках одноимённого киноальманаха. В 2012 году стал лауреатом региональной премии имени П. И. Рычкова в номинации «Дебют».

Аляксандр Масквін нарадзіўся 25 лістапада 1990 года ў пасёлку Энергетык. У 2009 годзе з сярэбраным медалём скончыў школу і пераехаў у Арэнбург. Вучыцца на факультэце эканомікі і кіравання Арэнбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Друкаваўся ў розных калектыўных зборніках, часопісе «Дзень і ноч». У 2011 годзе як лаўрэат конкурсу «Арэнбургскі край – XXI стагоддзе» атрымаў права на выданне дэбютнага зборніка вершаў «Апошні шаман». У тым жа годзе стаў пераможцам конкурсу сцэнарыяў ААТ РЖД «Сапсан, я тебя люблю». Па сцэнарыі быў зняты кароткаметражны фільм у межах аднайменнага кінаальманаха. У 2012 годзе стаў лаўрэатам рэгіянальнай прэміі імя П. І. Рычкова ў намінацыі «Дэбют».

ЧУПАКАБРА

Непроглядная тьма вгоняла притихший лес в подобие гипнотического транса. Полная луна, словно единственный глаз старого гипнотизёра, сверлила округу пронзительным взором. Извилистая тропинка уводила в самую чащу. По обе стороны от неё неприступными скалами возвышались могучие дубы, помнящие кровавую мясорубку гражданской войны. За бесконечной чередой деревьев скрывалась поляна, на которой расположился Свято-Даниловский скит – небольшая церквушка с парой приусадебных построек.

Много лет назад монах-отшельник решил уйти от суетного мира. Он забрался далеко в лес, где и построил небольшой скит. Отшельник давно умер. Церковь провозгласила его святым. С тех пор в скиту регулярно жили двое-трое монахов из ближайшего монастыря. Они следили за порядком, принимали многочисленных паломников, вели хозяйство.

По извилистой тропинке брели двое мужчин. Первый – грузный верзила с глубокой складкой на лбу и сутулой спиной. По паспорту его звали Артём Григорьевич Кабанов. В жизни ему чаще приходилось отзываться на кличку Секач. Он имел за плечами уже три ходки на зону. Завязывать с криминальным ремеслом он не собирался. Ничего другого, кроме как воровать всё, что под руку подвернётся, он не умел.

По пятам за Секачом следовал молоденький парнишка, тощий и бледный. Кличкой он обзавестись ещё не успел, а потому откликался на имя Анто-

ЧУПАКАБРА

Непраглядная цемра ўводзіла прыціхлы лес у штосьці накшталт гіпнатычнага трансу. Поўня, нібыта адзінае вока старога гіпнатызёра, свідравала наваколле пранізлівым позіркам. Звілістая сцежка вяла ў самы гушчар. Паабапал яе непрыступных скалаў узвышаліся волаты-дубы, якія памятаюць крывавы млын грамадзянскай вайны. За бясконцай чарадой дрэў схавалася паляна, на якой стаяў Свята-Данілаўскіх скіт – невялікая цэркаўка з парай прысядзібных пабудоў. Шмат гадоў таму манах-пустэльнік вырашыў сысці ад мітуслівага свету. Ён забраўся далёка ў лес, дзе і пабудаваў свой невялічкі скіт. Пустэльнік даўно памёр. Царква абвясціла яго святым. З тых часоў у скіце пастаянна жылі двоетрое манахаў з бліжэйшага манастыра. Яны сачылі за парадкам, прымалі шматлікіх паломнікаў, вялі гаспадарку.

Па звілістай сцежцы брылі двое мужчын. Першы – грузны бамбіза з глыбокай складкай на лбе і сутулай спінай. Па пашпарце яго звалі Арцём Рыгоравіч Кабанаў. У жыцці яму часцей даводзілася адгукацца на мянушку Сякач. Ён меў за плячыма ўжо тры ходкі на зону. Завязваць з крымінальным рамяством не збіраўся. Нічога, акрамя як красці ўсё, што пад руку патрапіць, ён не ўмеў. Па пятах за Секачом ішоў малады хлапчына, худы і бледны. Мянушкай ён абзавесціся яшчэ не паспеў, таму адгукаўся на імя Антоха. У яго крымінальнай біяграфіі асаблівых дасягненняў не значылася. У асноўным ён займаўся драбязой: улетку краў магнітолы з аўтамабіляў, а ўзімку абчышчаў пустыя лецішчы.

ха. В его криминальной биографии особых достижений не значилось. В основном он занимался мелочами: летом воровал магнитолы из автомобилей, а зимой обчищал пустующие дачи. Однажды он угодил на скамью подсудимых. Судья ограничился условным сроком.

Антоха и Секач держали путь в Свято-Даниловский скит. Шли они не за спасением души. Отпущение грехов и прикосновение к святыням их тоже не интересовало. Они шли на дело. Секач недавно разузнал, что в скиту полным-полно старых икон и дореволюционных богословских книг. В годы советской власти всю область охватила атеистическая лихорадка. Воинствующие безбожники разрушили сотни церквей, уничтожили множество реликвий. Разгул мракобесия не повредил скиту. Обитель, затерянная в непролазной чащобе, не привлекла внимания борцов с религиозным дурманом, поэтому там сохранилось множество старинных икон и книг. Всё это богатство почти не охраняется. Братия монастыря насчитывает три человека, один из которых немощный старец, а другой – неоперившийся юнец.

Антохе затея сразу не понравилась. Он недоумевал, кому нужны размалёванные доски и потрёпанные книжки. Секач сослался на знакомого барыгу, который готов отвалить за барахлишко кругленькую сумму. Сумма была настолько кругленькой, что у Антохи округлились глаза. Он согласился подсобить Секачу в нелёгком деле. В ночном лесу энтузиазм его испарился.

Вопросы веры Антоху не занимали. Бешеный ритм жизни не оставлял времени на размышления о боге. Антоха носил на шее крест; Рождество и

Аднаго разу трапіў на лаву падсудных. Суддзя абмежаваўся умоўным тэрмінам. Антоха і Сякач ішлі ў Свята-Данілаўскіх скіт. Спяшаліся яны не па выратаванне душы. Адпушчэнне грахоў і дотык да святыняў іх таксама не цікавілі. У іх была справа. Сякач дазнаўся, што ў скіце поўна старых абразоў і дарэвалюцыйных багаслоўскіх кніг. У гады савецкай улады ўсю вобласць ахапіла атэістычная ліхаманка. Ваяўнічыя бязбожнікі разбурылі сотні цэркваў, знішчылі мноства рэліквій. Але разгул цемрашальства не пашкодзіў скіту. Закінуты ў непралазным гушчары, ён не прыцягнуў увагі змагароў з рэлігійным дурманам, таму там захавалася мноства старадаўніх абразоў і кніг. Усё гэта багацце амаль не ахоўваецца. Брацыя манастыра налічвае тры чалавекі, адзін з якіх нямоглы старац, а другі – неспрактыкаваны юнак.

Антоху задума адразу не спадабалася. Ён не мог уцяміць, каму патрэбныя размаляваныя дошкі і патрапаныя кніжкі. Сякач спаслаўся на знаёмага барыгу, які гатовы адваліць за гэткае барахло кругленькую суму. Сума была настолькі кругленькай, што ў Антохі акругліліся вочы. Ён пагадзіўся падмагчы Секачу ў нялёгкай справе. У начным лесе энтузіязм яго выпарыўся.

Пытанні веры Антоху не займалі. Шалёны рытм жыцця не пакідаў часу на разважанні пра бога. Антоха насіў на шыі крыж, Каляды і Вялікдзень успрымаў як чарговыя падставы выпіць. А бог... ці ёсць ён, ці няма яго, якая розніца!

У гушчары Антоха ўпершыню звярнуў позірк у нябёсы: ці не шарахне маланкай разгневаны Бог па двух блюзнерах, што паквапіліся на манаскія скарбы. На небасхіле не назіралася ні аблачынкі. Добрае надвор'е, аднак, не аслабіла страх перад божай карай.

Пасху воспринимал как очередные поводы выпить. А бог… есть он, нет его, какая разница!

В тёмном лесу Антоха впервые обратил взгляд в небеса: не шарахнет ли молнией разгневанный господь по двум богохульникам, дерзнувшим обворовать обитель. На небосклоне не наблюдалось ни облачка. Хорошая погода не ослабила страх перед божьей карой.

Мало того, взвинченные нервы взялись играть с Антохой злую шутку. В лесу царила тишина, лишь страдающая бессонницей птица заводила печальную песню о неразделённой птичьей любви. Стенания несчастной птахи тонули в море других, надуманных звуков. Антохе слышался громкий хруст веток. Парень оглядывался по сторонам. Он всматривался в темноту воспалённым взглядом. Ничего не видать, а чувство такое, будто по пятам идёт невидимый преследователь, готовый покарать злоумышленников за ещё не совершённое злодеяние. Треск сучьев сменялся протяжным чавканьем, сквозь которое пробивались жалобные стоны и дьявольский хохот. Фантазия прокручивала жуткую картину, в которой неведомые науке хищники кого-то с аппетитом пожирали. Антоха снова вглядывался во тьму. Зрение упиралось в темноту, за которой могло скрываться всё что угодно.

Антоха зажёг фонарик. Луч света самурайским мечом вспорол брюхо темноте. Бесформенные страхи не отступали. Разгонять уральскую ночь светом фонарика занятие бессмысленное. Под ногами становится светлее, а вокруг мрак только сгущается.

– Фонарь выключи! – цыкнул Секач.

– Там кто-то есть! – мотнул головой Антоха.

Мала таго, напружаныя нервы пачалі гуляць з Антохам злыя жарты. У лесе панавала цішыня, толькі нейкая бяссонная птушка выводзіла самотную песню пра непадзельнае птушынае каханне. Стогны няшчаснай патаналі ў моры іншых, уяўных гукаў. Антоху чулася гучнае храбусценне галінак. Хлопец азіраўся па баках. Ён углядаўся ў цемру шалёным позіркам. Нічога не відаць, а адчуванне такое, быццам па пятах ідзе хтось нябачны, гатовы пакараць зламыснікаў за яшчэ не здзейсненае злачынства. Трэск галля змяняўся працяглым чмяканнем, праз якое прабіваліся жаласныя стогны і д'ябальскі рогат. Фантазія малявала жудасную карціну, у якой невядомыя навуцы драпежнікі кагосьці з апетытам жэрлі. Антоха зноў узіраўся ў цемру, у якой магло хавацца што заўгодна.

Антоха запаліў ліхтарык. Промень святла самурайскім мячом успароў бруха цемры. Няўцямныя страхі не адступаліся. Разганяць уральскую ноч святлом ліхтарыка – занятак бессэнсоўны. Пад нагамі робіцца святлей, а навакол змрок толькі згушчаецца.

– Ліхтар выключы! – цыкнуў Сякач.

– Там хтосьці ёсць! – матнуў галавой Антоха.

– Хто? – пасміхнуўся Сякач.

– Не ведаю, – перасмыкнуў плячыма хлопец. – Бабка з адной вёскі нядаўна казала, тут гэтая... як яе... чупакабра водзіцца!

– Якая такая чупакабра?

– Бабка гаварыла, гэта пачвара такая, яна па начах авечак цягае, а потым кроў з іх п'е! Іх сюды, відаць, амерыканцы закінулі!

– Скажаш таксама! Тут ваўкі перадохлі даўно, не тое што гэта твая... скалапендра! Не кіпішуй, Антоха! Усё нармаль!

– Кто? – усмехнулся Секач.
– Не знаю, – повёл плечами парень. – Бабка из одной деревни недавно говорила, тут эта… как её… чупакабра водится!
– Какая такая чупакабра?
– Бабка говорила, эта тварь такая, она по ночам овец утаскивает, а потом кровь из них пьёт! Их сюда вроде американцы забросили!
– Скажешь тоже! Тут волки передохли давно, не то что эта твоя… сколопендра! Не кипишуй, Антоха! Всё ровно!
– Слушай, Секач! Ну его, этот монастырь! Пошли обратно!
– Ты чего, очканул, что ли?
– Да это…
– Что «это»?
– Вдруг бог накажет!
– Вот ему делать больше не фиг! И вообще, пословица есть: «Бог создал вора, чёрт – прокурора», так что не кипишуй, и всё пучком будет!
Секач отвернулся. Под его ногами снова захрустела листва. Антоха поплёлся за ним. Он старался унять докучливые страхи, но они всё равно хватали его за горло цепкими костлявыми пальцами. Антоха с завистью посмотрел на сутулую спину Секача. Старшему товарищу страх неведом. Идёт по ночному лесу на чёрное дело, как на обычную прогулку. Секач не боится ни темноты, ни шорохов, ни божьей кары. Антоха мечтал когда-нибудь стать столь же хладнокровным.
Даже самое длинное путешествие имеет свойство заканчиваться. Лес поредел. Сквозь сплетения ветвей показался купол церквушки. Удалось разгля-

– Слухай, Сякач! Ну яго, гэты манастыр! Пайшлі назад!
– Ты чаго, ачкануў, ці што?
– Ды гэта...
– Што «гэта»?
– Раптам бог пакарае!
– То яму рабіць больш няма чаго! І наогул, прыказка ёсць: «Бог стварыў злодзея, чорт – пракурора», так што не кіпішуй, і ўсё пучком будзе!
Сякач адвярнуўся. Пад яго нагамі зноў захрумсцела лістота. Антоха паплёўся за ім. Ён спрабаваў суцішыць надакучлівыя страхі, але яны ўсё роўна хапалі яго за горла чэпкімі кашчавымі пальцамі. Антоха з зайздрасцю зірнуў на сутулую спіну Секача. Вось каму невядомы страх. Ідзе па начным лесе на чорную справу, як на звычайны шпацыр. Сякач не баіцца ні цемры, ні шоргатаў, ні божай кары. Антоха марыў аднойчы стаць такім жа абыякавым.
Нават самае доўгае падарожжа некалі заканчваецца. Лес парадзеў. Скрозь сплеценыя галіны паказаўся купал цэркаўкі. Можна было разгледзець згорбленыя дахі гаспадарчых пабудоў, роўныя грады невялікага агарода. Сякач схаваўся за разгалістым дубам. Антоха – за шырокай спінай таварыша. Мацёры крадзежнік узіраўся ў цемру. Усё ціха. Манахі спяць. Ніхто не перашкодзіць двум злодзеям зрабіць сваю чорную справу.
– Пайшлі, – махнуў рукой Сякач. Яны выйшлі з-за дрэва і крадком пакіравалі да цэркаўкі. Ззаду пачуўся ледзь чутны шоргат. Антоха павярнуўся. Сярод дрэў мільгануў чорны цень.
– Там нехта ёсць, – шапнуў Антоха. Сякач свідрануў цемру цяжкім позіркам.

деть сгорбленные крыши хозяйственных построек, ровные грядки небольшого огорода. Секач спрятался за раскидистым дубом. Антоха укрылся за широкой спиной товарища. Матёрый вор вглядывался в темноту. Всё тихо. Монахи спят. Никто не помешает двум злодеям провернуть чёрное дело.

– Пошли, – махнул рукой Секач. Они вышли из-за дерева и, крадучись, направились к церквушке. Сзади донёсся чуть слышный шорох. Антоха обернулся. Между деревьями метнулась чёрная тень.

– Там кто-то есть, – шепнул Антоха. Секач пробуравил темноту тяжёлым взглядом.

– Нет там никого, – рассудил он.

Расстояние до церквушки сокращалось. Шорохи не утихали. Антоха то и дело оборачивался. Ему мерещилась смутная тень, носившаяся между деревьями. До церквушки осталось чуть меньше десяти шагов. Шорохи сменились дробным топотом. Антоха снова оглянулся. Чёрная тень стремительно неслась на него. Антоха попятился. Тень замерла.

Перед Антохой стояло живое существо, какое не привидится ни в одном ночном кошмаре. Худое жилистое тело покрывали жёсткие волоски. Толстую шею венчала огромная голова с вытянутой мордой. От покатого лба и до плеч кучерявилась чёрная грива. Овальные ноздри со свистом втягивали прохладный воздух. Существо разинуло пасть. Мертвечиной пахнуло так, будто на ужин чудовище слопало всех покойников с местного кладбища. Взору Антохи предстали острые клыки, каждый размером сантиметров по десять.

– Э-э, – протянул Антоха. От страха он лишился дара речи, равно как и способности здраво мыслить. Он сумел лишь похлопать товарища по пле-

– Няма там нікога, – буркнуў ён.

Адлегласць да цэркаўкі скарачалася. Шоргаты не сціхалі. Антоха раз-пораз азіраўся. Яму мроіўся цьмяны цень, які мітусіўся сярод дрэў. Да цэркаўкі засталося крыху менш як дзесяць крокаў. Шоргаты змяніліся дробным тупатам. Антоха зноў азірнуўся. Чорны цень імкліва нёсся на яго. Антоха падаўся назад. Цень спыніўся.

Перад Антохам стаяла жывая істота, якую не пабачыш і ў самым жахлівым сне. Худое жылістае цела пакрывалі шорсткія валасінкі. Тоўстую шыю вянчала велізарная галава з выцягнутай пысай. Ад пакатага лба і да плячэй кучаравілася чорная грыва. Авальныя ноздры са свістам уцягвалі халаднаватае паветра. Істота разявіла пашчу. Дыхляцінай патыхнула так, быццам на вячэру пачвара зжэрла ўсіх нябожчыкаў з мясцовых могілак. Перад Антохавым тварам паўсталі вострыя іклы, кожны памерам сантыметраў з дзесяць.

– Э-э, – працягнуў Антоха. Ад страху ён пазбавіўся здольнасці гаварыць, гэтаксама як і думаць. Ён змог толькі папляскаць таварыша па плячы. Сякач павярнуўся. Ён таксама ўбачыў пачвару. Сякач віскнуў, як баба, якую незнаёмыя мужыкі заспелі за спраўленнем малой патрэбы.

Істота паднялася на заднія лапы. Так яна стала на дзве галавы вышэй за Антоху. Пачвара махнула правай лапай. На ёй Антоха разгледзеў доўгія кіпці. Мядзведзь ударам лапы можа знесці няўдаламу паляўнічаму паўгалавы. Гэтае стварэнне лёгкім рухам кіпцюроў здольнае зрабіць з чалавека кілбасную нарэзку. Сякач звар'яцеў ад страху. Пукатыя вочы ледзь не вылезлі з арбіт. Адчувальна дыхнула лайном – бясстрашны крымінальнік нарабіў у штаны.

чу. Секач обернулся. Он тоже узрел чудовище. Секач взвизгнул, как баба, которую незнакомые мужики застукали за справлением малой нужды.
Существо поднялось на задние лапы. Так оно стало на две головы выше Антохи. Чудовище взмахнуло правой лапой. На ней Антоха разглядел длинные когти. Медведь ударом лапы может снести незадачливому охотнику полголовы. Эта тварь лёгким движением когтей способна сделать из человека колбасную нарезку. Секач ополоумел от страха. Выпученные глаза едва не выпали из орбит. Ощутимо пахнуло дерьмом – бесстрашный уголовник наделал в штаны. Секач ткнул в существо указательным пальцем, словно хотел указать на него невидимым свидетелям.
– Бежим, – пролепетал Антоха непослушными губами. Секач лишь издал серию высоких звуков, отдалённо похожих на икоту. Антоха не стал дожидаться товарища. Он метнулся в сторону. Ставшие ватными ноги не удержали его. Антоха повалился на землю. Сдаваться он не собирался. Он пополз к лесу, извиваясь, как червяк, брошенный на раскалённую сковородку. Каждый удар запыхавшегося сердца обращался громовым раскатом.
Гукі мацнелі. Вердзі. Пакутлівае, як гром, Dies Irae і Сашкава, згоднае з маімі ціхімі абвінавачваннямі, маўчанне.

Апошні акорд. Я была ў гасцях у бацькоў і там жа вырашыла заначаваць. А палове на адзінаццатую раздаўся званок. Мой мабільны адгукнуўся трывожным Confutatis. Сашка спытаў:
– Іра, якое месца ты больш за ўсё любіш ў горадзе?
– Званіцу, – машынальна адказала я.
Ён ціха засмяяўся.
– Так і думаў. Хачу, каб яна заўсёды нагадвала табе пра мяне. Я чакаю цябе.
Ён павесіў трубку. Я сарвалася з месца ў дзікі лівень, узняла палову горада на ногі і да пасінення шукала лодачніка, які б давёз да званіцы. Зразумела, мы не паспелі. Прырода звар'яцела, ашалела, абрынаючы на нас струмені вады. Мы прамоклі і знясілелі... Пад зводам званіцы было ціха, як у тым лесе. Ён ляжаў у прывязанай да адной са сцен гумовай лодцы: рукі апушчаныя ў ваду, ад запясцяў усё яшчэ павольна разыходзяцца вялізныя чырвоныя плямы.
Сашка ўсміхаўся.

рушка, взорвали собор. А потом затопили половину города. От старого Калязина осталась она, и всё. Башня на воде. Колоколов на ней нет, вырвали язык, и что-то мне подсказывает, всё те же 72 года назад.

Я снова стала ходить по городу, окончательно перемолотая предчувствиями, в поисках хотя бы одного счастливого лица. Хоть одно! Нет, даже дети какие-то слишком серьёзные и равнодушные. Моё «не может быть» превратилось во «вполне вероятно». Саша стал сниться каждую ночь. И я не выдержала. Сбежала в Тверь.

Всё утихло ещё на четыре долгих года, меня перестали мучить головные боли. Забылось знание о душах, о городе, о колокольне. И я позволила себе думать, что спаслась. Пока однажды, во время деловых переговоров, не грохнулась в обморок.

Через две недели в светлом кабинете дорогой клиники доктор с сожалением развёл руками, сказав, что под моей черепной коробкой спрятана опухоль таких размеров, что помочь уже нельзя. Он спросил, не было ли травм, и я живо вспомнила падение с мотоцикла. Калязин хитёр, он уже тогда отметил меня, поставил клеймо.

И вот тут-то я задала свой главный вопрос:

– Скажите, есть в Твери место, которое можно назвать душой города?

Доктор, готовый уже утешать, выронил мою карточку и тихо сказал:

– Нет, пожалуй.

– А было?

Так я узнала про Спас Златоверхий и про то, что Тверь наличием души не отличается от Калязина. Правда, здесь всё было намного страшнее. Храм,

Кожная сабака ў Калязіне ведае гісторыю званіцы. У 1939, калі будавалася Угліцкае вадасховішча, 72 гады таму, як і казала бабулька, узарвалі сабор. А потым затапілі палову горада. Ад старога Калязіна засталася яна, і ўсё. Вежа на вадзе. Званоў на ёй няма, вырвалі языкі, і штосьці мне падказвае, усё тыя ж 72 гады таму.

Я зноў пачала блукаць па горадзе, канчаткова адужаная прадчуваннямі, у пошуках хаця б адной шчаслівай асобы. Адной! Не, нават дзеці нейкія занадта сур'ёзныя і абыякавыя. Маё «не можа быць» ператварылася ў «цалкам верагодна». Саша пачаў сніцца кожную ноч. І я не вытрымала. Збегла ў Цвер.

Усё суцішылася яшчэ на чатыры доўгія гады, мяне перастаў мучыць галаўны боль. Забыліся веды пра душы, пра горад, пра званіцы. І я дазволіла сабе думаць, што ўратавалася. Пакуль аднойчы, падчас дзелавых перамоў, не страціла прытомнасць.

Праз два тыдні ў светлым кабінеце дарагой клінікі доктар са шкадаваннем развёў рукамі, сказаўшы, што ў маёй галаве хаваецца пухліна такіх памераў, што дапамагчы ўжо нельга. Ён спытаў, ці не было ў мяне траўмаў, і я жыва ўспомніла падзенне з матацыкла. Калязін хітры, ён ужо тады пазначыў мяне, паставіў таўро. І вось тут я задала сваё галоўнае пытанне:

– Скажыце, ёсць у Цвяры месца, якое можна назваць душой горада?

Доктар, гатовы ўжо да суцяшэнняў, выпусціў з рук маю картку і ціха прамовіў:

– Не, напэўна.

– А было?

впервые построенный в XIII веке, имел такое значение, что жителей тогда ещё Тверского княжества называли «гражданами Спаса». Разумеется, то, что он простоял аж до 1935 года, – настоящее чудо. Но и его взорвали. А камни пошли на строительство набережной. И не то, чтобы я была шибко религиозна, но вот такое варварское отношение даже не к вере, а к тем, кто строил, восстанавливал, расписывал, ухаживал и даже приходил посмотреть, такое невыносимое равнодушие должно иметь свои ядовитые плоды. Конечно, от них можно бежать, перелистывая города, как страницы. Но скажите, где нет своего Никольского?
Я вернулась в Калязин.

Плачущая Lacrimosa в моих наушниках медленно становится торжественным Sanctus. Реквием. Всё ещё размышляя над феноменом разрушенных церквей, я думаю, а в храмах ли дело? Или в тех, кто взорвал храм? Может быть, мы настолько потерянные не от того, что кто-то разрушил, а от того, что буквально на глазах наших дедов произошло такое… а они не помешали. Это значит, что равнодушие у нас в крови, заложено генетически. И строительством тысячи храмов тут не поможешь.
Но я всё же надеюсь, что мои догадки далеки от истины, а права была та бабуля в больнице. Это значит, что однажды моему городу станет достаточно душ его жителей. И здесь вырастет поколение способных улыбаться друг другу.

Так я даведалася пра Спас Залатаверхі і пра тое, што Цвер наяўнасцю душы не адрозніваецца ад Калязіна. Праўда, тут усё было нашмат страшней. Храм, упершыню пабудаваны ў XIII стагоддзі, меў такое значэнне, што жыхароў тады яшчэ Цвярскога княства называлі «грамадзянамі Спаса». Зразумела, тое, што ён прастаяў аж да 1935 года, – сапраўдны цуд. Але і яго ўзарвалі. А камяні пайшлі на будаўніцтва набярэжнай. І не тое, каб я была надта рэлігійнай, але такое вось варварскае стаўленне нават не да веры, а да тых, хто будаваў, аднаўляў, распісваў, даглядаў і нават проста прыходзіў паглядзець, такая нясцерпная абыякавасць мусіла даць свае атрутныя плады. Вядома, ад іх можна бегчы, перагортваючы гарады, як старонкі. Але скажыце, дзе няма свайго Нікольскага?
Я вярнулася ў Калязін.

Lacrimosa, якая плача ў маіх слухаўках, паволі пераходзіць ва ўрачысты Sanctus. Рэквіем. Усё яшчэ разважаючы над феноменам разбураных цэркваў, я думаю, а ці ў храмах справа? Ці ў тых, хто ўзарваў храм? Можа, мы настолькі страчаныя не ад таго, што нехта разбурыў, а ад таго, што літаральна на вачах нашых дзядоў адбывалася такое... а яны не спынілі. Гэта значыць, што абыякавасць у нас у крыві, закладзена генетычна. І будаўніцтвам тысячы храмаў тут не дапаможаш.
Але я ўсё ж такі спадзяюся, што мае здагадкі далёкія ад праўды, а рацыю мела тая бабулька ў бальніцы. Гэта значыць, што аднойчы майму гораду хопіць душ яго жыхароў. І тут вырасце пакаленне людзей, здольных усміхацца адно аднаму.

Георгий Фомин

Перевод на белорусский язык Татьяны Сивец

Георгій Фамін

Пераклад на беларускую мову Таццяны Сівец

Георгий Фомин родился в г. Улан-Удэ в 1991 году, окончил школу № 19 (1998–2008). Поступил в университет «Физической культуры, спорта, молодёжи и туризма» в г. Иркутске в 2008 году. На данный момент учится на V курсе.

Георгій Фамін нарадзіўся ў г. Улан-Удэ ў 1991годзе, скончыў школу № 19 (1998–2008). Паступіў ва ўніверсітэт «Фізічнай культуры, спорту, моладзі і турызму» ў г. Іркуцку ў 2008 годзе. На дадзены момант вучыцца на V курсе.

СООБЩЕНИЕ

Ты просыпаешься от сигнала SMS. Тянешь руку, нащупал телефон, открыл глаза.
«Доброе утро, родной ☺».
Улыбнулся. Посмотрел на часы. Расстроился. 8:30. Рано. Суббота. Солнце светит. Начало лета. Почему я в субботу отдыхаю, а она – нет?
«Утро доброе, милая».
Как же противны эти слова и фразы, заезженные трактором по сельской дороге. А что делать? Ей нравится, когда я так пишу. А мне – нет.
Отчёт о доставке.
Говорят, что сердца девушки можно добиться, только говоря ей комплименты. Ну и чуть-чуть критики.
Спать уже не хочется. Поднялся с кровати. Где долбаные тапки? Блин, с другой стороны кровати. Плевать на них.
Ванная, вожу зубной щёткой по зубам.
Сигнал сообщил, что кто-то мне отправил письмо, если это так можно назвать.
Сплюнул, умылся, вытер лицо.
«Проснулся? Не разбудила?»
«Проснулся ☺ Не разбудила, конечно ☺ Ты где сейчас?»
Долбаные смайлы!!! Хотя и придумали их в 1951 году, и они меня старше в два с половиной раза… всё равно долбаные…

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Ты прачынаешся ад сігналу SMS. Выцягваеш руку, намацаў тэлефон, расплюшчыў вочы.
«Добрай раніцы, родны ☺».
Усміхнуўся. Зірнуў на гадзіннік. Скрывіўся. 8:30. Рана. Субота. Сонца свеціць. Пачатак лета. Чаму я ў суботу адпачываю, а яна – не?
«Добрай раніцы, мілая».
Як жа брыдка ад гэтых слоў і фраз, заезджаных трактарам па вясковай дарозе. А што рабіць? Ёй падабаецца, калі я так пішу. Мне – не.
Справаздача аб дастаўцы.
Кажуць, што сэрца дзяўчыны можна дамагчыся, толькі кажучы ёй кампліменты. Ну і крыху-крыху крытыкі.
Спаць ужо не хочацца. Падняўся з ложка. Дзе, халера на іх, тапкі? Блін, з другога боку ложка. Пляваць на іх.
Ванная, ваджу зубной шчоткай па зубах.
Сігнал паведаміў, што хтосьці даслаў мне ліст, калі гэта так можна назваць.
Сплюнуў, памыўся, выцер твар.
«Прачнуўся? Не разбудзіла?»
«Прачнуўся ☺ Не разбудзіла, вядома ☺ Ты дзе зараз?»
Халерныя смайлы!!! Хоць і прыдумалі іх у 1951 годзе, і старэйшыя яны за мяне ў два з паловай разы... усё адно халерныя...

Отчёт о доставке.
Смайлы. Один писатель в социальных сетях вместо мерзких рожиц печатает «улыбка».
Кухня, чай, яичница, хлеб.
SMS расшифровывается как short message service. В переводе с английского – сервис коротких сообщений.
«На лекции, она скучная ☹ вот тебе дорогой пишу ☺».
«Дорогой» должно быть обособлено запятыми. Лучше бы лекцию слушала.
«☺ Что за лекция?»
Зачем я спрашиваю? Я и так прекрасно знаю. Надо выйти в интернет и проверить почту.
Отчёт о доставке.
Учёные говорят, что проверка электронной почты в социальных сетях является новой зависимостью, как курение, алкоголизм, наркомания. Я с ними согласен. Я уснул в два часа ночи, а сейчас девять. Кто мне мог написать ночью в этот промежуток времени? Никто, но надо проверить.
Нажимаю на ярлык браузера.
«Экономтеория ☺».
Я знаю.
«Хоть что-нить написала?»
Отправить. Все в SMS сокращают слова, чтобы сэкономить время и деньги. Каждую секунду в мире отправляют двести тысяч SMS. Получается, что в ту секунду, когда я нажал кнопку «Отправить», ещё двести тысяч людей по всему миру таких же, как я, сделали то же самое.

Справаздача аб дастаўцы.
Смайлы. Адзін пісьменнік у сацыяльных сетках замест брыдкіх пысаў друкуе «ўсмешка».
Кухня, гарбата, яечня, хлеб.
SMS расшыфроўваецца як short message service. У перакладзе з англійскай – сервіс кароткіх паведамленняў.
«На лекцыі, яна сумная ☹ вось табе дарагі пішу ☺».
«Дарагі» павінна адасабляцца коскамі. Лепш бы лекцыю слухала.
«☺ Што за лекцыя?»
Навошта я пытаюся? Я і так выдатна ведаю. Трэба выйсці ў інтэрнэт і праверыць пошту.
Справаздача аб дастаўцы.
Навукоўцы сведчаць, што праверка электроннай пошты ў сацыяльных сетках з'яўляецца новай залежнасцю, як курэнне, алкагалізм, наркаманія. Я з імі згодны. Я заснуў у дзве гадзіны ночы, а зараз дзевяць. Хто мог мне напісаць ноччу ў гэты прамежак часу? Ніхто, але трэба праверыць.
Націскаю на ярлык браўзера.
«Эканамтэорыя ☺».
Я ведаю.
«Хоць што напісала?»
Адаслаць. Усе ў SMS скарачаюць словы, каб сэканоміць час і грошы. Кожную секунду ў свеце адсылаецца 200 тысяч SMS. Атрымліваецца, што ў тую секунду, калі я націснуў «Адаслаць», яшчэ дзвесце тысяч чалавек па ўсім свеце зрабілі тое ж самае.

А секунду спустя ещё двести тысяч.
Отчёт о доставке.
Двухстам тысячам человек больше нечем заняться, как писать SMS.
В среднем, чтобы написать одну SMS, уходит около восьми секунд.
Так и знал, что никто не написал.
Тогда проверю «Новости». Может быть, здесь что-то изменилось?
Здесь всё по-старому.
Тогда зайду в «Рекомендации». Может быть, здесь что-то изменилось?
Здесь всё по-старому.
SMS пришло.
Тогда зайду в «Фотографии». Может быть, здесь что-то изменилось?
Здесь всё по-старому.
Печалишься, но есть ещё «Комментарии».
Ах, SMS пришло.
«Только дату ☺☺☺☺».
Что я должен писать?!! Ведь даже вопроса нет. Опять эти смайлы.
«Мне в интернете никто не пишет ☹».
Грустный смайл, грустная улыбка, улыбка грусти. Как это понимать?
Тогда зайду в «Комментарии». Может, здесь что-то изменилось?
Здесь всё по-старому.
Поставлю скачиваться фильм.
Отчёт о доставке.
Надо по группам пошариться. Думаю, скажи я так своей маме или своему папе, они бы меня не поняли. А что бы они поняли? Не знаю. Мой мозг

А праз секунду яшчэ дзвесце тысяч.
Справаздача аб дастаўцы.
Дзвесце тысяч чалавек больш не мае чым заняцца, як пісаць SMS.
У сярэднім, каб напісаць адну SMS, трэба каля васьмі секунд.
Так і ведаў, што ніхто не напісаў.
Тады праверу «Навіны». Можа, тут нешта змянілася?
Тут усё па-старому.
Тады зайду ў «Рэкамендацыі». Можа, тут нешта змянілася?
Тут усё па-старому.
Гук SMS.
Тады зайду ў «Фотаздымкі». Можа, тут нешта змянілася?
Тут усё па-старому.
Сумна, але ёсць яшчэ «Каментарыі».
Так, SMS.
«Толькі дату ☺☺☺☺».
Што я павінен пісаць?!! Тут нават пытання няма. Ізноў гэтыя смайлы.
«Мне ў інтэрнэце ніхто не піша ☹».
Сумны смайл, сумная ўсмешка, усмешка суму. Як гэта разумець?
Тады зайду ў «Каментарыі». Можа, тут нешта змянілася?
Тут усё па-старому.
Пастаўлю спампоўвацца фільм.
Справаздача аб дастаўцы.
Трэба па групах пашныряць. Думаю, скажы я так сваёй маме або тату, яны б мяне не зразумелі. А што б яны зразумелі? Не ведаю. Мой мозг настолькі

настолько «обинтернетился», что не могу мыслить по-другому. Браузер, юзер, торрент, логин, пароль, личная страничка, электронная почта заняли все места в зрительном зале моего жёсткого диска. Заняли места, которые должны занимать действительно полезные вещи.

Сейчас и не нужно запоминать ничего полезного. Заболел живот? Введи в поисковой системе «заболел живот». Хочешь приготовить романтический ужин? Введи в поисковике.

«Как приду домой, я тебе напишу ☺».

Будто бы мне не хватает твоих SMS. Напиши и там. Будем переписываться и по телефону, и через интернет. Можем SMS-ками обсуждать что-то серьёзное и одновременно шутить друг над другом в интернете.

«Я буду радостный очень ☺».

И опять вместе со мной по всему миру двести тысяч человек нажали кнопку «Отправить».

Она обрадуется такому сообщению. Если написать правду, то она обидится. Я этого не хочу.

Люди не привыкли слышать правду.

Отчёт о доставке.

Нам врут в газетах. Нам врут в телевизоре. Нам врут в школе, университете, работе! Врут везде. Мы привыкли к вранью. Мы боимся услышать правду.

«Я сделаю всё, чтобы тебя порадовать ☺».

Перестань мне писать!!!

«Давай встретимся сегодня».

«абынтэрнэціўся», што не магу думаць па-іншаму. Браўзер, юзер, торэнт, лагін, пароль, хатняя старонка, электронная пошта занялі ўсё месца ў маёй памяці. Занялі месца, якое павінны займаць сапраўды вартыя рэчы.
Зараз і не трэба нічога запамінаць. Баліць жывот? Увядзі ў пошукавай сістэме «баліць жывот». Хочаш прыгатаваць рамантычную вячэру? Увядзі ў пошукавіку.
«Як прыйду дамоў, я табе напішу ☺».
Быццам бы мне мала тваіх SMS. Напішы і там. Будзем перапісвацца і па тэлефоне, і праз інтэрнэт. Можам SMS-камі абмяркоўваць нешта сур'ёзнае і адначасова кпіць адно з аднаго ў інтэрнэце.
«Я буду рады вельмі ☺».
І зноў адначасова са мной па ўсім свеце дзвесце тысяч чалавек націснулі «Адаслаць».
Яна будзе рада такому паведамленню. Калі напісаць праўду, то яна пакрыўдзіцца. Я гэтага не хачу.
Людзі не прывыклі да праўды.
Справаздача аб дастаўцы.
Нам хлусяць у газетах. Нам хлусяць па тэлевізары. Нам хлусяць у школе, ва ўніверсітэце, на працы! Хлусяць усюды. Мы прызвычаіліся да хлусні. Мы баімся пачуць праўду.
«Я зраблю ўсё, каб цябе парадаваць ☺».
Перастань мне пісаць!!!
«Давай сустрэнемся сёння».
Мы не бачыліся амаль тыдзень. З мінулай пятніцы, ужо субота. Гулялі нядоўга. Цяжка было размаўляць. Не мелі чаго сказаць. Пасадзіў на аўтобус. Праз

Мы не виделись почти неделю. С прошлой пятницы, сейчас суббота. Гуляли недолго. Тяжело было разговаривать. Нечего было сказать. Посадил на автобус. Через несколько секунд от неё пришло SMS. «Хорошо погуляли ☺», и так до самой ночи переписывались. А при встрече нечего было сказать.
Зато раньше могли на несколько дней уехать куда-нибудь, никого не предупредив. Телефоны не брали, чтобы никто не мешал, чтобы были только она и я. Зато сейчас без телефона никуда. Что произошло?
Отчёт о доставке.
Зато эсэмэситься – до глубокой ночи. А ей с утра на пары в субботу. Я в субботу не учусь, сплю утром. А у неё – экономическая теория.
Ей скучно.
А я сплю.
Она пишет мне.
Я не сплю.
Фильм почти скачался, раздался сигнал.
«Я сегодня не могу ☹ с подругой по магазинам ☺ а вечером маме помогать извини ☹».
Какая подруга? У моего друга сегодня День Рождения!!!
«У моего друга ДР ☺».
Отчёт о доставке.
Сразу же.
«Ты же знаешь, как отношусь к твоим друзьям ☹» .
Знаю. Я слабак. Не умею выбирать друзей.

некалькі секунд ад яе прыйшло SMS. «Добра пагулялі ☺». Так да самай ночы і перапісваліся. А пры сустрэчы не было чаго сказаць.
Затое раней маглі на некалькі дзён паехаць куды-небудзь, нікога не папярэдзіўшы. Тэлефоны не бралі, каб ніхто не перашкаджаў, каб былі толькі яна і я. Затое цяпер без тэлефона нікуды. Што адбылося?
Справаздача аб дастаўцы.
Затое эсэмэсіцца – хоць да глыбокай ночы. А ёй з раніцы на пары ў суботу. Я ў суботу не вучуся, сплю раніцай. А ў яе – эканамічная тэорыя.
Ёй сумна.
А я сплю.
Яна піша мне.
Я не сплю.
Фільм амаль спампаваны, пачуўся сігнал.
«Я сёння не магу ☹ з сяброўкай па крамах ☺ а ўвечары маме дапамагаць прабач ☹».
Якая сяброўка? У майго сябра сёння дзень народзінаў!
«У майго сябра ДН ☺».
Справаздача аб дастаўцы.
Адразу ж.
«Ты ж ведаеш маё стаўленне да тваіх сяброў ☹».
Ведаю. Я слабак. Не ўмею выбіраць сяброў.
Хай бы сяброўка апынулася нейкім хлопцам, і ты нарэшце адстала ад мяне.
«А сяброўка выпадкова не мужчынскага роду? ☺»

Хоть бы подруга оказалась каким-нибудь парнем, и ты наконец отстала от меня.
«А подруга случайно не мужского рода? ☺»
Вот я юморной, аж тошнит. Желаемое выдаю за шутку.
За последние три года количество сообщений в мире утроилось.
Отчёт о доставке. Долбаные отчёты! Как их отключить?!
Людям втрое надоело живое общение.
Людям втрое надоели живые эмоции.
Людям втрое надоели живые люди.
«Хаха ☺ это Светка ☺».
Смайлы заменили точки ☺
«Ясно».
Один мой хороший знакомый сказал, что когда ты получаешь в SMS «Ясно», понимаешь, что тебя тактично послали. Я запомнил это высказывание надолго.
Отчёт о доставке.
Надоели отчёты. Раздражает. Отключил.
«Любишь пончики?»
Еду американских полицейских?
«Так же, как и тебя ☺».
Фильм скачался.
Может, пробежаться?
Но фильм уже скачался.
Может, сходить на турники?

Вось я гумарыст, аж ванітуе. Жаданае выдаю за жарт.
За апошнія тры гады колькасць паведамленняў у свеце патроілася.
Справаздача аб дастаўцы. Халерныя справаздачы! Як іх адключыць?!
Людзям утрая надакучылі жывыя зносіны.
Людзям утрая надакучылі жывыя эмоцыі.
Людзям утрая надакучылі жывыя людзі.
«Хаха ☺ гэта Светка ☺».
Смайлы замянілі кропкі ☺
«Зразумела».
Адзін мой добры знаёмы сказаў, што калі ты атрымліваеш у SMS «Ясна», разумееш, што цябе тактоўна паслалі. Я запомніў гэта выказванне надоўга.
Справаздача аб дастаўцы.
Надакучылі справаздачы. Раздражняе. Адключыў.
«Любіш пончыкі?»
Ежу амерыканскіх копаў?
«Гэтак жа, як і цябе ☺».
Фільм спампаваны.
Можа, прабегчыся?
Але фільм ужо спампаваны.
Можа, схадзіць на турнікі?
Але я даўно хацеў паглядзець гэты фільм.
Можа, прабегчыся, а потым – на турнікі?
Пагляджу фільм, які даўно хацеў паглядзець і які ўжо спампаваны, прабягуся, а потым – на турнікі.

Но я давно хотел посмотреть этот фильм.
Может, пробежаться, а потом – на турники?
Посмотрю фильм, который давно хотел посмотреть и который уже скачан, и пробегусь, а потом – на турники.
«Это как?»
Включил фильм.
Не очень.
«Очень, очень, очень сильно ☺».
Какой бред!
Входящие, функции, удалить всё? Да!
Исходящие, функции, удалить всё? Да!
«Я тебя тоже очень-очень люблю, солнце мое ☺».
Как это мило. Где мой тазик, чтобы проблеваться? Как же она любит сюсюканье.
Может, ей сказать, что я ненавижу сюсюканье?
«Я тебя все равно больше люблю ☺».
Она знает.
Всё начало фильма пропустил, перемотаю на начало.
Она расстроится. Я ей говорил.
Она опять расстроится.
«Я тебя миллион раз люблю ☺».
Как это она так «миллион» с двумя «л» написала? Наверное, сначала печатала с одной, но Т9 понёс чепуху. Потом написала с двумя.
«72 миллиона раз ☺».

«Гэта як?»
Уключыў фільм.
Не вельмі.
«Вельмі, вельмі, вельмі моцна ☺».
Халера!
Прынятыя паведамленні, функцыі, выдаліць усё? Так!
Адасланыя паведамленні, функцыі, выдаліць усё? Так!
«Я цябе таксама вельмі-вельмі люблю, сонца маё ☺».
Як гэта міла. Дзе мой тазік, каб званітаваць? Як жа яна любіць сюсюканне.
Можа, ёй сказаць, што я ненавіджу сюсюканне?
«Я цябе ўсё адно больш люблю ☺».
Яна ведае.
Увесь пачатак фільма прапусціў, перамотваю назад.
У яе папсуецца настрой. Я ёй казаў.
Яна зноў засмуціцца.
«Я цябе мільён разоў люблю ☺».
Як гэта яна «мільён» з мяккім знакам напісала? Напэўна, спачатку друкавала з апострафам, але T9 не прапанаваў нічога. Потым напісала правільна.
«72 мільёны разоў ☺».
О-о-о, гэта надоўга.
Фільм на старт.
Фільм на стоп.
На кухню па гарбату.

О-о-о, это надолго затянется.
Фильм на старт.
Фильм на стоп.
На кухню за чаем.
Фильм на старт.
SMS. Ответ на автомате.
Дальше смотреть фильм.
Никуда я не пойду: ни бегать, ни подтягиваться.
SMS. Ответ на автомате.
Говорят, если часто разговаривать по телефону, то можно заработать рак мозга. А если писать много SMS, можно заработать рак пальцев? А есть ли рак пальцев? Потом посмотрю в интернете.
Дальше смотреть фильм.
SMS. Ответ на автомате.
«…О чём ты мечтаешь?»
«Ни о чём. У меня всё есть: работа, дом, машина».
«А то, что не касается ‘‘великой американской мечты’’?»
«В смысле?»
«То, что не касается денег?»
«Другое меня не интересует».
«Так и жизнь пройдёт, не заметишь».
«У меня есть фотоаппарат. И есть деньги. Благодаря им я свободен от всех».
«Ты слишком зависим от своих вещей…»

Фільм на старт.
SMS. Адказ на аўтамаце.
Далей глядзець фільм.
Нікуды я не пайду: ні бегаць, ні падцягвацца.
SMS. Адказ на аўтамаце.
Кажуць, калі часта размаўляць па тэлефоне, то можна захварэць на рак мозгу. А калі пісаць шмат SMS, можна захварэць на рак пальцаў? Ці бывае рак пальцаў? Потым зірну ў інтэрнэце.
Далей гляджу фільм.
SMS. Адказ на аўтамаце.
«...Пра што ты марыш?»
«Ні пра што. У мяне ўсё ёсць: праца, дом, машына».
«А тое, што не датычыць "вялікай амерыканскай мары"?»
«У сэнсе?»
«Тое, што не тычыцца грошай?»
«Іншае мяне не цікавіць».
«Так і жыццё пройдзе, не заўважыш».
«У мяне ёсць фотаапарат. І ёсць грошы. Дзякуючы ім я вольны ад усіх».
«Ты занадта залежны ад сваіх рэчаў...»
А калі я стаў ад іх залежным? У дзяцінстве я не плакаў нават, калі ў мяне скралі ровар. А зараз баюся выйсці з дому, забыўшыся на тэлефон, плэер і зарадныя ад іх, калі сыходжу надоўга. Сотавы тэлефон побач са мной дваццаць чатыры гадзіны на суткі і сем дзён на тыдзень.

А когда я стал от них зависим? Ведь в детстве я даже не плакал, когда у меня украли велосипед. А сейчас боюсь выйти из дома, забыв телефон, плеер и зарядные устройства от них, если ухожу надолго. Сотовый телефон рядом со мной двадцать четыре часа в сутки и семь дней в неделю.
SMS. Ответ на автомате.
Фильм на старт.
Куда пропали мои мечты?
Сигнал из соцсетей. Кому-то понравилась моя фотография.
Неужели все мои мечты заменили телефон новой модели, мощный ноутбук, быстрый интернет, громкие наушники?
Кто я без всего этого?
Никто.
SMS. Не до тебя сейчас.
Встаю с дивана, хожу по комнате. Когда-то я прочитал одно стихотворение какого-то современного поэта. Не помню, как его имя. Кажется, оно начинается на Ф. Стих понравился. Даже выписал на листок. Или его имя на Г? Куда я положил этот листок? Лежал на столе же.
Под столом? Нет.
За компьютером? Нет.
Под клавиатурой? Нет.
На книжной полке? Да.

«Если бы всё нормально было,
То я сказку смог бы сделать былью.
Но есть проблемы из другой плоскости:

SMS. Адказ на аўтамаце.
Фільм на старт.
Куды зніклі мае мары?
Сігнал з сацыяльных сетак. Хтосьці ўпадабаў маё фота.
Няўжо ўсе мае мары замянілі тэлефон новай мадэлі, круты ноўтбук, хуткі інтэрнэт, гучныя навушнікі?
Хто я без усяго гэтага?
Ніхто.
SMS. Не да цябе цяпер.
Падымаюся з канапы, хаджу па пакоі. Калісьці я прачытаў верш нейкага сучаснага паэта. Не памятаю, як яго прозвішча. Здаецца, пачынаецца на Ф. Верш спадабаўся. Нават выпісаў на лісток. Ці яго імя на Г? Куды я падзеў гэты аркуш? Ляжаў жа на стале.
Пад сталом? Няма.
За камп'ютарам? Няма.
Пад клавіятурай? Няма.
На кніжнай паліцы? Так.

«Калі б мы ўсё рабілі нармальна,
То жылося б амаль ідэальна.
Але помніць заўжды мы павінны:
Паглядзець у сацсетках навіны,
Можа, выклаў хто 100 фотаздымкаў?
Можа, мне ў каментар нехта «дзынкнуў».

Я ещё в соцсетях не проверил новости.
Может, кто-то выложил сто фотографий?
Кому-то же плохо будет без моих комментариев.
Может, кто-то ждёт от меня сообщений?
А тут ещё двести штук нововведений.
Эти провода, это оптическое волокно
Окутало, сплело, околдовало, заволокло.
Сто мегабит в секунду, конечно, мало.
Жадность-подруга никуда не исчезала.
Посмотрим, сколько здесь, и, всё сравнив,
Выберем себе самый лучший тариф.
А у соседа какой? Зависть появилась тут же.
Надо нам, как у него, или даже в сто раз лучше.
Из окна доносится, как смеются дети.
Солнце зовёт тебя и приветливо светит…
Но слышится знакомый звуковой сигнал.
Пойду проверю, кто это вдруг мне написал».

У меня в жизни всё так же.

Подхожу к окну, смотрю на проезжающие мимо машины. Иду в другую комнату.

Живу один.

Я снимаю двухкомнатную квартиру.

Учусь. Приезжий.

Родители в другом городе.

Хтось чакае маіх эсэмэсак?
Хтось шукае прыгодаў сумесных?
Цянётаў гэтых аптычнае валакно
Ахутала, зачаравала ды апляло.
Сто мегабіт за секунду, вядома, мала.
Прагнасць-сяброўка нікуды пакуль не знікала.
Паглядзім навакол, падаб'ём каштарыс,
Абярэм для сябе самы лепшы тарыф.
А ў суседа які? Зайздрасць тут жа, як клешч.
Трэба ж, як у яго, ці то ў сто разоў лепш.
А за вокнамі, чуеш, вясёлыя дзеці.
Сонца кліча на шпацыр і радасна свеціць…
Але зноўку знаёмы сігнал прагучаў.
Я бягу правяраць, хто там мне напісаў».

У маім жыцці ўсё тое ж самае.
Падыходжу да акна, гляджу на машыны, якія праязджаюць міма. Іду ў іншы пакой.
Жыву адзін.
Я здымаю двухпакаёвую кватэру.
Вучуся. Прыезджы.
Бацькі ў іншым горадзе.
Яны здымаюць мне двухпакаёвую кватэру.
У двары дзеці гуляюць.
Дзевяць гадзін раніцы.

Они снимают мне двухкомнатную квартиру.
Во дворе дети играют во что-то.
Девять часов утра.
Дети играют во дворе.
Девять часов утра.
Что-то спать захотелось.
«Дорогая, я посплю! Как проснусь, тебе напишу».
«Ок ☺».
Потом досмотрю фильм.
Потом пойду на турники.
Надо найти свою мечту.
Нельзя жить без мечты.
Пойду посплю.
Потом найду мечту.
Как проснусь.
Отключу телефон. Нет. Вдруг кто-нибудь напишет.
Ты просыпаешься от сигнала SMS. Тянешь руку, нащупал, открыл глаза.
Посмотрел на часы. 11:00.
«Соня, вставай, уже 11 ☺».
«Встаю».
Отправить. Сообщение не отправлено.
Баланс, вызвать, долг.
Нужно положить денег на телефон.
Отправлю SMS, что у меня долг, так называемую «попрошайку».

Дзеці гуляюць у двары.
Дзевяць гадзін раніцы.
Нешта спаць захацелася.
«Любая, я пасплю! Як прачнуся, табе напішу».
«Ок ☺».
Потым дагляджу фільм.
Потым пайду на турнікі.
Трэба знайсці сваю мару.
Нельга жыць без мары.
Пайду пасплю.
Потым знайду мару.
Як прачнуся.
Адключыць тэлефон. Не. Раптам хтосьці напіша.
Ты прачынаешся ад сігналу SMS. Выцягваеш руку, намацаў, расплюшчыў вочы. Паглядзеў на гадзіннік. 11:00.
«Соня, уставай, ужо 11 ☺».
«Устаю».
Адправіць. Паведамленне не адпраўлена.
Баланс, выклікаць, доўг.
Трэба пакласці грошы на тэлефон.
Адпраўляю SMS, што ў мяне доўг.
«Грошыкі скончыліся? Я чакаю ☺».
Схадзіла б ды закінула мне грошай.

«Денежка закончилась? Я жду ☺».
Сходила и забросила бы мне денег.
Встаёшь, идёшь на кухню, открываешь холодильник, достаёшь сок, пьёшь.
Мне 21 год, а я был только в двух городах: в этом и в котором родился.
Объездить мир?
Объездить страну?
Объездить область?
Объездить город?
Пройтись по улице? Надо пополнить счёт на мобильном телефоне. Надо ей написать.
Ещё раз умылся.
Вышел на улицу. Зажмурился от яркого солнца. Дети до сих пор играют. Я ребёнком тоже играл. Может, это другие дети. Я до сих пор ребёнок. А в детстве я точно так и играл. И жмурился от яркого солнца. Забыл плеер. Пойду обратно. Нет. Обойдусь хотя бы раз без него. Послушаю город. Буду слушать город и жмуриться от яркого солнца. Спустился вниз по улице, перебежал дорогу. Вспомнил. Забыл ещё и кошелёк. Пошёл обратно.
– Парень! Парень, стой! – какой-то мужик из автомобиля окликнул меня. – Где пятый дом?
– А какая улица?
Дорогая немецкая машина, должен быть GPS. Здесь пересечение двух улиц, но ни на одной из них я не знаю, где пятый дом. Зачем я спросил?
Мужик сказал название.
– Нет, не знаю. Спроси у бабушек. Они по-любому знают.

Падымаешся, ідзеш на кухню, адчыняеш лядоўню, дастаеш сок, п'еш.
Мне 21 год, а я быў толькі ў двух гарадах: у гэтым і ў тым, дзе нарадзіўся.
Аб'ехаць свет?
Аб'ехаць краіну?
Аб'ехаць вобласць?
Аб'ехаць горад?
Прайсціся? Трэба папоўніць рахунак на мабільным. Трэба ёй напісаць.
Яшчэ раз памыўся.
Выйшаў на вуліцу. Зажмурыўся ад яркага сонца. Дзеці да гэтага часу гуляюць. Я дзіцёнкам таксама гуляў. Можа, гэта іншыя дзеці. Я да гэтага часу дзіця. А ў дзяцінстве я таксама так гуляў. І жмурыўся ад яркага сонца. Забыўся на плэер. Пайду назад. Не. Абыдуся хоць раз без яго. Паслухаю горад. Буду слухаць горад і мружыць вочы ад зыркага сонца. Спусціўся ўніз па вуліцы, перабег дарогу. Успомніў. Забыўся яшчэ і на гаманец. Пайшоў назад.
– Хлопец! Хлопец, стой! – нейкі мужык з аўтамабіля паклікаў мяне. – Дзе пяты дом?
– А якая вуліца?
Дарагая нямецкая машына, павінен быць GPS. Тут скрыжаванне дзвюх вуліц, але ні на адной з іх я не ведаю, дзе пяты дом. Навошта я спытаў? Мужык назваў.
– Не, не ведаю. Спытай у бабуль. Яны па-любому ведаюць.
– Добра.
З'ехаў.

– Хорошо.
Уехал.
Это первый человек, с кем я разговаривал за последние сутки голосом, а не сообщениями. После того как я вчера ушёл из университета и пришёл домой, я только и делал, что писал сообщения и отправлял письма. Продукты тоже покупал молча. Скайп и тот был отключён.
Погода хорошая, потом пробегусь.
Взял кошелёк, перебежал дорогу, зашёл в магазин. Подошёл к терминалу. Комиссия. Пойду до салона сотовой связи. Как же всё-таки нежелание потратить лишние рубли может заставить пройти лишние двести метров.
Пополнил счёт.
«Я теперь не на мели ☺».
«Ура!!!»
«Что делаешь?»
Можно спокойно идти домой. Блин, как далеко до дома. Идёшь и смотришь вокруг себя на окружающий мир: дома, люди, автомобили. Раньше я этого не замечал. Идёшь и смотришь вокруг.
SMS. Идёшь и смотришь в маленький экран телефона.
«Большая перемена. Пошли с девчатами в кафе ☺».
Следом ещё одна.
«А ты?»
Куда без ответного вопроса? «Как дела?» – «Норм. А у тебя?» – «Ты где?» – «Здесь, а ты?» И так далее.
«Иду домой ☺».

Гэта быў першы чалавек, з якім я размаўляў за апошнія суткі голасам, а не паведамленнямі. Пасля таго як учора сышоў з універсітэта і прыйшоў дахаты, я толькі і рабіў, што пісаў паведамленні і адпраўляў лісты. Прадукты таксама купляў моўчкі. Скайп і той быў адключаны.
Надвор'е добрае, потым прабягуся.
Узяў гаманец, перабег дарогу, зайшоў у краму. Падышоў да тэрмінала. Камісія. Пайду да салона сотавай сувязі. Як жа ўсё-ткі нежаданне выдаткаваць лішнія рублі можа прымусіць прайсці лішнія дзвесце метраў.
Папоўніў рахунак.
«Маю грошы ☺».
«Ура!!!»
«Што робіш?»
Можна спакойна ісці дадому. Блін, як далёка. Ідзеш і глядзіш на навакольны свет: дамы, людзі, аўтамабілі. Раней я гэтага не заўважаў. Ідзеш і глядзіш вакол. SMS. Ідзеш і глядзіш на маленькі экран тэлефона.
«Вялікі перапынак. Пайшлі з дзяўчатамі ў кавярню ☺».
Следам яшчэ.
«А ты?»
Куды без пытання ў адказ? «Як справы?» – «Нармаль. А ў цябе?» – «Ты дзе?» – «Тут, а ты?» І гэтак далей.
«Іду дадому ☺».
Сонца свеціць ярка, аўтамабілі праязджаюць міма не так часта, як у будзённыя дні. Трэба часцей выбірацца з электроннага палону.

Солнце светит ярко, автомобили, проезжающие мимо, не так часты, как в будни. Надо почаще выбираться из электронного плена.
Побежал через дорогу. SMS. Отвлёкся. Остановился.
«Вы пополнили счёт…» и что-то ещё.
Гудок. Удар. SMS. Боль. Полёт. Крики людей. Падение. Боли нет.

Ты лежишь на асфальте посреди дороги. Вокруг тебя собралась толпа. Кто-то щупает пульс. Кто-то говорит по телефону в слезах. У кого-то истерика. Кто-то делает массаж сердца. Насмотрелись американских фильмов. Боли нет.
«Ты чего не отвечаешь?»
Ты смотришь на всё это со стороны. Слышится крик: «Здесь есть врач? Кто-нибудь, вызовите врача!»
В ответ чья-то истерика.
«Ты почему молчишь?»
Странно, но телефон не разбился. Он отлетел метров на десять от меня.
«Опять деньги закончились?»
А я – метров на десять от машины.
Кто-то пытается остановить кровь.
«Ты чего меня игноришь?»
«Скорая» еще не приехала. Водитель пытается мне помочь изо всех сил. Толпа зевак становится меньше.
«Всё, я обиделась ☹».
Извини…

Конец.

Пабег цераз дарогу. SMS. Прыпыніўся.
«Вы папоўнілі кошт...» і нешта яшчэ.
Гудок. Удар. SMS. Боль. Палёт. Крыкі людзей. Падзенне. Болю няма.

Ты ляжыш на асфальце пасярод дарогі. Вакол цябе сабраўся натоўп. Хтосьці мацае пульс. Хтосьці ў слязах гаворыць па тэлефоне. У кагосьці істэрыка. Хтосьці робіць масаж сэрца. Наглядзеліся амерыканскіх фільмаў. Болю няма.
«Ты чаго не адказваеш?»
Ты глядзіш на ўсё гэта збоку. Чуецца крык: «Тут ёсць доктар? Хто-небудзь, доктара!»
У адказ чыясь істэрыка.
«Ты чаму маўчыш?»
Дзіўна, але тэлефон не разбіўся. Ён адляцеў метраў на дзесяць ад мяне.
«Ізноў грошы скончыліся?»
А я – метраў на дзесяць ад машыны.
Хтосьці спрабуе спыніць кроў.
«Ты чаго мяне ігнаруеш?»
«Хуткая» яшчэ не прыехала. Кіроўца спрабуе мне дапамагчы, як можа. Натоўп разявак меншае.
«Усё, я пакрыўдзілася ☹».
Прабач...

Канец.

МОЛОДЫЕ БЕЛОРУССКИЕ ПИСАТЕЛИ
МАЛАДЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

Николай Андреев	Мікалай Андрэеў
Алёна Белоножка	Алёна Беланожка
Дарья Вашкевич	Дар'я Вашкевіч
Маргарита Латышкевич	Маргарыта Латышкевіч
Ольга Черкас	Вольга Чэркас

Николай Андреев

Авторский перевод на белорусский язык

Мікалай Андрэеў

Аўтарскі пераклад на беларускую мову

Николай Андреев родился 15 октября 1987 года в г. Минске. С 2003 по 2005 год учился в Лицее при БГУ. В 2010 году окончил исторический факультет Белорусского государственного университета. С 2010 по 2012 год работал в отделе рекламы и маркетинга страховой компании «Белгосстрах». В 2009 году в журнале «Нёман» был опубликован рассказ «Пока есть время».

Мікалай Андрэеў нарадзіўся 15 кастрычніка 1987 года ў г. Мінску. З 2003 па 2005 год навучаўся ў Ліцэі пры БДУ. У 2010 годзе скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 2010 па 2012 год працаваў у аддзеле рэкламы і маркетынгу страхавой кампаніі «Белгосстрах». У 2009 годзе ў часопісе «Нёман» было апублікавана апавяданне «Пока есть время».

МИНСКЪ-CITY

1.

Из чего, как вы думаете, состоит город?

Из кварталов, крыш, площадей, рынков и проезжей части? Или из памятников, музеев, кинотеатров, исторических достопримечательностей? Или, может, из набережных, кафе, парков и фонтанов?

Если быть до конца откровенным – то из всего сразу. Каждый человек в отдельности воспринимает город как что-то родное. Волей-неволей, оказываясь в незнакомом городе, мы стремимся почувствовать себя как можно комфортней и как можно скорей. А что может быть лучше, чем просто размотать клубок своих родных ассоциаций и протянуть нити воспоминаний по незнакомым проспектам и улицам?

Вот если взять в общем, то любой город в мире складывается из двух главных частей. Из города и горожан. Как бы там ни было, его внешний облик изменяется не так стремительно, как образ в головах людей. Образы. Поколения. Когда думаешь «старый город», сразу же представляются дореволюционные фотокарточки с последними экипажами и доисторическими трамваями на первом плане. А кто-нибудь думает такими категориями, например, как «новый город»? Разве что только из-за местных самоназваний.

Минск не стал исключением из этого правила. Объективно – город удалён от современного восприятия столицы. Город, если можно так сказать,

МІНСКЪ-CITY

1.

Як вы думаеце, з чаго складаецца горад?

З кварталаў, дахаў, плошчаў, рынкаў і праезджай часткі вуліцы? Ці з помнікаў, музеяў, кінатэатраў, гістарычных мясцін? Ці, можа, з узбярэжжаў, кафэ, паркаў і фантанаў?

Калі быць да канца шчырым – то з усяго адразу. Кожны чалавек сам па сабе ўспрымае горад як нешта роднае. Апынуўшыся ў незнаёмым горадзе, мы міжволі імкнемся адчуць сябе як мага камфортней і як мага хутчэй. А што можа быць лепей, чым проста разматаць клубок сваіх родных асацыяцый і працягнуць ніткі ўспамінаў па незнаёмых праспектах і вуліцах?

А вось калі ўзяць у агульным, то любы горад на свеце складаецца з дзвюх галоўных частак. З горада і гараджан. Як бы там ні было, яго знешняе аблічча змяняецца не так імкліва, як вобраз у галовах людзей. Вобразы. Пакаленні. Калі думаеш «стары горад», адразу ж уяўляюцца дарэвалюцыйныя фотакарткі з апошнімі экіпажамі і дагістарычнымі трамваямі на першым плане. А ці думае хто-небудзь такімі катэгорыямі, як, напрыклад, «новы горад»? Хіба што толькі з-за мясцовых саманазваў.

Мінск не стаў выключэннем з гэтага правіла. Аб'ектыўна – горад аддалены ад сучаснага ўспрымання сталіцы. Горад, калі можна так сказаць, анахранічны свайму часу. Але ў ім жывуць людзі. І многія гараджане валодаюць новым

анахроничен своему времени. Но в нём живут люди. И многие горожане обладают новым типом мышления, новым взглядом на мир. Самое в этом интересное, что в представлении современного поколения двадцатилетних город рисуется почти так же, каким он выглядит на своей историограмме.

История города, как и молодёжная карта города, состоит из одних и тех же точек. Факты, места, события – в этой системе координат потеряться будет просто, конечно, если ты плохо ориентируешься в городе. Например, можно здорово разбираться в древностях города, однако делать глаза по чайному блюдцу, услышав «стрелка на Яке» или «туса на кишке».

Совершенно очевидно и естественно, что сам город в его исторической ретроспективе и взаимосвязанном с этим представлении старшего поколения жителей в реальности не является тем городом, в котором живёт новое поколение.

Краеведы и историки только изредка могут оживить «ископаемый» город. А вот молодые преемники Минска с рождения существуют в гораздо более подвижной среде. Город обретает новую кровь и учащает пульс, когда его улицы заполняются энергией молодой жизни.

Весна уже заполонила городские капилляры-улочки на окраинах. И наконец, добралась до главных артерий – проспектов. Как и многие другие бывшие советские столицы, Минск имеет проспектный скелет. Все более-менее значащие дела творятся на этих условных линиях, которые со временем становятся всё более безусловными. Разумеется, относительно тех, кто в этих линиях что-то смыслит. Или прячет.

тыпам мыслення, новым поглядам на свет. Самае цікавае ў гэтым, што ва ўяўленні сучаснага пакалення дваццацігадовых горад малюецца амаль таксама, як ён выглядае на сваёй гісторыяграме.

Гісторыя горада, як і моладзевая карта горада, складаецца з адных і тых жа пунктаў. Факты, месцы, падзеі – вядома, што ў гэтай сістэме каардынат згубіцца будзе проста, вядома, калі ты дрэнна арыентуешся ў горадзе. Напрыклад, можна выдатна разбірацца ў старажытнасцях горада, аднак рабіць вочы па чайным сподачку, пачуўшы «стрэлка на Яку» або «туса на кішцы».

Цалкам відавочна і натуральна, што сам горад у яго гістарычнай рэтраспектыве і ўзаемазлучаным з гэтым уяўленнем старэйшага пакалення жыхароў у сапраўднасці не з'яўляецца тым горадам, у якім жыве новае пакаленне.

Краязнаўцы і гісторыкі толькі зрэдку могуць ажывіць «выкапнёвы» горад. А вось маладыя пераемнікі Мінска з нараджэння існуюць у значна больш рухомым асяроддзі. У горада абнаўляецца кроў і пачашчаецца пульс, калі яго вуліцы запаўняюцца энергіяй маладога жыцця.

Вясна ўжо напоўніла гарадскія капіляры-вулачкі на ўскраінах. І нарэшце, дабралася да галоўных артэрый – праспектаў. Як і многія іншыя былыя савецкія сталіцы, Мінск мае праспектны шкілет. Усе больш-менш значныя справы дзеюцца на гэтых умоўных лініях, якія з часам становяцца ўсё больш безумоўнымі. Зразумела, адносна тых, хто ў гэтых лініях нешта разумее. Ці штосьці хавае.

Дзіма, да прыкладу, нічога не хаваў. Ён заўсёды сумленна дзяліўся цыгарэтамі са сваім сябрам Колем Паўлавым. Той, у сваю чаргу, быў чалавекам імпульсіўным і засяроджаным, з-за чаго насіў гутарковую мянушку «Пульс». А Дзіма, з-за

Дима, например, ничего не прятал. Он всегда честно делился сигаретами со своим другом Колей Павловым. Тот, в свою очередь, был человеком импульсивным и сосредоточенным, отчего носил говорящую кличку «Пульс». А Дима, из-за своего увлечения музыкой (в частности – бессмертным Джимми Хендриксом), удостоился звучного тусовочного погоняла «Джимми».
Так вот, оба этих типа шагали по горбатой Ульяновской, имея в планах посетить историческую резервацию Старого города. Пульс, как всегда, жаловался на то, что в Минске так мало свободных тусовочных мест и что каждый раз приходится тыкаться в одни и те же:
– Ну, вот смотри, Джимми. Мы вчера были в парке Горького. Сегодня мы уже были на Яке, на реке, и в общем-то, у нас и осталась одна Немига.
– Ты опять нудишь, что город тебе надоел?
– Да, чувак, я торчу тут уже третий год безвылазно. Знаешь, даже если бы это был Рим, он бы мне точно так же осто…
– Ну-ну! Рим. Это лучше, чем Рим, – Джимми многозначительно поднял указательный палец. – Ты только подумай! Много ты знаешь о городе?
Пульс искоса посмотрел на приятеля.
– Ты чего мне тут крутишь?
– Я ничего не кручу. Я про то, что мы действительно тусуемся по одним и тем же местам. А вот я уверен, что стрит гораздо шире.
– Ай, ладно, – Пульс нетерпеливо махнул рукой. – Знаешь, по такой погоде мне сейчас всё хорошо. Так что давай не будем париться и… стой! Твою мать, красный же свет!
Джимми замер на переходе как вкопанный.

свайго захаплення музыкай (у прыватнасці – бессмяротным Джымі Хендрыксам), быў уганараваны гучным тусовачным паганялам «Джымі».

Дык вось, абодва гэтыя тыпы крочылі па гарбатай Ульянаўскай, маючы на мэце наведаць гістарычную рэзервацыю Старога горада. Пульс, як заўсёды, скардзіўся на тое, што ў Мінску так мала вольных тусовачных мясцінак і што кожны раз даводзіцца совацца ў адны і тыя ж:

– Ну, вось глядзі, Джымі. Мы ўчора былі ў парку Горкага. Сёння мы ўжо былі на Яку, на рацэ, і ўвогуле, у нас засталася толькі адна Няміга.

– Ты зноў жмiндзіш, што горад табе надакучыў?

– Так, чувак, я тырчу тут ужо трэці год невылазна. Ведаеш, нават калі б гэта быў Рым, ён бы мне сапраўды гэтак жа аста...

– Ну-ну! Рым. Гэта лепш, чым Рым, – Джымі шматзначна падняў указальны палец. – Ты толькі падумай! Ці так ужо многа ты ведаеш пра горад?

Пульс скоса зірнуў на прыяцеля.

– Ты чаго мне тут укручваеш?

– Я нічога не кручу. Я пра тое, што мы сапраўды тусуемся па адных і тых жа месцах. А вось я ўпэўнены, што наш стрыт значна шырэйшы.

– Ай, ладна, – Пульс нецярпліва махнуў рукой. – Ведаеш, па такім надвор'і мне зараз усё ладна. Так што давай не будзем парыцца і... стой! Тваю матку, чырвонае ж святло!

Джымі замёр на пераходзе як укапаны.

– Так, чырвонае святло – дарогі не дало. Ведаюць нават маленькія дзеці, – пажартаваў ён, каб хоць неяк апраўдаць сваю няўважлівасць. Джымі наогул

– Да, красный свет – дороги нет. Знают даже маленькие дети, – отшутился он, чтобы хоть как-то оправдать свою невнимательность. Джимми вообще редко когда замечал переходы. А здесь, когда оставалось всего ничего до стеклянной арки метрополитена, внимание его было совершенно отстранено от проблем безопасности дорожного движения. Предвкушая выход на финишную прямую под лучами апрельского солнца и всяческие бонусы в виде красивых (и просто симпатичных) попутчиц, Джимми витал в грёзах.
Пульс пригрозил пальцем и озвучил пару грязноватых идиом. Джимми только развёл руками – ну ведь, в самом деле, велика беда!

2.

Здание Оперного после реконструкции заметно преобразилось. Правда, некоторая дисгармония титанических фигур на фасаде и тортообразной конструкции самого театра хоть и резала эстетически закалённый глаз, в целом картина была очень даже ничего. На лестнице, недалеко от грандиозного фонтана, копошился выводок архитекторов. Практическое занятие. Зарисовка объекта в какой-то там перспективе.
Девочки галдят, мальчики ломают друг другу карандаши, преподаватель – молодая аспирантка – пытается подвести всех к общему знаменателю. У неё в личной жизни водородный взрыв, поэтому нервы ни к чёрту. Немного прикрикнула на обормотов в третьем ряду. Вроде спокойней стало.
– Так, Никифорова, Синявская и Захаркевич, рисуете мне фасад в полную. Понятно? Чтобы никаких. Глянули, сняли – нарисовали. Всё. А то мы в Академию до послезавтра не вернёмся.

рэдка калі заўважаў пераходы. А тут, калі заставалася ўсяго нічога да шкляной аркі метрапалітэна, увага яго была зусім далёкай ад праблем бяспекі дарожнага руху. Прадчуваючы выхад на фінішную прамую пад праменнямі красавіцкага сонца і ўсемагчымыя бонусы ў выглядзе прыгожых (і проста сімпатычных) спадарожніц, Джымі лунаў у марах.

Пульс прыгразіў пальцам і агучыў пару бруднаватых ідыём. Джымі толькі развёў рукамі – ну, што там, такая ўжо і бяда!

2.

Будынак Опернага пасля рэканструкцыі прыкметна змяніўся. Праўда, некаторая дысгармонія тытанічных фігур на фасадзе і тортападобнай канструкцыі самога тэатра хоць і рэзала эстэтычна загартаваныя вочы, але ў цэлым карціна была вельмі нават нішто сабе. На лесвіцы, недалёка ад грандыёзнага фантана, кешкаўся вывадак архітэктараў. Практычныя заняткі. Замалёўка аб'екта ў нейкай там перспектыве.

Дзяўчаты гамоняць, хлопцы ламаюць адзін аднаму алоўкі, выкладчык – маладая аспірантка – спрабуе падвесці ўсіх да агульнага назоўніка. У яе ў асабістым жыцці вадародны выбух, таму нервы ну хоць да д'ябла. Трохі прыкрыкнула на абармотаў у трэцім радзе. Там, як быццам, супакоіліся.

– Так, Нікіфарава, Сіняўская і Захаркевіч, малюеце мне фасад у поўную. Зразумела? Каб ніякіх! Зірнулі, знялі – намалявалі. Усё. А то мы ў Акадэмію да паслязаўтра не вернемся.

– Тамара Аркадьевна, а можно я тоже фасад? – защебетала русая студентка в смешной полосатой юбке.
– Настя, но ты же уже взяла другой профайл!
– Ну, пожа-а-алуйста! Помните, как я хорошо кафедральный собор зарисовала?
– Ну, ладно, пиши фасад. Только шнель – уже три. Нам надо до пяти всё сделать и… ладно, работайте. Я тут – рядом, – Тамара Аркадьевна сделала пару шагов в сторону здания, вскинула к уху телефон, и началась долгая эмоциональная тирада.
Студенты даже не пытались подслушать или вникнуть, какие там у Тамары Аркадьевны личные заморочки.
Половина курила на скамейке, аргументируя это тем фактом, что им надо сосредоточиться. Настя решила не тянуть кота за хвост и быстро накидала на планшете графику. Сложностей особо никаких, но так лень теперь всё это одеталивать. Глянув на часы, она решила, что лучше сейчас всё быстро провернуть и смыться отсюда куда-нибудь погулять. Хоть бы и одна. Конечно, Рома Василевский уже вторую неделю на занятиях по натуре активно намекает на совместный променад, но…
Рома скучный парень. Так, конечно, ничего. Но он даже не умеет провести такой маршрут, чтобы через час не заскучать. Ну не чувствует человек улицы. Всегда выбирает такие места, где что ни шаг – то переход, или сужение, или, того хуже, – тупик. В общем, с ним особо не погуляешь. Поэтому Настя решила погулять одна. И на этом коротком пути к обычному человеческому счастью сейчас стояла одна-единственная химера – зарисовка фасада.

– Тамара Аркадзьеўна, а можна я таксама фасад? – зашчабятала русая студэнтка ў смешнай паласатай спадніцы.
– Насця, але ты ж ужо ўзяла іншы прафайл!
– Ну, калі ласачка! Памятаеце, як я добра кафедральны сабор змалявала?
– Ну, добра, пішы фасад. Толькі шнэль – ужо тры. Нам трэба да пяці ўсё зрабіць і ... добра, працуйце. Я тут – побач, – Тамара Аркадзьеўна зрабіла пару крокаў у бок будынка, ускінула да вуха тэлефон, і пачалася доўгая эмацыянальная тырада. Студэнты нават не спрабавалі падслухаць або паглыбіцца, якія там у Тамары Аркадзьеўны асабістыя замарочкі.
Палова гурту смаліла цыгарэты на лаўцы, аргументуючы гэта тым фактам, што ім трэба засяродзіцца. Насця вырашыла не цягнуць ката за хвост і хутка накідала на планшэце графіку. Складанасцей асабліва ніякіх, але так лянотна цяпер усё гэта дэталяваць. Зірнуўшы на гадзіннік, яна вырашыла, што лепей зараз усё хуценька пракруціць і змыцца адсюль куды-небудзь прагуляцца. Хоць бы і адной. Вядома, Рома Васілеўскі ўжо другі тыдзень на занятках па натуры актыўна намякае на сумесны праменад, але ...
Рома сумны хлопец. Так, вядома, ён як бы і нішто сабе. Але ён нават не ўмее правесці такі маршрут, каб праз гадзіну не засумаваць. Ну не адчувае чалавек вуліцы. Заўсёды выбірае такія месцы, дзе што ні крок – то пераход, або звужэнне, або, яшчэ горш, – тупік. Увогуле, з ім асабліва не пагуляеш. Таму Насця вырашыла пагуляць адна. І на гэтым кароткім шляху да звычайнага чалавечага шчасця зараз стаяла адна-адзіная хімера – замалёўка фасада.

3.

– Приехали, стронцо путана! – Александр сидел за рулём замолкнувшего по непонятным причинам автомобиля и злился. Дневной график – псу под хвост. Если сейчас с Немиги перебираться на городском транспорте на Партизанский проспект – это могила. Ничего он не успеет, потому что потом надо возвращаться назад, а потом – в Зелёный Луг. То есть полный абзац.

– Их нельзя держать включёнными постоянно. Это же радиация в огромных дозах. Будем ловить «на живца». Нужна приманка.
– Гребень! – Ханько бросилась к шкафу, но, отомкнув его, растерянно сказала: – Исчез…
Василий Петрович вытер лоб носовым платком:
– Если гребень у неё, то теперь это не русалка, а чистый ангел смерти. Гребень придаёт ей силы. И за то, что мы с ней сделали, она вычешет нас этим гребнем из числа живых.

В исследовательской лаборатории было введено чрезвычайное положение. Преподавателям, студентам и лаборантам запрещалось ходить по одному и носить длинные волосы. Всем были выданы шприцы с препаратом, чтобы в случае встречи с русалкой моментально её обездвижить. На ночь все до одного обязались покидать лабораторию.

На следующий день в холодильной комнате была найдена Ханько. В её сердце торчал шприц с препаратом.
Через день в соседнем павильоне погибла Света Верба: как будто оступилась и попала под сильный разряд электричества.

– Грэбень! – ускрыкнула Ханько і кінулася да шафачкі, але, адамкнуўшы яе, разгублена сказала: – Знік…
Васіль Пятровіч выцер лоб насоўкай і ціха прамовіў:
- Калі грэбень у яе… то цяпер гэта не русалка, а чысты анёл смерці. Грэбень надае ёй сілы. І за тое, што мы з ёй рабілі, яна вычаша нас гэтым грэбенем з ліку жывых.

У даследчай лабараторыі абвясцілі надзвычайнае становішча. Выкладчыкам, студэнтам і лабарантам забаранілі перамяшчацца па адным і насіць доўгія валасы. Усім выдалі шпрыцы з праяўляльным прэпаратам, каб у выпадку сустрэчы з русалкай тэрмінова яе абезрухоміць. На ноч усе да аднаго мусілі пакідаць лабараторыю.
На наступны дзень у халадзільным пакоі была знойдзеная Ханько. У яе сэрцы тырчэў шпрыц з прэпаратам.
Праз дзень у суседнім павільёне загінула Святлана Вярба: як быццам аступілася і патрапіла пад моцны электрычны разрад.
– Русалка хацела зацягнуць мяне ў ваду, – сказаў Янік над целам Вярбы. – Яна не супакоіцца, пакуль не атрымае сваё.

Увечары Янік не пакінуў лабараторыю разам з іншымі. Ён сеў на падлогу ў цэнтры павільёна і стаў чакаць.
Як толькі электронны гадзіннік абнуліў час на новыя суткі, у павільён увайшла русалка. Яна злавіла сваімі бяздоннымі вачамі позірк хлопца, мякка ўсміхнулася яму, села побач і ціха сказала:

– Это не те жертвы, – сказал Яник над телом Вербы. – Русалка хотела затянуть в воду меня. Она не успокоится, пока не получит своё.

Вечером Яник не оставил лабораторию вместе с остальными. Он сел на пол в центре павильона и стал ждать.
Как только электронные часы обнулили время на новые сутки, в павильон вошла русалка. Она поймала своими бездонными глазами взгляд Яника, мягко улыбнулась, подошла и села рядом.
– Вот и ты… – сказала она.
– Как ты выбралась из вольера? – спросил Яник.
– Метнула гребень и перерубила им провода.
– Если тебе был нужен я – зачем столько жертв?
– Боль за боль. Кстати, те две не мучились так, как мучили меня.
– А третью за что?
Русалка провела гребнем по волосам и дотронулась до розового шрама от верёвки на своей шее. Шрам покраснел.
– Смерть за смерть, – прошептала она.
Парню нестерпимо захотелось коснуться русалки.
– Скажи… почему ты лишила себя жизни? – спросил Яник и провёл ладонью по её шее.
Русалка зажмурилась от удовольствия.
– Из-за парня. Он женился на другой, – ответила она, схватила ладонь Яника и поцеловала её.
– И где он сейчас?

– Вось і ты...
– Як ты выбралася з вальера? – спытаўся Янік.
– Кінула грэбень і перарубіла ім правады.
– Калі табе быў патрэбны я – нашто столькі ахвяр?
– Боль за боль. Дарэчы, тыя дзве не мучыліся так, як мучылі мяне.
– А трэцюю за што?
Русалка правяла грэбенем па валасах. Ружовы шнар на яе шыі пачырванеў.
– Смерць за смерць, – сказала яна.
Хлопцу вельмі захацелася дакрануцца да русалкі.
– Скажы... чаму ты пазбавіла сябе жыцця? – спытаўся Янік і правёў далонню па яе шыі.
Русалка зажмурылася ад асалоды.
– З-за хлопца. Ён пабраўся шлюбам з другой, – вымавіла яна, схапіла руку хлопца і пацалавала яе.
– І дзе ён цяпер?
– Ён патануў год таму. Няшчасны выпадак!
– А яна?
– А яе… токам учора забіла!
Русалка рассмяялася. Рэха яе смеху пракацілася па калідорах, некалькі разоў адскочыла ад прыборных панэляў і вылецела ў вентыляцыйную шахту.
– Ты прыйшла па мяне? Забівай.
– Не хачу.
Янік адчыніў дзверы лабараторыі. З двара пацягнула чэрвеньскай свежасцю.

– Он утонул год тому назад. Несчастный случай.
– А её… её вчера убило током!
Русалка засмеялась. Эхо её смеха покатилось по коридорам, несколько раз отразилось от приборной панели и вылетело в вентиляционную шахту.
– Ты пришла за мной. Убивай, – Яник лёг.
– Не хочу.
Яник встал и открыл двери лаборатории. Снаружи потянуло июньской свежестью.
– Тогда иди на волю, на свою берёзу.
Русалка грустно посмотрела на парня.
– Я не хочу идти. Я жить хочу. С тобой жить! – тут она заговорила быстро и сбивчиво: – Если священник набросит на меня крестик и окрестит новым именем, я стану человеком – живым человеком и не буду помнить, что делали со мной и что делала я! И я проживу свой век среди людей! Тебе же нравятся мои глаза, руки, моё тело? Найди священника!
– Где же я его найду? Уже целое столетие наша официальная религия – универсология…
– Я знаю, я при жизни была универсалкой… Наука не умеет воскрешать, воскрешает только вера! Ты знаешь, куда идти. Я буду ждать тебя здесь. Отнеси ему мой гребень.
Русалка воткнула гребень в волосы Яника и исчезла.

Яник подошёл к маленькой церкви, которая носила статус архитектурного памятника и поэтому не была уничтожена одержимыми чиновниками-

– Тады ідзі на волю, на сваю бярозу.
Русалка паглядзела Яніку ў вочы і сумна сказала:
– І ісці не хачу. Я жыць хачу! З табой жыць! – тут яна загаварыла вельмі хутка і нервова: – Калі святар накіне на мяне крыжык і ахрысціць новым імем, я стану чалавекам – жывым чалавекам, я не буду памятаць, што са мной рабілі і што рабіла я! І дажыву свой век сярод людзей! Табе ж падабаюцца вочы мае, рукі мае, стан? Дык знайдзі святара!
– Дзе ж я табе яго знайду? Ужо стагоддзе, як наша афіцыйная рэлігія – юніверсалогія...
– Я ведаю, я пры жыцці была юніверсалкай. Навука не ўмее ўваскрашаць, уваскрашае толькі вера! Ты ведаеш, куды трэба ісці! Я буду чакаць цябе тут. Аднясі яму мой грэбень!
Русалка ўсадзіла грэбень у валасы Яніка і знікла.

Янік падышоў да маленькай царквы, якая насіла статус архітэктурнага помніка і таму не была зруйнаваная апантанымі чыноўнікамі-юніверсолагамі. Цяпер тут быў арганізаваны «Музей хрысціянства». У ім пастаянна жыў загадчык, стораж і экскурсавод – трыадзіны прафесійна і цэласны духоўна музейнік Міраслаў, аб якім хадзілі чуткі, што ён па начах служыць малебны і нават хрысціць дзяцей.
Янік узняўся па каменных прыступках і, крыху памарудзіўшы, пагрукаў у дзверы.
– Хто такі? Нашто прыйшоў? – пачулася знутры.
– Я… мне… студэнт. З лабараторыі.

универсологами. Теперь здесь был организован «Музей христианства». В нём постоянно жил заведующий, сторож и экскурсовод – триединый профессионально и целостный духовно музейник Мирослав, о котором ходили слухи, что по ночам он тайно служит молебны и даже крестит детей.

Яник поднялся по каменным ступеням и, немного помедлив, постучал в дверь.

– Кто такой? Зачем пришёл? – раздалось изнутри.

– Мне… я студент. Из лаборатории.

– Молодой универсолог. За крестиком или как?

– Нет, я… по личному вопросу.

Дверь открылась. Лысый музейник в чёрном балахоне прищурился, оценивая Яника, а после сделал два шага назад, пропуская парня:

– Входи.

Яник переступил порог и вошёл в музей, ходить в который без научного повода у универсологов считалось страшным пороком.

Парень осмотрелся. В свете лампад за ним наблюдали изображения сосредоточенных святых. От их взглядов у Яника похолодели руки.

Тем временем Мирослав достал из-под подола зелёную стеклянную бутылку.

– Кагор. Христова кровь! – сказал он, наливая вино в музейный экспонат – серебряную чашу, и протянул чашу Янику. – Держи.

– Я не пью.

– Я не сказал – пей, я сказал – держи, – музейник закрыл бутылку, поставил её на пол и взял чашу с вином из руки Яника. – Я знаю: вы, учёные-

– Малады ўніверсолаг. Па крыжык ці як?
– Не… я па асабістым пытанні.
Дзверы адчыніліся. Лысы музейнік у чорным балахоне прыжмурыўся, ацэньваючы Яніка, а потым зрабіў два крокі назад, прапускаючы хлопца:
– Уваходзь.
Янік пераступіў парог і ўвайшоў у музей, хадзіць у які без навуковай нагоды ў юніверсолагаў лічылася жудаснай заганай. Хлопец агледзеўся. У святле лампад са сцен за Янікам сачылі засяроджаныя выявы святых. Ад іх позіркаў у Яніка пахаладзелі рукі.
Тым часам музейнік Міраслаў дастаў з-пад крыса зялёную шкляную бутэльку.
– Кагор! Хрыстова кроў, – абвясціў ён, наліваючы віно ў музейны экспанат – срэбны кубак, і працягнуў кубак Яніку. – Трымай.
– Я не п'ю.
– Я не сказаў – пі, я сказаў – трымай, – музейнік закрыў бутэльку, паставіў яе на падлогу і ўзяў кубак з кагорам з рукі Яніка. – Я ведаю: вы, навукоўцы-юніверсолагі, кроў не п'еце, вы яе разглядаеце ў мікраскоп. Вы ўсё разглядаеце ў мікраскоп, а што не змяшчаецца на шкельца – за тым цікуеце ў тэлескоп! Як там у вас… «прычынна-выніковыя адносіны асобных частак прасторы, якія развіваюцца ў часе»…
Янік кіўнуў. Міраслаў адпіў з кубка.
– Вы не любіце Жыццё, – сказаў ён, – вы яго прэпарыруеце. Спачатку разабралі матэрыю на часткі. Потым тканіну прасторы і часу разматалі, падзялілі. Цяпер вось у паралельныя вымярэнні торкаецеся, як быццам кансерву адкрываеце

универсологи, кровь не пьёте. Вы её рассматриваете в микроскоп. Вы всё рассматриваете под микроскопом, а что не помещается на стёклышко, затем наблюдаете в телескоп! Как там у вас… «причинно-следственные отношения отдельных частей пространства, которые развиваются во времени…»

Яник кивнул. Мирослав отпил из кубка.

– Вы не любите Жизнь, – сказал он, – вы её препарируете. Сначала разобрали материю на частицы. Потом ткань пространства и времени размотали, поделили. Теперь вот в параллельные измерения тычетесь, как будто открываете консервы тупым ножом. Чистый бандитизм! Вас пустили в этот мир немного пожить, а вы сразу – ломать, рвать, шкодить. И называется это всё у вас – «изучение законов существования». Вот тебя разорвать на части – ты долго просуществуешь?

Яник пожал плечами.

– А я знаю! – не дожидаясь ответа, сказал музейник. – Будет твоё тело существовать по частям, руки-ноги, пока не сгниёт, а сам ты бестелесным духом будешь блуждать в пространстве, полуживой… пока тебя не поймает какой-нибудь молодой учёный-универсолог и не истерзает, как твою русалку-универсалку.

Мирослав осушил чашу, вытер губы рукавом и произнёс:

– Кстати, она вчера была тут. Сидела во-он на той берёзке, а в храм не вошла – конечно, куда ей, закладной! Благодать не пустит. Ждала, пока я выйду сам и без креста. Так вот, жаловалась на вас. Про тебя говорила, что придёшь.

Яник достал из кармана гребень и протянул музейнику.

тупым нажом. Чысты бандытызм! Вас пусцілі ў гэты свет крыху пажыць, а вы адразу – ламаць, раздзіраць, шкодзіць. І называецца гэта ўсё ў вас – «вывучэнне законаў існавання». Вось цябе раздзерці на часткі – ці доўга ты праіснуеш?
Янік паціснуў плячамі.
– А я ведаю! – не чакаючы адказу, сказаў музейнік. – Будзе тваё цела існаваць па частках, рукі-ногі, пакуль не згніе, а сам ты бесцялесным духам будзеш блукаць у прасторы, напаўжывы… пакуль цябе не спаймае які-небудзь малады вучоны ды не закатуе, як тваю русалку-юніверсалку.
Міраслаў асушаў кубак да дна, выцер вусны рукавом і прамовіў:
– Дарэчы, яна ўчора была тут. Сядзела ву-унь на той бярозцы, у храм не ўвайшла – ну канешне, куды ёй, закладной! Мілата не пусціць. Чакала, пакуль я выйду сам і без крыжа. Скардзілася на вас. Пра цябе казала, што прыйдзеш.
Янік дастаў з кішэні грэбень і працягнуў музейніку.
Міраслаў выцер кубак крысом і паставіў на месца. Потым ён адчыніў вялікую скрыню, што стаяла на падлозе. Скрыня амаль даверху была напоўненая грабянямі – жалезнымі, срэбнымі, меднымі. Музейнік паклаў русалчын грэбень у скрыню і закрыў яе.
Потым Міраслаў прайшоўся каля стэнда з крыжамі, уважліва разглядаючы іх, і, нарэшце, выняў з-пад шкла адзін – маленькі, на залатым ланцужку. Музейнік пакруціў яго ў руках, павярнуўся да хлопца і спытаўся:
– Ты мне скажы: будзеш яе берагчы? Бо нашто істоту ачалавечваць, калі яна нікому не патрэбная?
– Буду берагчы! – адказаў Янік.

Мирослав вытер чашу подолом и поставил её на место. Потом он открыл большой ящик, который стоял у алтаря. Ящик почти доверху был набит гребнями – железными, серебряными, медными. Музейник положил гребень в ящик и закрыл его.

Потом Мирослав прошёлся у стенда с крестами, внимательно рассматривая их, и, наконец, вынул из-под стекла один крестик – маленький, на золотой цепочке. Музейник покрутил его в руках, повернулся к парню и спросил:

– Ты мне скажи: будешь её беречь? Потому что зачем существо очеловечивать, если оно никому не нужно?

– Буду беречь! – сказал Яник.

– Как хочешь, чтобы её звали? Может, Марией?

– Можно и Марией. Красиво.

Священник улыбнулся:

– Вот и хорошо! Разучим тебя и её заниматься убийствами, научим дарить жизнь… а сына вашего первого окрестим Мирославом!

– Як хочаш, каб яе звалі? Можа, Марыяй?
– Можна і Марыяй. Прыгожа.
Святар усміхнуўся:
– Вось і добра! Развучым цябе і яе займацца забойствамі, навучым дарыць жыццё… А сына твайго першага ахрысцім Міраславам!

Дарья Вашкевич

Авторский перевод на белорусский язык

Дар'я Вашкевіч

Аўтарскі пераклад на беларускую мову

Дарья Вашкевич родилась в 1985 году. Окончила факультет международных отношений БГУ по специальности «Международное право». В 2012 году получила ступень магистра, окончив университет Варвика в Великобритании по специальности «Писательство» («Creative Writing»). Работает переводчиком-фрилансером.

Имеет шесть публикаций авторских произведений, а также шесть публикаций литературных переводов с английского, испанского, шведского языков на белорусский. Победитель семи литературных конкурсов, а также международного конкурса.

Дар'я Вашкевіч нарадзілася ў 1985 годзе. Скончыла факультэт міжнародных адносін БДУ па спецыяльнасці «Міжнароднае права». У 2012 годзе атрымала ступень магістра, скончыўшы ўніверсітэт Варвіка ў Вялікабрытаніі па спецыяльнасці «Пісьменніцтва» («Creative Writing»). Працуе перакладчыкам-фрылансерам.

Мае шэсць публікацый аўтарскіх твораў, а таксама шэсць публікацый літаратурных перакладаў з англійскай, іспанскай, шведскай моў на беларускую. Пераможца сямі літаратурных конкурсаў, а таксама міжнароднага конкурсу.

СОНЯ

Я увидела ее фотографию на Фейсбуке, в столбце «Люди, которых Вы, возможно, знаете». Я нажала на фото. Её профиль оказался публичным и рассказал мне о том, что ей двадцать девять и что живёт она в Мюнхене, замужем за неким Рихардом Штольманам. Я почему-то всегда предполагала, что Соня выйдет замуж позже всех наших общих знакомых – если вообще выйдет.

Я просмотрела её фотографии. Она перекрасилось в шатенку. Мне показалось, этот цвет не очень подходил к её глазам цвета крыжовника. Несмотря на цветовой диссонанс, Соня выглядела довольно счастливой – особенно на фото, где она стояла рядом с мужем на берегу какого-то озера.

Я не добавила Соню в друзья. Я решила написать ей письмо на е-мэйл (благо, Фейсбук щедро делился ее контактами):

«Дорогая Соня,

Кажется, прошла тысяча лет с того времени, когда мы виделись».

Нет, это просто какая-то Вирджиния Вульф.

«Здорово, Соня!

Не поверишь – только что нашла тебя на Фейсбуке!»

Чёрт, я же всё-таки не восторженный тинэйджер.

«Соня!

Мы с тобой так давно...»

Да ну!

СОНЯ

Я пабачыла яе фотаздымак на Фэйсбуку, у слупку «Людзі, якіх Вы, мажліва, ведаеце». Я націснула на фота. Яе профіль апынуўся публічным і распавёў мне аб тым, што ёй дваццаць дзевяць і што жыве яна ў Мюнхене, замужам за нейкім Рыхардам Штольманам. Я чамусьці заўжды меркавала, што Соня выйдзе замуж пазней за ўсіх нашых агульных знаёмых – калі ўвогуле выйдзе.
Я прагледзела яе фотаздымкі. Яна пафарбавалася ў шатэнку. Мне падалося, гэты колер не вельмі пасаваў да яе агрэставых вачэй. Нягледзячы на той каляровы дысананс, Соня выглядала даволі шчаслівай – асабліва на фотаздымку, які ўхапіў яе на беразе нейкага возера поруч з мужам.
Я не дадала Соню да сяброў. Я вырашыла напісаць ёй электронны ліст (бала-зе, Фэйсбук шчодра дзяліўся яе кантактамі):
«Дарагая Соня,
Здаецца, мінула тысяча год з таго часу, калі мы апошні раз бачыліся».
Не, гэта нейкая Вірджынія Вульф.
«Здароў, Соня!
Не паверыш – толькі што знайшла цябе на Фэйсбуку!»
Халера, але я ўсё-ткі не тынэйджэр.
«Соня!
Мы з табой так даўно...»
Ды ну!

Удалив черновик, я пошла разогревать полуфабрикаты.
Поужинав, полезла на антресоли в своей комнате. Они должны быть где-то там, я точно помнила. Раскидав вещи, я, наконец, нашла их в картонной коробке, оклеенной поблёклой зелёной бумагой. Я устроилась с ящиком на полу. Писем было много. Мы писали друг другу каждое лето, когда я уезжала к бабе с дедом в деревню. Письма были длинные и подробные – раньше писать их было так просто. Часто мы посылали друг другу свои рисунки. Соня была по-настоящему талантливой, она рисовала карандашами и красками абсолютно всё: пейзажи, натюрморты, людей, животных... Однажды она даже нарисовала с фотографией мой портрет – получилось похоже. Я же, насколько помню, перебивалась абстракциями. Соня говорила, что в них «чувствуется энергия», и увешивала ими свою комнату.
Перебирая Сонины письма, я вспомнила, как лет восемь назад сидела на песчаном берегу за тысячи водных километров от дома, а Атлантический океан лизал мои пятки. Я была двадцатилетней, немного пьяной, одинокой и счастливой. И внезапно мне захотелось позвонить Соне и рассказать ей, что я влюбилась, что именно там, на берегу Атлантики, я впервые в своей жизни увидела оранжевую и сочную, как грейпфрут, полную луну и что мне было жаль – и было жаль всегда… К тому времени мы уже окончательно потеряли друг друга, у меня не было её номера телефона. Да и имей я его, то вряд ли позвонила бы.

Выдаліўшы чарнавік, я пайшла разаграваць паўфабрыкатную піццу.
Павячэраўшы, я палезла на антрэсолі ў сваім пакоі. Яны павінны быць недзе там, я дакладна памятала. Перакуліўшы ўсе рэчы, я, нарэшце, знайшла іх у кардоннай скрынцы, абклеенай паблёклай зялёнай паперай. Я ўладкавалася са скрыняй на падлозе. Лістоў было багата. Мы пісалі адна адной кожнае лета, калі я выязджала да бабы з дзедам на вёску. Лісты былі доўгія і падрабязныя – раней пісаць іх было так проста. Часта мы дасылалі адна адной і свае малюнкі. Соня была сапраўды таленавітай, яна малявала алоўкамі і фарбамі абсалютна ўсё: пейзажы, нацюрморты, людзей, жывёл… Аднойчы яна нават намалявала з фотаздымка мой партрэт – атрымалася досыць падобна. Я ж, наколькі памятаю, перабівалася збольшага абстракцыямі. Соня казала, што ў іх «адчуваецца энергія» і абвешвала імі свой пакой.
Праглядаючы Соніны лісты, я ўзгадала, як гадоў восем таму сядзела на пясчаным беразе за тысячы водных кіламетраў ад дому, а Атлантычны акіян лізаў мае пяткі. Я была дваццацігадовай, крыху п'янай, самотнай і шчаслівай. І раптоўна мне захацелася патэлефанаваць Соні і распавесці ёй, што я закахалася, што менавіта там, на беразе Атлантыкі, я ўпершыню ў сваім жыцці пабачыла аранжавую і сакавітую, як грэйпфрут, поўню і што мне было шкада – і было шкада заўжды... На той час мы ўжо канчаткова згубілі кантакт, і я не мела яе нумара тэлефона. Дый нават калі б я яго мела, то наўрад ці патэлефанавала б.

***

Это было мое первое хоровое занятие в музыкальной школе, и я была сильно взволнована. Ожидая начала урока, я крутилась на месте, оглядывая своих свеже-розовых, аккуратно причёсанных одногруппников и точила карандаши. Когда все три карандаша сделались острыми, словно иглы, я чуть подалась вперёд и дёрнула за косичку девочку, которая сидела передо мной. Она обернулась: молочно-бледное лицо, рыжие кудряшки, которые непослушно выбивались из-за ушей, зелёные глаза и брови, изогнутые таким образом, будто девочка была удивлена (она, безусловно, была на тот момент, однако, как я узнала позже, выражение лёгкого удивления никогда не покидало её лица). Уголки её губ слегка дрожали, и я подумала, что девочка вот-вот заплачет. Вместо этого она нахмурилась и сердито прошипела: «Я всё расскажу своему старшему брату, и он тебя побьёт!» Я показала наглой девчонке язык. Она потянулась и ущипнула меня за руку – я пискнула. Преподаватель хорового пения, седой поляк-еврей господин Грабовский, поднял голову над блокнотом, в котором что-то чертил, меланхолически на нас посмотрел и сказал: «Вы. Успокойтесь…» – и вернулся к своему блокноту.

Мы успокоились. Но мне удалось тихонько подуть в волосы девочки. Она нервно встрепенулась, но не обернулась. Победа осталась за мной.

Через два дня, перед очередным хоровым занятием, щипательница поделилась со мной своим бутербродом.

– Он с сыром и огурцом, – деловито сказала она.

Потом она улыбнулась и добавила:

***

Гэта быў мой першы харавы занятак у музычнай школе, і я была з гэтае нагоды дужа ўсхваляваная. Чакаючы пачатак урока, я круцілася на месцы, аглядала сваіх свежа-ружовых, акуратна прычасаных аднагрупнікаў і вастрыла алоўкі. Калі ўсе тры алоўкі зрабіліся вострымі, нібы голкі, я крыху падалася наперад і тарганула за коску дзяўчынку, што сядзела перада мной. Яна абярнулася: малочна-бледнае аблічча, рудыя кудзеркі, якія непаслухмяна выбіваліся з-за вушэй, зялёныя вочы і бровы, выгнутыя такім чынам, быццам дзяўчынка была здзіўленая (яна, безумоўна, была на той момант; аднак, як я дазналася пазней, выраз лёгкага здзіўлення ніколі не пакідаў яе твар). Куткі яе вуснаў крыху дрыжэлі, і я падумала, што дзяўчо зараз заплача. Замест гэтага яна нахмурылася і злосна прасычэла: «Я ўсё раскажу свайму старэйшаму брату, і ён цябе паб'е!» Я паказала нахабнай дзеўцы язык. Яна пацягнулася і ўшчыкнула мяне за руку – я піскнула. Выкладчык харавых спеваў, сівы паляк-габрэй спадар Грабоўскі, узняў галаву над нататнікам, у якім нешта крэмзаў, меланхалічна на нас паглядзеў і мовіў: «Вы. Супакойцеся...» – і вярнуўся да свайго нататніка. Мы супакоіліся. Але мне ўдалося ціхенька ззаду падзьмуць у валасы дзяўчынкі. Яна нервова схамянулася, але не абярнулася. Перамога засталася за мной.

Праз два дні, перад чарговым харавым заняткам, дзяўчынка-ўшчыкальніца падзялілася са мной сваім лусцікам.

– Ён з сырам і гурком, – дзелавіта сказала яна.

Потым яна ўсміхнулася і дадала:

– Маё імя Соня Федарук. І я не скардзілася на цябе свайму брату, не бойся!

– Моё имя Соня Федорук. И я не жаловалась на тебя своему брату, не бойся!
– Я и не боюсь, – соврала я и взяла кусок бутерброда.
В тот день, после занятий, мы пошли в кафетерий за мороженым. Выяснилось, что нам обеим было по восемь лет и в музыкальной школе у нас одна специализация – фортепиано (что было неплохо – по крайней мере намного лучше, чем какая-нибудь крикливая скрипка). Соне, как и мне, нравятся собаки, но родители не разрешают заводить в доме животных. Мы обе ненавидели кабачки, а среди диснеевских мультфильмов больше всего любили «Русалочку».
Однажды я пришла к Соне в гости. Дверь открыл высокий парень. У него были зелёные глаза и курчавые волосы – точно как у Сони. Он был невероятно прекрасен, с моей точки зрения.
– Здорово, – сказал он. – Ты, видно, Вероника, подруга Сони. Я Адам, её брат, – он протянул мне руку.
Я уставилась на неё и пробубнила:
– Я не мальчик, только парни пожимают друг другу руки!
Адам улыбнулся, а потом внезапно наклонился, взял мою руку в свою и галантно поцеловал.
Я моментально налилась свекольным румянцем, выдернула руку из его пальцев и бросилась в комнату к Соне. Прикрыв за собой дверь, я слышала, как Адам заливисто смеётся.
Мы с Соней начали ходить друг к другу всё чаще. Мне нравились её дружелюбные родители, и постепенно, когда моя первая неловкость потихоньку прошла, я начала общаться и с Адамом. Иногда, когда был в хоро-

– Я і не баюся, – схлусіла я і ўзяла кавалак лусціка.

У той дзень, пасля занятку, мы пайшлі ў кафетэрый па марозіва. Высветлілася, што нам абедзвюм было восем год і ў музычнай школе ў нас адна спецыялізацыя – фартэпіяна (што было няблага – прынамсі, штокроць лепш, чым якая-небудзь крыклівая скрыпка). Соні, як і мне, падабаліся сабакі, але бацькі не дазвалялі заводзіць у хаце жывёл. Мы абедзве ненавідзелі кабачкі, а сярод дыснееўскіх мультфільмаў больш за ўсё любілі «Русалачку».

Аднойчы я прыйшла да Соні ў госці. Дзверы адчыніў высокі хлапец. У яго былі зялёныя вочы і кучаравыя валасы – акурат як у Соні. Ён быў неверагодна прыгожы, з майго пункту гледжання.

– Здароў! – сказаў ён. – Ты, відаць, Вераніка, сяброўка Соні. Я Адам, яе брат, – ён працягнуў мне сваю руку.

Я ўтаропілася ў яе і прабубнела:

– Я не хлопчык, толькі хлопцы паціскаюць адзін аднаму рукі!

Адам усміхнуўся, а потым раптоўна нахіліўся, узяў маю руку ў сваю і галантна пацалаваў яе.

Я ўмомант налілася чырванню, не раўнуючы той бурачок, выдрала сваю руку з Адамавай рукі і кінулася ў пакой да Соні. Прычыніўшы за сабою дзверы, я чула, як Адам заліваецца рогатам.

Мы з Соняй пачалі наведваць адна адну ўсё часцей. Мне падабаліся яе прыязныя бацькі, і паступова, калі мая першая збянтэжанасць паціху паблякла, я наладзіла добрыя стасункі і з Адамам. Часам, калі быў у гуморы, ён нават гуляў з намі. Нас з Соняй асабліва торкала, калі ён бегаў за намі ў вобразе Фрэдзі

шем настроении, он даже играл с нами. Нам с Соней особенно нравилось, как он бегал за нами в образе Фрэдди Кругэра. (У Адама был точно такой же, как у Фрэдди, полосатый свитер, который прекрасно сочетался с чёрной шляпой Сониного отца.) Если ему удавалось поймать меня или Соню, он зловеще смеялся и начинал нас щекотать. Мы пищали от радости.
В середине ноября я заболела. Мне было невыносимо скучно сидеть одной дома, но Соня нашла выход из ситуации: мы стали звонить друг другу и вслух читать отрывки из наших любимых книг. Мы могли часами листать страницы «Хроник Нарнии», «Алисы в стране чудес», «Пеппи Длинныйчулок...». Потеха кончилась, когда наши родители получили в конце месяца счета за телефонные разговоры. Нам запретили пользоваться телефоном до Нового года.

***

Я сняла с полки свой старый фотоальбом. Я не могла сдержать улыбки, когда его просматривала. Там было много фотографий меня с Соней: в хоровом классе, в её комнате, в моей кухне... На всех фотографиях Соня улыбалась. Её улыбка напоминала бабочку – она была такой же невесомой, нежной, трепетной и прозрачной. Я всегда немного завидовала улыбке подруги, так как была уверена, что Соня может очаровать любого мужчину планеты, просто улыбнувшись ему.
Когда Соне исполнилось четырнадцать, она впервые влюбилась. Это нас ещё больше сблизило, потому что я играла роль её исповедницы. Если честно, иногда мне надоедало по семь раз на дню выслушивать истории о

Кругэра. (Адам меў акурат такі ж, як у Фрэдзі, перапялясы світар, які цудоўна спалучаўся з чорным капелюшом Сонінага бацькі.) Калі яму ўдавалася спаймаць мяне ці Соню, ён злавесна смяяўся і пачынаў нас казытаць. Мы пішчэлі ад радасці.

У сярэдзіне лістапада я захварэла. Мне было невыносна нудна сядзець адной дома, але Соня знайшла выхад з сітуацыі: мы пачалі тэлефанаваць адна адной і ўголас чытаць урыўкі з нашых улюбёных кніг. Мы маглі гадзінамі гартаць старонкі «Хронікаў Нарніі», «Алісы ў краіне цудаў», «Піпі Доўгайпанчохі…». Пацеха скончылася, калі нашыя бацькі атрымалі прыканцы месяца рахункі за тэлефонныя размовы. Нам забаранілі карыстацца тэлефонам да Новага года.

***

Я зняла з паліцы свой стары фотаальбом. Мяне абсыпала сотняй усмешак, калі я яго праглядала. Там было шмат фотаздымкаў мяне з Соняй: у харавым класе, у яе пакоі, у маёй кухні… На ўсіх фотаздымках Соня ўсміхалася. Яе ўсмешка нагадвала матылька – яна была гэткай жа бязважкай, далікатнай, трапяткой і празрыстай. Я заўжды крыху зайздросціла ўсмешцы сяброўкі, бо была ўпэўненая, што Соня можа ачмурыць любога мужчыну планеты, проста ўсміхнуўшыся яму.

Калі Соні споўнілася чатырнаццаць, яна ўпершыню закахалася. Гэта нас яшчэ больш зблізіла, таму што я іграла ролю яе спавядальніцы. Па-шчырасці, часам мне надакучвала па сем разоў выслухваць гісторыі пра тое, як Соня сустрэлася позіркам з Уладзем, а ён міргнуў; ці пра тое, як, уся напамаджаная,

том, как Соня встретилась взглядом с Владиком, а он моргнул; или о том, как, вся напомаженная, Соня явилась в школу, а Влад не обращал на неё внимания и проводил время с Мариной, и Соня, чувствуя себя совершенно покинутой, плакала, плакала, плакала в нечистой школьной уборной, мешая коктейль из слёз и дешёвой туши. Но я никогда не говорила, что мне надоели истории подруги. Я сочувственно её выслушивала и утешительно кивала.

Я же, в свою очередь, была тайно влюблена в брата Сони. Было две основные причины того, почему я ничего не говорила об этом Соне. Я знала, что Соня очень ревниво относится к Адаму, и не хотела ставить под угрозу нашу с ней дружбу. Да и вообще, я не была уверена, что то, что я чувствую по отношению к Адаму, можно назвать любовью. На тот момент Адам уже уехал учиться в другой город, и я его видела несколько раз в год, когда он приезжал домой на каникулы. Я точно знала только то, что он изучает политологию и у него самые красивые глаза в нашей скучной Вселенной. По всем остальным параметрам мы с Адамом были почти незнакомцы, и я подозревала, что влюбиться в незнакомца – это как-то... несерьёзно. В общем, я в то время читала экзистенциалистов, может, именно из-за этого я сомневалась практически во всём. Во всём, кроме моей дружбы с Соней.

***

Я достала несколько DVD, на которые со старых, крошечных видеокассет были скопированы записи концертов, проводимых в нашей музыкальной школе в конце каждого учебного года. Я просмотрела мои и Сонины вы-

Соня з'яўлялася ў школу, а Уладзь на гэта не зважаў і бавіў час з Марынай, і Соня, адчуваючы сябе цалкам пакінутай, плакала, плакала, плакала ў нячыстай школьнай прыбіральні, мяшаючы кактэйль са слёз і таннай тушы. Аднак я ніколі не казала, што мне надакучылі гісторыі сяброўкі. Я спагадліва яе выслухоўвала і суцяшальна ківала.

Я ж, у сваю чаргу, была таемна закаханая ў Сонінага брата. Было дзве асноўныя прычыны таго, чаму я нічога не казала пра гэта Соні. Я ведала, што Соня вельмі раўніва ставіцца да Адама, і не хацела ставіць пад пагрозу нашае з ёй сяброўства. Дый увогуле, я не была ўпэўнена, што тое пачуццё, якое я маю да Адама, ёсць менавіта каханне. На той момант Адам ужо быў паехаў вучыцца ў іншы горад, і я яго бачыла некалькі разоў на год, калі ён прыязджаў дадому на канікулы. Я дакладна ведала толькі тое, што ён вывучае паліталогію і мае найпрыгажэйшыя вочы ў нашым малым, сумным Сусвеце. Па ўсіх астатніх параметрах мы з Адамам былі амаль незнаёмцы, і я падазравала, што закахацца ў незнаёмца – гэта неяк... несур'ёзна. Увогуле, я ў той час чытала шмат экзістэнцыялістаў, можа, менавіта з-за гэтага я сумнявалася практычна ва ўсім. Ва ўсім, апроч майго сяброўства з Соняй.

***

Я дастала некалькі DVD, на якія са старых, нягеглых відэакасет былі скапіяваны запісы канцэртаў, што ладзіліся ў нашай музычнай школе прыканцы кожнага навучальнага года. Я прагледзела мае і Соніны выступы за ўсе сем год. Было відавочна, што калі ў раннія гады свайго навучання я была цалкам рас-

ступления за все семь лет. Было очевидно, что если в ранние годы своего обучения я была полностью расслабленна и получала от выступлений удовольствие, то в последние два-три года я начала больше нервничать и напрягаться. Даже видео, на котором я играла сонату Моцарта на летнем концерте в конце пятого класса, вздрагивало и снежило, словно ему передалось моё волнение. Помню, перед тем концертом я жаловалась Соне, что родители, видимо, отдали меня в «музыкалку», чтобы я познала все страдания жизни. Как выяснилось, со временем, страдания жизни выглядели не совсем так.

С Соней всё было наоборот. Она выглядела застенчивой и испуганной во время своих первых выступлений, но с течением времени её уверенность росла. В шестом классе мы играли с Соней дуэт – польку Рахманинова. Пока во время поклона я судорожно вытирала лоб платком (незаметно, как мне тогда казалось), Соня раскланивалась на все четыре стороны, сияя от удовольствия. Она даже успела помахать в камеру.

Потом я вспомнила наш финальный экзамен в музыкальной школе. Я безумно волновалась, с утра пила валерианку. Родители твердили: «Всё будет хорошо, брось!» Кто-нибудь когда-нибудь переставал волноваться из-за этой фразы?

Я приехала за сорок минут до назначенного мне времени выступления. Мои руки были мокрые от пота, а сердце надрывалось где-то в левой пятке. Я поискала Соню, чьё выступление должно было состояться через пятнадцать минут после моего. Её нигде не было видно, что меня мало удивило, так как она обычно прилетала в школу за три минуты до выхода на сцену.

слабленая і атрымлівала ад выступаў асалоду, то апошнія два-тры гады я пачала больш нерваваццa і напружваццa. Нават відэа, на якім я іграла санату Моцарта на летнім канцэрце прыканцы пятага класа, уздрыгвала і сняжыла, быццам яму перадалося маё хваляванне. Памятаю, перад тым канцэртам я скардзілася Соні, што бацькі, відаць, аддалі мяне ў «музыкалку», каб я спазнала пакуты жыцця. Як высветлілася з цягам часу, пакуты жыцця выглядалі не зусім так.

З Соняй усё было наадварот. Яна выглядала сарамлівай і напужанай падчас сваіх першых выступаў, але з цягам часу яе ўпэўненасць расла. У шостым класе мы ігралі з Соняй дуэт – польку Рахманінава. Пакуль падчас паклону я сутаргава выціралa лоб насоўкай (непрыкметна, як мне тады падавалася), Соня раскланьвалася на ўсе чатыры бакі свету, ззяючы ад задавальнення. Яна нават паспела памахаць у камеру.

Потым я ўзгадала наш фінальны іспыт у музычнай школе. Я шалёна хвалявалася і зрання піла валяр'янку. Бацькі паўтаралі: «Усё будзе добра, кінь хвалявацца!» Хто-небудзь калі-небудзь кідаў хвалявацца пасля гэтае фразы?

Я прыехала за сорак хвілін да прызначанага мне часу выступу. Мае рукі былі мокрыя ад поту, а сэрца наддзіралася недзе ў левай пятцы. Я пашукала Соню, чый выступ мусіў адбыцца праз пятнаццаць хвілін пасля майго. Яе нідзе не было відаць, што мяне мала здзівіла, бо яна зазвычай прылятала ў школу за тры хвіліны да выхаду на сцэну.

Знайшоўшы пустую аўдыторыю, я пачала паўтараць сваю экзаменацыйную праграму. Пальцы сасклізгвалі з клавішаў, тэмп кульгаў, мелодыя ламалася. У сярэдзіне чортавага эцюда Ліста я раптам забыла ноты. Я ў роспачы ўдарыла

Найдя пустую аудиторию, я начала повторять свою экзаменационную программу. Пальцы соскальзывали с клавиш, темп хромал, мелодия ломалась. В середине чёртова этюда Листа я вдруг забыла ноты. Я в отчаянии ударила по клавиатуре и разревелась. Когда я выплакалась, мне стало на удивление легко. Возможно, я просто исчерпала лимит волнения или наконец начала действовать валериана... Но я совершенно успокоилась. Когда я взошла на сцену, кончики моих пальцев всё ещё горели, но голова была ледяная и сосредоточенная.

Я была ещё немного окаменевшая после выступления, когда из концертного зала выглянула моя учительница и объявила, что я получила «пятёрку». По телу начала расползаться эйфория: я чувствовала, как она отдается в пальцах ног.

Я села на подоконник в холле, ожидая, когда освободится Соня.

В четыре вечера последний ученик отыграл экзаменационную программу. Сони нигде не было. Я не имела представления, что случилось с подругой. Может, она опоздала на экзамен? Или поменялась с кем-то местами и сдала его раньше? Но почему мне ничего не сказала? Я была уставшая, голодная и раздражённая долгим ожиданием. Когда я уже направлялась к выходу, я увидела Сонину преподавательницу музыки. Подбежав к ней, я сказала:

– Добрый день! Я Вероника, подруга Сони Федорук. Скажите, она сдавала сегодня экзамен? Я не могу её найти. Преподавательница чуть побледнела и, не глядя мне в глаза, пробормотала:

– Сони не было. Извини, я спешу.

После этого её и след простыл. Среди преподавателей нашей «музыкалки» было немало чудаков.

па клавіятуры і разраўлася. Калі я выплакалася, мне зрабілася на дзіва лёгка. Магчыма, я проста вычарпала ліміт свайго хвалявання ці ўрэшце пачала дзейнічаць валяр'янка… Але я цалкам супакоілася. Калі я ўзышла на сцэну, кончыкі маіх пальцаў усё яшчэ гарэлі, але галава была лядова-сканцэнтраванай.

Я была яшчэ крыху анямелай пасля выступу, калі з канцэртнай залы вызірнула мая настаўніца і абвясціла, што я атрымала «пяцёрку». Па целе пачала распаўзацца эйфарыя: я адчувала, як яна паколвае пальцы маіх ног.

Я села на падваконне ў холе, чакаючы, калі вызваліцца Соня.

А чацвёртай увечары апошні вучань адыграў сваю экзаменацыйную праграму. Соні нідзе не было. Я не мела ўяўлення, што здарылася з сяброўкай. Мо яна спазнілася на іспыт? Ці памянялася з некім месцамі і здала яго раней? Але чаму яна мне нічога не сказала? Я была стомленая, галодная і раздражнёная доўгім чаканнем. Калі я ўжо накіроўвалася да выхаду, я пабачыла Соніну выкладчыцу музыкі. Падбегшы да яе, я мовіла:

– Дзень добры! Я Вераніка, сяброўка Соні Федарук. Скажыце, ці яна здавала сёння іспыт? Я не магу яе знайсці.

Выкладчыца крыху збялела і, не гледзячы мне ў вочы, прамармытала:

– Соні не было. Выбачай, я спяшаюся.

Пасля гэтага яе і след прастыў. Сярод выкладчыкаў нашай «музыкалкі» было нямала дзівакоў.

***

Мои родители были уже дома, когда я вернулась из школы. Я щедро одаривала их рассказами про экзамен, о том, как я нервничала, повторяя программу перед экзаменом (о том, что я плакала, я не вспомнила), и как мне удалось наконец сосредоточиться. Я рассказала, как здорово я сыграла все произведения, не споткнувшись ни разочка, и как грациозно поклонилась, и как гордилась мной моя учительница...

– Но самое удивительное, что Соня не явилась на экзамен. Я её не видела в школе и пыталась поговорить с её преподавателем, но... Кстати, вот теперь ей и позвоню, – подскочила я из-за стола с набитым ртом.

– Нет! Сначала даешь! – прикрикнула мать.

– Ма-а-ам, я уже наелась и...

– Я сказала, даешь свой ужин, – сказала мать, и на её щеках выступили алые пятна.

Отец уставился в свою тарелку. Я снова села и беззвучно положила на стол вилку. С минуту покатав по тарелке кусок мяса, мать поднялась, вышла из кухни и вернулась с газетой. Отдав её мне, она села и каким-то незнакомым голосом произнесла:

– Мне очень жаль.

Отец продолжал изучать свою тарелку.

Я взглянула на газету. Это был «Минск Экспресс». Заголовок на первой странице сообщал: «21-летний лидер группировки “Чистые” убит в своём доме».

Я ещё раз посмотрела на родителей и начала читать:

***

Мае бацькі былі ўжо дома, калі я вярнулася са школы. Я шчодра адорвала іх расповедамі пра іспыт, пра тое, як я нервавалася, паўтараючы праграму перад іспытам (пра тое, што я плакала, я не ўзгадала), і як мне ўдалося ўрэшце засяродзіцца. Я расказала, як выдатна я адыграла ўсе творы, не спатыкнуўшыся ані разочку, і як грацыёзна пакланілася, і як ганарылася мною мая настаўніца…

– Але самае дзіўнае, што Соня не з'явілася на іспыт. Я яе не бачыла ў школе і спрабавала паразмаўляць з яе выкладчыцай, але… Дарэчы, вось зараз ёй і патэлефаную! – падскочыла я з-за стала з набітым ротам.

– Не! Спачатку даеш! – прыкрыкнула маці.

– Ма-а-ам, я ўжо наелася і…

– Я сказала, даеш сваю вячэру! – мовіла маці, і на яе шчоках выступілі чырвоныя плямы.

Бацька ўтаропіўся ў сваю талерчыну. Я зноў села і бязгучна паклала на стол свой відэлец. З хвіліну пакатаўшы па талерцы кавалак мяса, маці паднялася, выйшла з кухні і вярнулася з газетай. Падаўшы яе мне, яна села і нейкім незнаёмым голасам сказала:

– Мне вельмі шкада.

Бацька працягваў вывучаць сваю талерчыну.

Я зірнула на газету. Гэта быў «Мінск Экспрэс». Загаловак на першай старонцы паведамляў: «21-гадовы лідар групоўкі "Чыстыя" забіты ў сваім доме».

Я яшчэ раз паглядзела на бацькоў і пачала чытаць:

«Сегодня в 11.32 Адам Федорук, лидер экстремистской группировки ‘‘Чистые’’, был найден мёртвым в подъезде своего дома. Смерть была вызвана четырьмя ударами ножом в сердце.
Татьяна Линькевич, девушка Адама Федорука, вместе с которой он снимал квартиру, сообщила следствию, что примерно в 10.15 к ним в дверь позвонили, г. Федорук открыл и разговаривал с кем-то около пяти минут. После этого он покинул квартиру. Г-жа Линькевич подумала, что г. Федорук спустился в кафетерий ‘‘Ветка’’, расположенный на первом этаже их дома, за кофе. Когда прошло больше часа, г-жа Линькевич решила спуститься в кафетерий, чтобы поискать г. Федорука. Она нашла его тело на лестничной площадке рядом с лифтом.
На данный момент следствие полагает, что Адам Федорук был убит кем-то из членов группировки ‘‘Чистые’’: в последнее время внутри группировки развивался конфликт, касающийся...»
Не переворачивая страницы, я поднялась из-за стола, направилась в свою комнату и легла в постель. Я не могла плакать: что-то твёрдое, липкое и холодное в моей груди заблокировала выход слезам.
Когда я проснулась в двенадцать на следующий день, на тумбочке рядом с кроватью стояла тарелка с бутербродами и чашка остывшего чаю. Ни к чему не прикоснувшись, я снова заснула.

***

Я позвонила Соне через два дня. Я хотела сказать ей, что знаю, как она чувствует себя, что мне очень жаль и что как только я ей понадоблюсь ...

«Сёння а 11.32 Адам Федарук, лідар экстрэмісцкай групоўкі “Чыстыя”, быў знойдзены мёртвым у пад’ездзе свайго дома. Смерць была выкліканая чатырма ўдарамі нажом у сэрца.

Таццяна Лінькевіч, дзяўчына Адама Федарука, разам з якой ён здымаў кватэру, паведаміла следству, што прыкладна а 10.15 ім у дзверы пазванілі, сп. Федарук адчыніў і размаўляў з нейкім каля пяці хвілін. Пасля гэтага ён пакінуў кватэру. Сп-ня Лінькевіч падумала, што сп. Федарук спусціўся ў кафетэрый “Ветка”, што месціцца на першым паверсе іхняга дома, па каву. Калі мінула больш за гадзіну, сп-ня Лінькевіч вырашыла спусціцца ў кафетэрый, каб пашукаць сп. Федарука. Яна знайшла яго цела на лесвічнай пляцоўцы побач з ліфтам.

На дадзены момант тэорыя следства палягае на тым, што Адам Федарук быў забіты некім з сяброў групоўкі “Чыстыя”: апошнім часам унутры групоўкі развіваўся канфлікт, датычны…»

Не перагортваючы старонкі, я ўзнялася з-за стала, рушыла ў свой пакой і легла ў ложак. Я не магла плакаць: нешта цвёрдае, ліпкае і халоднае ў маіх грудзях заблякавала выхад слязам.

Калі я прачнулася а дванаццатай наступным днём, на тумбачцы побач з ложкам стаяла талерка з лусцікам і кубак прастылай гарбаты. Ні да чога не дакрануўшыся, я зноўку заснула.

***

Я патэлефанавала Соні праз два дні. Я хацела сказаць ёй, што ведаю, як яна пачувае, што мне вельмі шкада і што як толькі я ёй спатрэблюся… Калі ж Соня

Когда же Соня подняла трубку, все нужные слова застряли в моём животе. Я сглотнула и пробормотала:
– Привет! Хочешь... встретимся сегодня?
– Нет, – чуть слышно прошептала подруга.
– Слушай, Соня...
– Мне надо идти, – быстро сказала она и повесила трубку.
В какое бы время я ни звонила ей в течение следующей недели, никто не отвечал. Потом я уехала в деревню к бабе с дедом. Я писала Соне каждую субботу: «Привет! Как дела? Что планируешь делать в августе? Ты видела новый фильм?..»
Ответов не приходило.
Вернувшись с летних каникул, снова атаковала домашний телефон. Никто по-прежнему не снимал трубку. В феврале я получила открытку: «С Днем рождения тебя, Ника! Надеюсь, у тебя всё хорошо. Я нормально, хотя школа здесь – говно. Зато не так холодно. Обнимаю! С.».
Обратный адрес не был указан.
В течение нескольких следующих лет Соня присылала мне открытки – краткие, без картинок, без обратного адреса. Я не помню точно, когда открытки перестали приходить. На то время образ Сони в моей голове стал неопределённым, хотя её фотография продолжала стоять на пианино.

***

Я вошла в Фейсбук и снова отыскала Сонин профиль. Я была решительно настроена ей написать: сообщение на Фейсбуке – это же совсем просто,

падняла слухаўку, усе патрэбныя словы захраслі ў маім жываце. Я зглынула і прамармытала:
– Прывітанне! Хочаш… сустрэнемся сёння?
– Не, – хіба не прашаптала сяброўка.
– Слухай, Соня…
– Мне трэба ісці, – хутка мовіла яна і павесіла слухаўку.
У які б час я ні тэлефанавала ёй цягам наступнага тыдня, ніхто не адказваў. Потым я з'ехала на вёску да бабы з дзедам. Я пісала Соні штосуботу: «Прывітанне! Як справы? Што плануеш рабіць у жніўні? Ты бачыла новы фільм?..» Адказаў не прыходзіла.
Вярнуўшыся з летніх канікулаў, я зноўку атакавала Сонін хатні тэлефон. Ніхто па-ранейшаму не здымаў слухаўку.
У лютым я атрымала паштоўку: «З Народзінамі цябе, Ніка! Спадзяюся, у цябе ўсё добра. Я нармалёва, хоць школа тут – гаўно. Затое не так халодна. Абдымаю! С.». Зваротнага адраса не было пазначана.
Цягам наступных некалькіх год Соня дасылала мне паштоўкі – сціслыя, без малюнкаў, без зваротнага адраса. Я не памятаю дакладна, калі паштоўкі перасталі прыходзіць. На той час вобраз Соні ў маёй галаве размыўся, хоць яе фотаздымак працягваў стаяць на маім піяніна.

***

Я ўвайшла ў Фэйсбук і зноў адшукала Сонін профіль. Я была рашуча настроена ёй напісаць – паведамленне на Фэйсбуку гэта ж зусім проста, праўда? Про-

правда? Просто спросить, как она, чем занимается, по-прежнему ли играет на пианино – может, вальсы Шопена для своего мужа в субботний вечер?..
«Здравствуйте, Соня! – начала печатать я. – Как дела?»
На минуту замерев, мои пальцы вдруг с какой-то отчаянной яростью обрушились на клавиши: «Почему ты перестала мне писать? Почему ты взяла и просто так меня бросила? Почему ты отказывалась поговорить об Адаме! Ты не одна тогда переживала боль, ты...»
Краем глаза я увидела открытый фотоальбом, который по-прежнему лежал на столе. Я отвела глаза от компьютерного экрана. На фотографии одиннадцатилетняя Соня прижимала к себе мою любимую плюшевую кошку и улыбалась своей полуулыбкой, полубабочкой. Я вспомнила, как сидела на песчаном берегу за тысячи водных километров от дома, а Атлантический океан лизал мои пятки.
Я стёрла своё сообщение и выключила компьютер.

ста запытаць, як яна маецца, чым займаецца ці па-ранейшаму іграе на піяніна – можа, вальсы Шапэна для свайго мужа суботнімі вечарамі?..
«Вітанні, Соня! – пачала друкаваць я. – Як справы?»
На хвіліну замершы, мае пальцы раптам з нейкай роспачнай лютасцю абрынуліся на клавіятуру: «Чаму ты перастала мне пісаць? Чаму ты ўзяла і проста так мяне кінула? Чаму ты адмаўлялася пагаварыць пра Адама?! Ты не адна тады перажывала боль, ты…»
Краем вока я ўбачыла фотаальбом, які, адкрыты, па-ранейшаму ляжаў на стале. Я адвяла вочы ад камп'ютарнага экрана. На фотаздымку адзінаццацігадовая Соня прыціскала да сябе маю любімую плюшавую котку і ўсміхалася сваёю паўусмешкаю, паўматыльком. Я ўзгадала, як сядзела на пясчаным беразе за тысячы водных кіламетраў ад дому, а Атлантычны акіян лізаў мае пяткі.
Я сцерла сваё паведамленне і выключыла камп'ютар.

Маргарита Латышкевич

Авторский перевод на русский язык

Маргарыта Латышкевіч

Аўтарскі пераклад на рускую мову

Маргарита Латышкевич – прозаик и поэт. Родилась 19 января 1989 года в г. Бресте. Окончила филфак и магистратуру БГУ (по специальности «Литературоведение»). Сейчас работает в университетской лаборатории фольклора, готовится поступать в аспирантуру.

В 2012 году вышла книга стихов «Пульс навальніц». Печаталась в журналах «Бярозка», «Маладосць», в еженедельнике «Літаратура і мастацтва», газете «Заря». Является лауреатом нескольких творческих конкурсов, в том числе – Литературного конкурса Минского городского отделения Союза писателей Беларуси, посвящённого 120-летию Максима Богдановича, Литературного конкурса молодых авторов Брестчины «Лунінская восень». В 2011 году стала лауреатом конкурса «Новая белорусская фантастика». Пишет на белорусском, русском, английском языках.

Маргарыта Латышкевіч – празаік і паэт. Нарадзілася 19 студзеня 1989 года ў г. Брэсце. Скончыла філфак і магістратуру БДУ (па спецыяльнасці «Літаратуразнаўства»). Зараз працуе ва ўніверсітэцкай лабараторыі фальклору, рыхтуецца паступаць у аспірантуру.

У 2012 годзе выйшла кніжка вершаў «Пульс навальніц». Друкавалася ў часопісах «Бярозка», «Маладосць», у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», газеце «Заря». З'яўляецца лаўрэатам шэрагу творчых конкурсаў, у тым ліку – Літаратурнага конкурсу Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечанага 120-годдзю Максіма Багдановіча, Літаратурнага конкурсу маладых аўтараў Берасцейшчыны «Лунінская восень». У 2011 годзе стала лаўрэатам конкурсу «Новая белорусская фантастика».

Піша на беларускай, рускай, англійскай мовах.

ТУМАННОСТЬ МЁРТВОЙ ГОЛОВЫ

Он говорит:

– Ты не волнуйся, Клёник.

Это он так меня называет – Клёник.

Он говорит:

– Всё будет хорошо. Правда.

И глаза у него такие честные, и такая уверенность в голосе, что мне только одно и остаётся – не верить ему ни на йоту.

– Нет, – говорю ему. – Не блажи, Гиз.

А он смеётся. На щеках прорезываются ямочки, и кажется, что этому здоровому лбу еле-еле годиков шесть сровнялось.

Но я легко не сдаюсь.

– Гиз, – говорю. – Ты ведь знаешь, что рядовую туманность Туманностью Мёртвой Головы не назовут. Нечисто там, Гиз.

Только у него на всё один ответ:

– Ты не волнуйся, Клёник.

Это я-то – Клёник. Я ворчу под нос на древнем языке, что достукаемся мы так в конце-то концов, что лучше б мне было летать на обычном транспортнике вторым пилотом, потому что, понимаете, и зарплата стандартная, и спокойно, и почёт с уважением. А ему – хоть бы хны: закинул ножищи на панель управления, руки за голову заложил и насвистывает себе.

– Клёник, – говорит и зевает. – Чаю сделаешь, а?

ТУМАННАСЦЬ МЁРТВАЙ ГАЛАВЫ

Ён кажа:
– Ты не хвалюйся, Клёнік.
Гэта ён так мяне кліча – Клёнік.
Ён кажа:
– Усё будзе добра. Праўда-праўда.
І вочы ў яго такія крыштальна ясныя, і такая цвёрдая ўпэўненасць у голасе, што мне толькі адно і застаецца – не верыць яму ані на дробачку.
– Не, – кажу яму. – Не блазнуй, Гіз.
А ён смяецца. На шчоках прарэзваюцца ямінкі, і здаецца, што гэтаму бамбізе ледзь-ледзь гадкоў шэсць споўнілася.
Ды я лёгка не здаюся.
– Гіз, – кажу. – Ты ж ведаеш: звычайную туманнасць Туманнасцю Мёртвай Галавы не назавуць. Благое месца, Гіз.
Толькі ў яго на ўсё адзін адказ:
– Ты не хвалюйся, Клёнік.
Гэта я – Клёнік. Я мармычу сабе пад нос на даўняй мове, што дастукаемся мы гэтак у рэшце рэшт, што лепей было б мне лётаць на звычайным транспартніку другім пілотам, таму што, разумееце ж самі, і зарплата стандартная, і спакойна, і пачэсна-паважліва. А яму словы – што гарохам аб сцяну: закінуў доўгія ногі на панэль кіравання, рукі за галаву заклаў ды пасвіствае сабе.

И как его прикажете выносить?

– Вы, – говорю ему, – вы, земляне, все чокнутые. И электрочайник у нас сломался. Третьего дня, между прочим.

– Не, – отвечает Гиз. – Нормальный землянин, Клёник, сидит в офисе перед сенсорным экраном и работает на благо родной планеты. Ну, или, скажем, на Луне водоросли разводит на океаферме.

Болтает он так, а сам усмехается. Вот и поди пойми, шутит это чучело двухметровое или правду-матку режет. Довелось мне читать как-то книжонку одного нашего учёного, так там как раз и написано было: никак нельзя понять существо, взращённое другой цивилизацией. Это уж точно. Никак не понять.

– А ты, значит, ненормальный?

Это я-то у него спрашиваю, чтобы, конечно, поддеть.

– И ещё какой, – Гиз только улыбается, он прямо-таки непрошибаемый. – Дай чайник, что ли. Починю.

– Иди ты, – говорю ему. – Не твоими же лапищами.

Пилот он, может, и хороший, но с бытовой техникой не дружит. Дотронется, бывает, только – а чайничку уже и хана. Этот вот, альдебаранский, у нас пятый.

– Ну и ладно, – хмыкает Гиз и снова насвистывает.

Я морщу лоб и соплю. Не знаю я, как чинить чайники. Я вообще-то дипломированный пилот межзвёздных перелётов В-класса, так что, простите, какого чёрта мне уметь чинить какие-то чайники?

А Гизу наплевать. Он вон вообще дремлет, дубина землянская. И не берёт его ничего. Когда везли с ним экспедицию каких-то учёных лбов с Эритеи,

– Клёнік, – кажа і пазяхае абыякава. – Гарбаты зробіш, га?
Ну, і як жа з ім мірна суіснаваць загадаеце?
– Вы, – кажу яму, – вы, зямляне, усё стукнутыя. І электрачайнік у нас зламаўся. Заўчора, між іншым.
– Не, – адказвае Гіз. – Нармальны зямлянін, Клёнік, сядзіць у офісе перад сэнсарным экранам і працуе на карысць роднай планеты. Ну, ці, скажам, на Месяцы водарасці вырошчвае на акіяферме.
Плявузгае ён так, а сам усміхаецца. І разумей, як хочаш, жартуе гэтае пудзіла двухметровае ці праўду-матку рэжа. Даводзілася мне неяк чытаць кніжэнцыю аднаго нашага навукоўца, дык там так і напісана было: аніяк не можна зразумець істоту, выхаваную іншай цывілізацыяй. То й дакладна. Аніяк не даперці.
– А ты, значыцца, ненармальны?
Гэта я ў яго й пытаю, каб, натуральна, дапячы.
– І яшчэ які, Клёнік, – Гіз адно ўсміхаецца, ён жа ўпрост непрабівальны. – Дай чайнік, ці што. Адрамантую.
– Пайшоў ты, – кажу яму. – Не тваімі ж лапішчамі.
Пілот ён, можа, і ніштаваты, але во з тэхнікай для побыту не сябруе. Дакранецца, бывае, толькі – а чайнічку ўжо й капец. Гэты вось, альдэбаранскі, у нас пяты.
– Ну й добра, – чмыхае сабе Гіз і зноў насвістае.
Я моршчу лоб ды саплю. Не ведаю я, як трэба рамантаваць чайнікі. Я, між іншым, дыпламаваны пілот міжзорных пералётаў В-класа, таму, прабачце, на якую халеру мне ўмець рамантаваць нейкія там дурныя чайнікі?

все животом страдали. Пока дошло, что это один из эритеевских гадов жутко ядовитый и от его яда, стало быть, резь в животе, рвота и галлюцинации, чуть жизни не лишились. Один Гиз и в ус не дул и даже эту клятую ящерицу сахаром с руки прикармливал.

– Клёник, – говорит Гиз. Он и не спит вовсе. – Ты брось этот чайник. Сейчас пояс астероидов будет.

Я соплю громче. Сам потащил нас в эту дурацкую туманность и командует ещё.

– Крупный астероид по левому борту, – бормочет Гиз. Он уж и усесться за штурвал как положено успел. – Обходной манёвр через три… два… один… У него даже голос другой, будто подменили. Если где Гиз и серьёзен, так это за штурвалом. И то – если астероидов вокруг немеряно.

– Обошли, – говорю я, боязливо косясь на радар. Но там чисто.

А теперь ещё туманность эта. У моих предков, конечно, обоняние атрофировалось, только вот чую я здесь неладное. И что это за заказ такой, спрашивается? Транспортных маршрутов здесь нет, потому как зона астероидоопасная. Только шваль всякая, небось, отирается.

– Гиз, – меня прямо-таки озаряет. – А если пираты… а?

– Подумаешь, – Гиз только хмыкает. Из пояса астероидов мы вышли, так что... Он снова закинул ноги на приборную панель. – Что с нас взять-то? Чайник твой сломанный? Или редкого синего сирианина для зоопарка?

Злой он всё-таки. Все они, земляне, такие. До того как их приняли в Галактическую федерацию, всё твердили, что хотят с другими планетами контакт установить. А когда приняли, да ссуды на развитие организовали,

А Гізу наплявaць. Ён унь і ўвогуле задрамаў, дубіна зямлянская. І не зачапіць яго ніяк. Калі везлі з ім экспедыцыю дужа вучоных ілбоў з Эрытэі, усе на жывот пакутавалі. Пакуль дадумкалі, што гэта адзін з эрытэеўскіх паўзуноў страшэнна атрутны і праз ягоную атруту, значыцца, і жывот рэжа, і рвота з галюцынацыямі пачынаецца, ледзь не перамерлі ўсе. Адзін Гіз і ў вус не дзьмуў ды яшчэ нават брыдоту хвастатую тую з далоні цукрам частаваў.

– Клёнік, – кажа Гіз. Ён і не спіць зусім. – Кінь ты гэты чайнік, далібог. Зараз пояс астэроідаў будзе.

Я саплю грамчэй. Сам пацягнуў нас у гэтую дурную туманнасць і камандуе яшчэ.

– Буйны астэроід па левым борце, – мармыча Гіз. Ён нават паспеў сесці за штурвалам так, як належыць. – Абыходны манеўр праз тры… два… адзін…

У яго нават голас іншы, быццам падмянілі. Калі Гіз і бывае сур'ёзны, дык гэта за штурвалам. І тое – калі астэроідаў безліч.

– Абышлі, – кажу я, с асцярогаю косячы вокам на радар. Але там чысцюсенька. А зараз яшчэ туманнасць гэта. У маіх продкаў, канешне, органы нюху атрафіраваліся, але неіснуючым гэтым сваім нюхам чую я тут штось нядобрае. І што гэта за замова такая, дазвольце спытаць? Транспартных маршрутаў тут нямашака, таму што зона астэроіданебяспечная. Адно дрэнь розная, нябось, аціраецца.

– Гіз, – мне наўпрост моташна ад здагадкі. – А калі піраты… а?

– І хай сабе, – Гіз толькі чмыхае. З пояса астэроідаў мы ўжо выйшлі, так што... Ён зноў закінуў ногі на прыборную панэль. – Што з нас узяць? Чайнік твой зламаны? Ці мо рэдкага сіняга сірыяніна для заапарка?

да кучу всяких там гуманистических конвенций подписали, сразу наплевать им стало на мир и дружбу в Галактике.
Я задыхаюсь от сострадания к себе и потихоньку ковыряю отвёрткой глупый чайник. Сколько он у нас пережил – это ж невообразимо. Вон и бок у него мятый, и крышка поцарапана. Старый, проверенный боевой товарищ, а не чайник это, вот что. Я потягиваю носом. Землянам на товарищей наплевать. Им вообще на всё наплевать.
– Автопилот включён, – говорит бортовой компьютер. Это Гиз соизволил сползти со своего кресла.
– Ты чего, Клёник? – он присаживается передо мной на корточки. – Новый чайник купим.
– Не хочу новый, – еле выдавливаю я. – Мне этот… потому что товарищ…
Гиз вскидывает брови. Я вытираю нос рукавом комбинезона.
– Товарищ, – усмехается Гиз и шарит в своей походной сумке. Огромная такая пятнистая сумка, вся в молниях и кармашках. Гиз говорит, что когда-то с ней на Эльбрус восходил, на Земле ещё. Я не знаю, что такое «Эльбрус», но каждый раз представляю себе что-то вроде огромного белого облака. И Гиз – лениво, не торопясь, со своей тяжеленной сумкой за плечами – идёт по этому облаку.
– Вот, – он показывает мне какой-то стальной завиток. – Это, Клёник, кипятильник обыкновенный. Вымирающий вид.
Я опасливо поглядываю на странную вещь. По-моему, эта штука совсем не живая.
– Чай-то будешь, Клёник? – кричит Гиз из кухонного отсека. Ему лень щёлкнуть кнопкой переговорного устройства.

Злы ён усё-ткі. Усе яны, зямляне, такія. Да таго як прынялі іх у Галактычную федэрацыю, усё бубнелі, што хочуць з іншымі планетамі кантакт усталяваць. А як прынялі іх, ды пазыкі на развіццё арганізавалі, ды кучу розных там гуманістычных канвенцый падпісалі, дык адразу наплываць ім стала на мір ды сяброўства ў Галактыцы.

Я захлынаюся ад востpай спагады да самога сябе і паціху калупаю адвёрткай дурны чайнік. Колькі ён у нас пражыў – гэта ж уявіць цяжка. Вунь і бок у яго мяты, і крышка падрапаная. Стары, праверaны баявы таварыш, а не чайнік гэта, во як. Я хлюпаю носам. Зямлянам на таварышаў наплываць. Ім увогуле на ўсё наплываць.

– Аўтапілот уключаны, – кажа бартавы камп'ютар. Гэта Гіз зрабіў ласку спаўзці з свайго фатэля.

– Ты чаго, Клёнік? – ён прысаджваецца поруч са мною на кукішкі. – Новы чайнік купім.

– Не хачу новы, – ледзьве выціскаю я. – Мне гэты… бо таварыш…

Гіз прыўздымае бровы. Я ўціраю нос рукавом камбінезона.

– Таварыш, – усміхаецца Гіз і корпаецца ў сваёй паходнай торбе. Велізарная такая расплямленая торба, уся ў маланках ды кішэньках. Гіз кажа, некалі з ёю на Эльбрус узыходзіў, на Зямлі яшчэ. Я не ведаю, што такое «Эльбрус», але кожнага разу ўяўляю сабе штось кшталту агромністага белага воблака. І Гіз – ленавата, нетаропка, з сваёю цяжкаю торбай за плячыма – ідзе па гэтым воблаку.

– Во, – ён паказвае мне сталёвы завіток. – Гэта, Клёнік, кіпяцільнік звычайны. Вымірае ўжо гэты від.

На моей родной планете правила хорошего тона детям прививают с детства. Потому-то на моей родной планете никто не пытается докричаться до собеседника через три перегородки. Я включаю переговорник и говорю мстительно:

– Ты орёшь, как зверь кулда-нку во время спаривания.

Гиз – там, на кухне, – хохочет. Судя по грохоту, обрушиваются полки.

В рубке появляется Гиз с двумя чашками коричневой бурды, которую он называет «чаем». Одну отдаёт мне и садится в своё кресло.

– Зверь кулда-нку, – шепчет он, улыбаясь, и отхлёбывает чай.

Я тоже отпиваю. Сначала мне непонятно было: какой смысл пить отвар из сухих листьев какой-то травы? А потом ничего, даже понравилось.

– Мёртвая Голова, – произносит Гиз, отставляя пустую чашку. Не знаю, как у него выходит пить настолько огненную жидкость. Я еле глоток сделать могу, а он залпом всю чашку выдул.

– Курс проложил-то? – спрашиваю я сварливо. Гиз кивает.

– Погляди, Клёник. Мёртвая Голова.

Я подхожу и, цепляясь за подлокотник его кресла, встаю на цыпочки. Никакой головы вокруг не видно, обычное содержимое рядовой туманности: звёзды поближе, звёзды подальше, скопления газа и пыли, мелкие астероиды и подозрительный – явно не натурального происхождения – космический мусор.

– Сам ты голова, – говорю я.

И неожиданно вижу её.

В центре, сверкающая, как ограненный камень с гор Арк-маранн, как светлое озерцо, возле которого я вырос, пульсирующая, как живое и трепетное сердце…

Я з недаверам гляджу на дзіўную пакручастую штуку. Па-мойму, дурная рэч зусім не жывая.

– Гарбату ж будзеш, Клёнік? – крычыць Гіз з кухоннага адсеку. Лянуецца шчоўкнуць гузікам перагаворніка.

На маёй роднай планеце правілы этыкету дзецям прывіваюць з маленства. Вось таму на маёй роднай планеце ніхто не спрабуе дакрычацца да субяседніка праз тры перагародкі. Я ўключаю перагаворнік і помсліва кажу:

– Ты равеш, быццам звер кулда-нку падчас спарвання.

Гіх – там, на кухні, – рагоча. Чуваць, як з грукатам абрушваюцца паліцы.

У рубцы з'яўляецца Гіз з двума кубкамі карычневай бурды, якую ён заве «гарбатай». Адзін кубачак аддае мне і сядае ў свай фатэль.

– Звер кулда-нку, – шэпча ён, усміхаючыся, і сёрбае гарбату.

Я таксама адпіваю. Спачатку мне няўцям было: у чым сэнс піць адвар з сухога лісця нейкай травы? А пасля нішто так, нават спадабалася.

– Мёртвая Галава, – вымаўляе Гіз, адстаўляючы пусты кубак. Не ведаю, як ён здольны піць настолькі вогненную вадкасць. Сам я ледзь глытнуць магу, а ён залпам увесь кубак выдуў.

– Курс хаця б праклаў? – пытаюся я сварліва. Гіз ківае.

– Паглядзі, Клёнік. Мёртвая Галава.

Я падыходжу і, чапляючыся за падлакотнік яго фатэля, устаю на дыбачкі. Аніякай галавы вакол не відаць, звычайнае напаўненне шараговай туманнасці: зоры бліжэй, зоры далей, скопішчы газу і пылу, дробныя астэроіды і падазронае – яўна не натуральнага паходжання – касмічнае смецце.

– Звезда? – удивляюсь я.

В стороны от искрящегося фиолетового тела расходятся, все в языках холодного пламени, два нежно-лиловых щупальца. Я прищуриваюсь. Нет, это не похоже на щупальца. Это скорее крылья, почти как у нашего корабля. Два треугольника, дальняя сторона каждого из которых мерно вспыхивает волнами свечения и растаёт в бесконечности.

– Мёртвая Голова, – повторяет Гиз. Он смотрит на звезду, чуть склонив голову, и улыбается.

– Какая же это голова? – возмущаюсь я. – У вас, землян, воображение на уровне эритейского полосатого слизня.

Гиз смеётся. Он ведь непрошибаемый.

– Всё может быть, – говорит. – Только ты, Клёник, не понял. На земле есть насекомое, бабочка. Мёртвая голова называется.

Он лезет в карман и вытаскивает оттуда потрёпанный блокнот и механический карандаш. Долго чиркает кнопкой, извлекая грифель, и чертит на бумаге, закусив губу.

– Вот, – Гиз показывает рисунок мне. – Они примерно такие, понимаешь?

На листке изображено крылатое чучело с длиннющими усами.

– Страшно у вас на Земле, наверное, – холодно отзываюсь я.

– Это да, – соглашается Гиз. Лицо у него мрачнеет.

Мне неловко. Я хочу говорить про странную звезду и земных крылатых чудовищ, а этот глупый землянин почему-то молчит и смотрит в потолок.

Наконец я не выдерживаю.

– Гиз, – окликаю я жалобно. – Гиз.

– Сам ты галава, – кажу я.

І нечакана бачу Яе.

У цэнтры, ззяйкая, быццам агранены камень з Арк-маран, быццам светлае азярцо, ля якога я вырас, пульсіравала, як жывое і трапяткое сэрца…

– Зорка? – здзіўляюся я.

У бакі ад іскрыстага фіялетавага цела разыходзяцца, усе ў языках халоднага полымя, два пяшчотна-ліловыя шчупальцы. Я звужваю вочы. Не, гэта не падобна да шчупальцаў. Гэта хутчэй крылы, зусім як у нашага карабля. Два трохкутнікі, дальні бок кожнага з якіх мерна ўспыхвае хвалямі ззяння і растае ў бясконцасці.

– Мёртвая Галава, – паўтарае Гіз. Ён глядзіць на зорку, ледзь апусціўшы голаў, і ўсміхаецца.

– І дзе ж тут галава? – абураюся я. – У вас, зямлян, уяўленне на ўзроўні пласатага эрытэйскага слізня.

Гіз рагоча. Ён жа непрашыбальны.

– Усё можа быць, – кажа. – Толькі ты, Клёнік, не зразумеў. На Зямлі ёсць жамярынка, матыль. Мёртвая галава называецца.

Ён лезе ў кішэню па нататнік і механічны аловак. Доўга чыркае гузікам, выціскаючы грыфель, і крэсліць па паперы, прыкусіўшы вусны.

– Во, – Гіз паказвае малюнак мне. – Яны прыкладна такія, разумееш?

На паперы намалявана (і бяздарна) крылатае пудзіла з доўгімі вусамі.

– Страшна ў вас на Зямлі, напэўна, – з прахалодай азываюся я.

– Гэта ёсць, – згаджаецца Гіз. Твар у яго раптам робіцца змрочным.

Он улыбается и треплет меня по голове.

– Ничего, Клёник, – болтает Гиз весело. – Облетим вокруг этой красотки, вышлем пару зондов, запишем данные и бешеные деньжищи загребём. Купим тебе десять чайников.

Я хмурюсь.

– Зачем мне столько чайников, – ворчу я и усаживаюсь на своё место. На всякий случай проверяю маршрут, проложенный Гизом. Маршрут, в общем-то, скучный: всего-то несколько витков вокруг звезды и сразу назад.

Гиз поднимается на ноги.

– Ты подремли пока, что ли, – это он мне. – А я в отсеке выгрузки зонды подготовлю.

– Подремлешь тут с тобой, – замечаю я надменно. Но лиловатые всполохи в самом деле навевают сон, так что мне даже не слышно, как Гиз уходит из рубки.

И сон какой-то дурацкий.

Будто в Гизовом кресле сидит какая-то землянская девчонка и тихонько насвистывает его любимый мотивчик.

– Эй, – говорит. – Ты не спи на работе, Клёник.

Только я напыжился ей ответить, что вовсе и не сплю, что не её это дело и что её-то здесь и быть не должно, как проснулся.

Мёртвая Голова теперь больше, свечение от неё – ярче. Мы, видно, подлетели ближе. Я зеваю и тру рукой глаза. Гиза в рубке нет – или всё ещё отлаживает зонды, или втихую гоняет в кухонном отсеке чаи.

Мне няёмка. Я хачу размаўляць пра дзіўную зорку і зямных крылатых пачвар, а гэты дурны зямлянін чамусьці маўчыць ды глядзіць у столь. Нарэшце я не вытрымліваю.

– Гіз, – гукаю я жаласна. – Гіз.

Ён усміхаецца і ляпае мяне па галаве.

– Нічога, Клёнік, – пляце ён весела. – Абляцім вакол гэтай прыгажуні, скінем колькі зондаў, запішам дадзеныя і шалёныя грошыкі заграбем. Купім табе дзесяць чайнікаў.

Я насупліваюся.

– На халеру мне столькі чайнікаў, – буркаю я і сядаю на сваё месца. На ўсякі выпадак правяраю маршрут, пракладзены Гізам. Маршрут, па вялікім рахунку, нецікавы: колькі віткоў вакол зоркі і адразу назад.

Гіз падымаецца на ногі.

– Ты паспаў бы пакуль, ці што, – гэта ён мне. – А я ў адсеку выгрузкі зонды падрыхтую.

– Разаспішся тут з табою, – заўважаю я фанабэрыста. Але лілаватыя зарніцы насамрэч навяваюць сон, так што мне нават не чутно, як Гіз сыходзіць з рубкі. І сон дурны нейкі.

Быццам сядзіць у Гізавым фатэлі нахабнае зямлянскае дзяўчо і ціхенька насвістае яго ўлюбёны матыўчык.

– Эй, – кажа. – Ты не спі на працы, Клёнік.

Толькі я намерыўся адказаць нягодніцы, што й не сплю зусім, што не яе гэта справа і што яна тут і быць не мае права, як прачнуўся.

На панели мигает красным лампочка активации люка выхода. Это странно. Гиз, уж на что лентяй и недотёпа, люки всегда до старта проверяет. Ещё разгерметизации нам не хватало.

Я почти что опускаю рычаг закупорки, но тут боковым зрением вижу, что на стенде со скафандрами остался только меньший – мой.

Нет, я не волнуюсь. С чего бы? Только странно это. Незачем Гизу лезть в открытый космос, разве что поломка какая-то. Так ведь всё, вроде бы, благополучно.

«А ведь мог бы летать вторым пилотом на транспортнике, – с тоской думаю я, упаковываясь в скафандр. – Почёт, уважение. Стандартная зарплата и никаких сумасшедших землян. Так нет же, ввязался вот…»

Пока насос откачивает из кабины воздух, я вдавливаю кнопку вызова на рации.

– Гиз, ты придурок, – кричу я в микрофон. – С чего ты полез за борт, не сказавшись? Вот закупорился бы я, так и болтался бы там, пока не посинел.

Гиз молчит. Вечно он молчит, когда виноват.

В узком коридорчике темно, только в конце маячит лиловый просвет – полумесяцем. Я цепляюсь за поручень. Мне страшно. В конце концов, я дипломированный пилот. Я не должен лазить в космос за сбрендившими землянами, моё дело – корабль вести.

– Гиз, – шепчу я. И вспоминаю, что если я упаду с корабля, то падать придётся долго-долго, до самой звезды. Даже пояс, пристёгнутый к поручню, и магнитные подошвы ботинок не особенно обнадёживают.

Мёртвая Галава зараз большая, а ззянне ад яе – ярчэй. Мы, відаць, падляцелі зусім блізка. Я пазяхаю і праціраю вочы рукою. Гіза ў рубцы няма – ці то ўсё яшчэ завіхаецца з зондамі, ці паціху ганяе ў кухонным адсеку гарбату.

На панэлі мільгае чырвоным лямпачка актывацыі люка выхаду. Гэта дзіўна. Гіз, хай сабе лайдак ды недарэка, але люкі да старту правярае заўжды. Яшчэ разгерметызацыі нам не хапала, для поўнага шчасцейка.

Я амаль што апускаю рычаг закупоркі, але тут бакавым зрокам бачу, што на стэндзе з нашымі скафандрамі застаўся толькі меншы – мой.

Не, я не хвалююся. Чаму б? Адно дзіўна гэта. Нашто Гізу перціся ў адкрыты космас, хіба што зламалася што. Але ж усё, здаецца, добра.

«А мог бы лётаць другім пілотам на транспартніке, – з тугою думаў я, упакоўваючыся ў скафандр. – Пачэсна. Паважна. Стандартная зарплата і ніякіх табе звар'яцелых зямлянаў. Ды не ж, увязаўся ж…»

Пакуль помпа выцягвае з кабіны паветра, я таплю гузік выкліку на рацыі.

– Гіз, ты прыдурак, – крычу я ў мікрафон. – З якой гэта радасці ты палез за борт, не сказаўшы? Во закупорыўся б я, то й боўтаўся б там, пакуль не пасінеў.

Гіз маўчыць. Вечна ён маўчыць, калі вінаваты.

У вузкім калідорчыку цёмна, толькі ў самым канцы маячыць ліловы водбліск – паўмесяцам. Я чапляюся за поручань. Мне страшна. У рэшце рэшт, я ды-пламаваны пілот. Я не павінен лазіць у космас за бязглуздымі зямлянамі, мая справа – карабель весці.

– Гіз, – шапчу я. І прыгадваю, што калі ўпаду з карабля, то падаць давядзецца доўга-доўга, да самай зоркі. Нават пояс, прычэплены да поручня, і магнітныя падэшвы ботаў нейк не надта абнадзейваюць.

Гиз обнаруживается почти сразу за люком. Свой пояс он зачем-то отстегнул и торчит, завороженно уставившись на эту чёртову звезду, шагах в десяти от меня.

И рацию он, конечно, не слышит, гад землянский. Меня начинает подташнивать, потому что я понимаю: с пристёгнутым поясом мне до Гиза не добраться.

Звезда нависает над нашими головами, волны сияния отражаются в металлической обшивке корабля. Вернее, это мы с Гизом нависаем над звездой – примагниченные вверх тормашками к металлу. Я с трудом отцепляюсь от поручня и, растопырив руки, медленно ползу к Гизу.

Подползаю – и вцепляюсь в него, дёргаю за рукав.

– Гиз, – хриплю я в микрофон.

А он будто только-только меня услышал.

– Клёник, – говорит. – Ты же вроде спал?

Тут я не выдерживаю. Меня колотит крупная дрожь, а перед глазами плывут разноцветные круги.

– Пойдём-ка назад, Клёник, – говорит Гиз. – Ты не волнуйся. Всё будет хорошо.

Вечно он так говорит. И ничего хорошего никогда не выходит.

Потихоньку, по крошечному шажочку – назад. И такое чувство, будто это я осрамился, вылез полюбоваться на просторы Вселенной, понимаешь ли.

Пока я, лязгая зубами, прихожу в себя, Гиз хлопочет в кухонном отсеке.

– Не буду я твой дурацкий чай, – кричу я ему, забывая все приличия. – Сам его пей, гад землянский! Напейся и ныряй себе в открытый космос, понял?..

Гіз знаходзіцца амаль адразу за люкам. Свой пояс ён чамусь адсцягнуў і тырчыць, зачаравана гледзячы на гэтую тройчы клятую зорку, крокаў за дзесяць ад мяне.

І рацыю ён, канешне, не чуе, гад зямлянскі. Мне амаль робіцца млосна, бо я разумею: з прысцёгнутым поясам мне да Гіза не дабрацца.

Зорка навісае ў нас над галовамі, хвалі ззяння адбіваюцца ў металічнай абшыўцы карабля. Дакладней, гэта мы з Гізам навісаем над зоркай – прымагнічаныя падэшвамі да металу. Я з цяжкасцю адчапляюся ад поручня і, расставіўшы рукі, павольна паўзу да Гіза.

Падпаўзаю – і хапаюся за яго, тузаю за рукаў.

– Гіз, – хрыплю я ў мікрафон.

А ён быццам толькі-толькі мяне пачуў.

– Клёнік, – кажа. – Ты ж, здэцца, спаў?

Тут я не вытрымліваю. Мяне калоціць, а перад вачыма плывуць рознакаляровыя колы.

– Пойдзем назад, Клёнік, – кажа Гіз. – Ты не хвалюйся. Усё будзе добра.

Вечна ён так вось кажа. І ніколі нічога добрага не бывае.

Патроху, па драбочку, па кроку – назад. І такое адчуванне, быццам гэта я дурасць адмачыў, вылез палюбавацца на прастору Сусвету, разумееце.

Пакуль я, ляскаючы зубамі, прыводжу думкі ў парадак, Гіз гаспадарыць у кухонным адсеку.

– Не буду я тваю дурную гарбату, – крычу я яму, забываючыся на ўсе правілы этыкету. – Сам яе пі, гад зямлянскі! Напіся і давай ныpца ў адкрыты космас, ясна?..

Гиз входит с двумя чашками, над которыми вьётся пар.

– Ладно, ладно, – Гиз машет на меня рукой. – Пора первый зонд спускать, Клёник.

Я молчу. Я кручу в руках сломанный чайник и делаю вид, что больше ничто меня не интересует. Гиз, поминутно отпивая из своей чашки, щёлкает клавиатурой.

– Вот, – он откидывается в кресле. – Первый пошёл.

Иллюминатор перечёркивает серебряная искра – это выстреливает зонд. Я щурюсь на Мёртвую Голову. Что-то с ней не так, что-то в ней новое.

– Ты видишь, Гиз? – я даже забываю, что обижен на эту орясину. – На ней же…

На теле лиловой звезды появились пятна – три тёмных жирных точки: две пустые глазницы и оскаленный беззубый рот. Я сглатываю сухой комок в горле и перевожу взгляд на Гиза. Тот смотрит в потолок.

– Гиз, – говорю я. – Ты это видел?

– Что видел, малыш? – отзывается он, а сам всё так же в потолок пялится.

Я морщусь. Он, конечно, раза в два меня выше, только по годам – даже и по землянским – я постарше буду. Но Гиз этого в расчёт никогда не берёт – «малыш» и «малыш».

– Пятна, – я тыкаю пальцем в иллюминатор.

– Подумаешь, пятна, – Гиз зевает. – Нам только два витка осталось, Клёник. И второй зонд выпустить. Потерпи уж.

Я бы ему ответил, только с оппонентом, который уже похрапывает, сложно спорить.

Гіз уваходзіць з двума кубкамі, над якімі ўецца пара.
– Добра, добра, – Гіз махае на меня рукой. – Час першы зонд запускаць, Клёнік.
Я маўчу. Я кручу ў руках зламаны чайнік і раблю выгляд, што болей мяне нічога не цікавіць. Гіз, штохвіліны сёрбаючы з свайго кубка, шчоўкае клавіятурай.
– Во, – кажа ён, адкідваючыся назад у фатэлі. – Першы пайшоў.
Ілюмінатар перакрэслівае сярэбраная іскра – гэта выстрэльвае зонд. Я жмурусь на Мёртвую Галаву. Нешта з ёю не так, нешта ў ёй новае.
– Бачыш, Гіз? – я нават забываюся, што пакрыўджаны на гэтага бамбізу. – На ёй жа…
На целе ліловае зоркі з'явіліся плямы – тры цёмныя тлустыя кропкі: дзве пустыя вачніцы і аскалены бяззубы рот. Я глытаю сухі камок у горле і пераводжу позірк на Гіза. Той глядзіць у столь.
– Гіз, – кажу я. – Ты гэта бачыў?
– Што бачыў, малы? – азываецца ён, а сам па-ранейшаму ў столь вочы лупіць.
Я моршчуся. Ён, канешне, дзесь удвая за мяне вышэйшы, але па гадах – нават і па зямлянскіх – я старэйшым выходжу. Але Гіз гэтага ў разлік ніколі не прымае – «малы» ды «малы».
– Плямы, - я тыцкаю пальцам у ілюмінатар.
– Хай сабе плямы, – Гіз пазяхае. – Нам толькі два віткі засталося зрабіць, Клёнік. І другі зонд выпусціь. Пацярпі ўжо.
Я б яму адказаў, ды з апанентам, які храпе, цяжкавата спрачацца.
Пакрэхтваючы, іду ў кухонны адсек: пасля Гізавай бурды хочацца сапраўднага сірыянскага гакер-ткла. Ды ў нас на караблі стандартная кухонная механіка, і

Покряхтывая, иду в кухонный отсек: после Гизовой бурды хочется настоящего сирианского гаккер-ткла. Но у нас на корабле стандартная кухонная механика, и максимум, на что она способна, – это соевый бульон, обогащённый витаминами.

Бульона мне не хочется. Я подставляю стремянку, поднимаюсь и ставлю сломанный чайник на полку.

– Решил не чинить, а, Клёник?

Оборачиваюсь я – а рядом та самая землянская девчонка стоит. Платье белое. И глаза вроде как у Гиза – светлые, дикие. Жуть, в общем.

– Уйди, – шепчу. А сам чувствую, что все поджилки трясутся.

– Это вам уходить надо, – говорит девчонка и прядку рыжеватых волос на палец накручивает. – Ясно, Клёник?

Я зажмуриваюсь. Мне мучительно хочется проснуться в своём кресле в рубке. Когда я открываю глаза, девчонки больше нет. Я прыгаю на пол и бегу к Гизу.

Тот не спит уже – листает прошлогодний выпуск «Звёздного пилота» и тихонько насвистывает.

– Гиз, – говорю я, пытаясь отдышаться. – Уходить надо. Дурное здесь место.

– Ну? – рассеянно переспрашивает он.

– Гиз, – я сажусь рядом с ним. – Я в своём уме. Но здесь я вижу странные вещи. Надо уходить, Гиз. Ну их, эти деньги.

Гиз поднимает голову. Если уж речь о деньгах, он непременно услышит.

– Глупости, Клёник, – усмехается он. – Не трусь, отважный сирианин.

– Ты чуть не свалился в космос, – мрачно замечаю я. – Это глупости?

максімум, на што яна здольная, – гэта соевы булён, узбагачаны вітамінныміі дадаваннямі.
Булёна мне не хочацца. Я падстаўляю лескі, падымаюся і вяртаю зламаны чайнік на паліцу.
– Вырашыў не рамантаваць, а, Клёнік?
Паварочваюся я – а побач тое самае зямлянскае дзяўчо стаіць. Сукня белая. І вочы на манер Гізавых – светлыя, дзікія. Жудасць, карацей.
– Сыдзі, – шапчу. А сам пачуваю, што ўсе жылачкі ўнутры трасуцца.
– Гэта вам сыходзіць трэба, – кажа дзяўчо і пасму рудаватых валасоў на пальчык накручвае. – Зразумеў, Клёнік?
Я зажмурваюся. Мне пакутліва хочацца прачнуцца ў сваім фатэліку ў рубцы. Калі я расплюшчваю вочы, дзяўчо знікла. Я саскокваю на падлогу і бягу да Гіза.
Той не спіць ужо – гартае мінулагодні выпуск «Зорнага пілота» і ціхутка насвістваe.
– Гіз, – кажу я, спрабуючы аддыхацца. – Драпаць трэба. Благое тут месца.
– Ну? – няўважліва перапытвае ён.
– Гіз, – я сядаю побач з ім. – Я ў сваім розуме. Але тут бачу я дзіўныя рэчы. Трэба сыходзіць, Гіз. Ну іх, гэтыя грошы.
Гіз падымае галаву. Калі размова пра грошы, ён абавязкова пачуе.
– Дурасць, Клёнік, – усміхаецца ён. – Не бойся, адважны сірыянін.
– Ты ледзь не звaліўся ў космас, – змрочна заўважаю я. – Гэта дурасць?
Адказаць Гіз не паспявае: вярнуўся першы зонд.

Ответить Гиз не успевает: вернулся первый зонд.

– Ладно, Клёник, – кивает Гиз. – Проверим сейчас, есть там что опасное или нет.

Сканер крякает и пищит, из него лезет длинная полоса бумаги. Я пробегаю глазами по вереницам букв и цифр. Ничего опасного на самом деле нет.

– Ого, – тут же присвистывает Гиз, который, нависая сверху, заглядывает мне через плечо. – Глянь-ка, Клёник.

Он указывает на один повторяющийся символ.

– Арконий, – еле-еле выдавливаю я.

Редчайший и очень радиоактивный химический элемент, универсальное топливо. По нынешним-то временам, учитывая топливный кризис, за координаты месторождения аркония можно получить баснословную сумму. А тут целая звезда – это сколько же тонн?..

И – больше никаких полётов, никаких разведывательных экспедиций или перевоза контрабанды, никаких ядовитых эритеевских ящеров. Своё поместье у морского залива, дымящийся гаккер-ткла в высоком бокале, созерцание природы и – а почему бы и нет? – литературная работа.

Пока я обдумываю свою блестящую будущность, Гиз глядит на звезду.

– А ведь ты прав, Клёник, – задумчиво говорит он. – Надо уходить.

Я вздрагиваю. Душой я уже на берегу залива.

– Что? – изумляюсь я. – Ты подумай, Гиз, сколько нам отвалят за эти координаты. Особенно какая-нибудь межпланетная корпорация.

Гиз улыбается и качает головой.

– Добра, Клёнік, – ківае Гіз. – Праверым зараз, ці ёсць там што небяспечнае.
Сканер крэкае і вішчыць, з яго лезе доўгая палоска паперы. Я прабягаю вачыма па чародах літар і лічбаў. Нічога небяспечнага і праўда няма.
– Ого, – прысвістваe Гіз, які, навісаючы зверху, зазірае мне цераз плячо. – А ну, зірні сюды, Клёнік.
Ён паказвае на адзін сімвал, які ўсё паўтараецца.
– Арконій, – ледзь выціскаю я.
Самы рэдкі і радыёактыўны хімічны элемент, універсальнае паліва. У нашыя часы, улічваючы галактычны паліўны крызіс, за каардынаты месцараджэння арконія адваляць проста казачныя грошы. А за цэлую зорку (гэта колькі ж тон?) – і ўвогуле нязмераную колькасць.
І – больш ніякіх палётаў, ніякіх разведвальных экспедыцый ці перавозу кантрабанды, ніякіх атрутных эрытэеўскіх гадаў. Сваё памесце ля марскога заліва, дымок над гакер-ткла ў высокім келіху, сузіранне прыроды і – а чаму б і не? – літаратурная праца.
Пакуль я абдумваю свае бліскучыя перспектывы, Гіз глядзіць на зорку.
– А ты маеш рацыю, Клёнік, – задумліва кажа ён. – Трэба сыходзіць.
Я скаланаюся ад нечаканасці. Душою я ўжо на беразе заліва.
– Што? – здзіўляюся я. – Ты падумай, Гіз, колькі нам адваляць за каардынаты. Асаблівая якая-небудзь межпланетная карпарацыя.
Гіз усміхаецца і хітае галавой.
– Усе зямляне вар'яты, – упэўнена кажу я. – Ты забыўся, колькі каштуе арконій?
– Паглядзі, Клёнік, – Гіз паказвае на зорку. – Уважліва паглядзі. Што ты бачыш?

– Все земляне чокнутые, – уверенно говорю я. – Ты забыл, сколько стоит арконий?
– Погляди, Клёник, – Гиз указывает на звезду. – Внимательно погляди. Что ты видишь?
– Арконий, – отвечаю я. – Не блажи, Гиз. Я хочу заработать на безбедную старость.
Звезда вовсю полыхает лиловым. Отсветы ползут по рубке, по лицу Гиза.
– Она ведь красивая, – сообщает мне этот землянский дурень. Притом таким тоном, будто я не замечаю очевидного.
– Ты представь, – продолжает Гиз. – Вот приедет сюда эта твоя корпорация…
– У меня нету корпорации, – угрюмо вставляю я. – Если б была, я бы с тобой по Галактике не мотался.
– Приедет корпорация, – Гиз не обращает на меня внимания. – И всё испоганит, понимаешь, Клёник?
Я негодующе соплю. Мне очень не хочется понимать вещи, которые не сулят ровным счётом никакой выгоды.
– Там, где я вырос, – Гиз всё треплется, а пальцы у самого так и бегают по клавиатуре. – Был старый-престарый лес. Деревья огромные, в три обхвата, а то и больше. Озеро синее-синее, а на дне, в водорослях, спят мидии с ладонь. Берега заболоченные, аисты ходят, высоко поднимая ноги. В траве лягушки с золотыми глазами. Тихо так, спокойно.
– Лягушки? – переспрашиваю я.
– У меня там был любимый дуб, – Гиз вздыхает. – Старый раскидистый дуб. Кора морщинистая, с цепочками муравьёв и очень тёплая, нагретая солнцем. Хороший был дуб, замечательный дуб, понимаешь?

– Арконій, – адказваю я. – Не блазнуй, Гіз. Я хачу зарабіць на бязбедную старасць.
Зорка так і ззяе ліловым. Водбліскі паўзуць па рубцы, па твары Гіза.
– Яна ж прыгожая, – кажа мне гэты зямлянскі дурань. Прычым такім тонам, быццам я не заўважаю відавочнага.
– Ты ўяві, – працягвае Гіз. – Вось прыедзе сюды тая твая карпарацыя…
– Няма ў мяне карпарацыі, – панура ўстаўляю я. – Каб была, я б з табою па Галактыцы не цягаўся б.
– Прыедзе карпарацыя, – Гіз не звяртае на мяне ўвагі. – І ўсё зруйнуе, усё сапсуе, разумееш, Клёнік?
Я з абурэннем саплю. Мне зусім не хочацца разумець рэчы, ад якіх не будзе карысці.
– Там, дзе я вырас, – Гіз усё менціць языком, а пальцы ў самога так і бегаюць па клавіятуры. – Быў стары-стары лес. Дрэвы вялізарныя, у тры абхваты, а мо й болей. Возера сіняе-сіняе, а на дне, у водарасцях, спяць мідыі з далонь велічынёю. Берагі топкія, буслы ходзяць, высока падымаючы ногі. У траве жабкі з залатымі вачамі. Ціха так, спакойна.
– Жабкі? – перапытваю я.
– У мяне там быў любімы дуб, – Гіз уздыхае. – Стары разложысты дуб. Кара зморшчаная, с ланцужкамі мурашоў і надта цёплая, нагрэтая сонцам. Харошы быў дуб, цудоўны дуб, разумееш?
Ён кажа, а я ў ілюмінатар гляджу – і вачам не веру. Няма там ані космасу, ані праклятай ліловай зоркі, а ёсць дзіўнае сіняе – не сірыянскае чырвонае – неба,

Он говорит, а я в иллюминатор гляжу – и глазам не верю. Нет там ни космоса, ни проклятой лиловой звезды, а есть странное синее – не сирианское алое – небо, зелёные травы и чистое синее озеро. Деревья, действительно, в три обхвата. И большое дерево – видимо, дуб, – на высоком берегу. А подальше, ближе к кромке леса, идут, высоко поднимая красные (от холода, что ли?) ноги, невиданные чёрно-белые существа.

– А потом, – говорит Гиз, – этот лес выкупила одна корпорация. На вырубку, понимаешь? И ничего не стало: ни мидий, ни лягушек, ни аистов. Ни моего дуба. Ничего у меня не осталось.

Скажу честно: я, Клёан Иккоро А-Бейрис, трёхсот восьми сирианских лет, дипломированный пилот межзвёздных перелётов В-класса, никогда не считал себя эстетом. Наплевать мне на всю эту бесполезную красоту, особенно если за её координаты мне отвалят солидный куш. И всё-таки…

Я морщу нос и ввожу в компьютер новый курс.

– Всё будет хорошо, Клёник. Правда, – улыбается Гиз. – Вот увидишь.

– Да ну тебя, – ворчу я. – Плакала моя обеспеченная старость… Небось, и этот вылет нам не оплатят? Мол, провалили задание?

Гиз молчит. Он всегда молчит, если виноват.

Звезда, вся в волнах лилового сверкания, медленно уходит вниз. Я, чертыхаясь под нос, обхожу Мёртвую Голову и укладываю корабль на обратный курс. Гиз поднимается и, шаркая по полу, выходит из рубки.

– Починю твоего боевого товарища, – весело бросает Гиз на ходу. Я вздыхаю. Надо будет прикупить шестой электрочайник, раз уж этот всё-таки обречён.

зялёныя травы і чыстае сіняе возера. Дрэвы, і праўда, у тры абхваты. І вялікае дрэва – відаць, дуб – на высокім беразе. А воддаль, бліжэй да лесу, ідуць, высока падымаючы чырвоныя (змерзлі, ці што?) ногі, нябачаныя чорна-белыя істоты.

– А пасля, – кажа Гіз, – гэты лес выкупіла адна карпарацыя. На вырубку, разумееш? І нічога не засталося: ні мідый, ні жабак, ні буслоў. Ні майго дуба. Нічога ў мяне не засталося.

Шчыра скажу: я, Клёан Ікара А-Бейрыс, трохсот васьмі сірыянскіх гадоў, дыпламаваны пілот міжзорных пералётаў В-класа, ніколі не лічыў сябе эстэтам. Напляваць мне на ўсю гэтую непрыдатную прыгажосць, асабліва калі за яе каардынаты мне адваляць ніштаваты куш. І ўсё-ткі…

Я моршчу нос і ўбіваю ў камп'ютар новы курс.

– Усё будзе добра, Клёнік. Праўда, – усміхаецца Гіз. – Вось пабачыш.

– Ды ну цябе, – бурчу я. – Плакала мая забяспечаная старасць… Мяркую, нам і гэты вылет не аплоцяць? Маўляў, правалілі заданне?

Гіз маўчыць. Ён заўжды маўчыць, калі вінаваты.

Зорка, уся ў хвалях ліловага зяння, павольна адыходзіць уніз. Я, лаючыся пад нос, абходжу Мёртвую Галаву і кладу карабель на зваротны курс. Гіз падымаецца і, шоргаючы па падлозе, выходзіць з рубкі.

– Адрамантую твайго баявога таварыша, – весела кідае Гіз ідучы. Я ўздыхаю. Трэба будзе набыць шосты электрачайнік, калі гэты ўсё-ткі асуджаны.

Навокал зноў адно скопішчы міжзорнага пылу ды падазронага касмічнага смецця. Радар вішчыць, і я рву штурвал убок. Паўз нас, паступова выяўляючыся з туману,

Вокруг снова только скопления межзвёздной пыли и подозрительного космического мусора. Радар взвизгивает, и я рву штурвал вбок. Мимо, постепенно проявившись из тумана, дрейфует корабль без опознавательных знаков и без огней, с отключённым двигателем. Радар замолкает на мгновение, точно раздумывая, а потом верещит, как бешеный.

Если верить показаниям аппаратуры, вокруг сотни таких вот мёртвых кораблей.

– Вы правильно поступили, – говорит уже знакомый мне голос.

Я кошу глаза вбок. Девчонка в белом платье стоит, прислонившись к креслу Гиза, и улыбается.

– Всё будет хорошо, Клёник, – прибавляет она, и я почему-то ей верю. В её исполнении эта вечная Гизова присказка звучит как-то убедительнее.

– Клёник? – это уже голос Гиза. Я поворачиваюсь.

Гиз, с нашим старым чайником под мышкой, изумлённо глядит перед собой.

– Могу поклясться, – шепчет он. – Что за…

Девчонка, конечно, уже куда-то подевалась.

– Чертовщина, – бормочет Гиз, усаживаясь в своё кресло, и с грохотом ставит чайник на пол рядом. – Радиация, видимо…

– Чего? – переспрашиваю я. Гиз проверяет курс и включает автопилот.

– Так, показалось, – говорит Гиз. – Ты не волнуйся. Всё будет хорошо, Клёник.

– Это уж точно, – хмыкаю я. – С такими-то нашими успехами…

Гиз улыбается. Ему что, он непрошибаемый.

– Всё равно купим тебе новый чайник, – обещает он. – Или лучше церемониальный набор для гаккер-ткла на двенадцать персон?

дрэйфуе карабель без апазнавальных знакаў і без агнёў, з адключаным рухавіком. Радар змаўкае на імгненне, быццам задумваецца, а пасля верашчыць, як рэзаны. Калі верыць паказанням апаратуры, вакол нас сотні такіх вось мёртвых караблёў.

– Вы правільна зрабілі, – кажа ўжо знаёмы мне голас.

Я кашуся ўбок. Дзяўчо ў белай сукні стаіць, прысланіўшыся да Гізавага фатэля, і ўсміхаецца.

– Усё будзе добра, Клёнік, – дадае яна, і я чамусьці ёй веру. У яе выкананні гэтая адвечная Гізава прымаўка гучыць нейк больш пераканаўча.

– Клёнік? – гэта ўжо голас Гіза. Я паварочваюся.

Гіз, з нашым старым чайнікам пад пахаю, здзіўлена глядзіць перад сабою.

– Прысягнуць магу, – шэпча ён. – Што за…

Дзяўчо, канешне, ужо некуды падзелася.

– Чартаўшчына, – мармыча Гіз, сядаючы ў свой фатэль, і з грукатам ставіць чайнік на падлогу побач. – Радыяцыя, відаць…

– Што? – перапытваю я. Гіз правярае курс і ўключае аўтапілот.

– Так, падалося, – кажа Гіз. – Ты не хвалюйся. Усё будзе добра, Клёнік.

– Анягож, – чмыхаю я. – С такімі нашымі поспехамі…

Гіз усміхаецца. Яму што? Ён непрабівальны.

– Усё роўна купім табе новы чайнік, – абяцае ён. – Ці мо лепей цырыманіяльны набор для гакер-ткла на дванаццаць персон?..

Я ўладкоўваюся зручней, апускаю павекі і павольна засынаю пад Гізаву балбатню.

Я устраиваюсь поудобнее, опускаю веки и постепенно засыпаю под Гизову болтовню.
И снится мне Эльбрус – огромное, белое облако.
И мы с Гизом идём по нему вверх, туда, где видно странное синее небо.
На плече у Гиза его походная сумка, вокруг которой вьётся крылатое земное существо – бабочка.
И я знаю: если добраться до вершины и посмотреть вниз, можно будет увидеть маленькое синее озеро, и старое дерево на его берегу, и чёрно-белых аистов с красными клювами, которые бредут по траве, высоко поднимая ноги.
Я знаю это – и во сне улыбаюсь.

І сніцца мне Эльбрус – вялізнае белае воблака.
І мы с Гізам ідзем па ім туды, дзе відаць дзіўнае сіняе неба.
На плячы ў Гіза ягоная паходная торба, вакол якой уецца крылатая зямная істота – матыль.
І я ведаю: калі дабрацца да вяршыні і зірнуць уніз, можна будзе пабачыць белых буслоў з чырвонымі дзюбамі, буслоў, якія ідуць па траве, высока падымаючы ногі.
Я ведаю гэта – і ў сне ўсміхаюся.

Ольга Черкас

Перевод на белорусский язык Татьяны Сивец

Вольга Чэркас

Пераклад на беларускую мову Таццяны Сівец

Ольга Черкас родилась 30 июня 1984 года в г. Бобруйске. В июне 2009 года окончила Литературный институт им. А. М. Горького с красным дипломом по специальности «Литературный работник (отделение прозы)». Является аспиранткой Литературного института им. А. М. Горького на кафедре общественных наук (специализация: философия и эстетика). Лауреат премии альманаха молодых писателей «Пятью пять» имени Александра Филимонова, дипломантка конкурса Молодых писателей Республики Беларусь «Дебют-слово.doc», автор прозаических сборников «У зеркала» (2001), «Проща» (2009). Имеет публикации в журнале «Новая Немига Литературная» (Беларусь), альманахе «Пятью пять», научно-художественные публикации в различных изданиях Москвы.

Вольга Чэркас нарадзілася 30 чэрвеня 1984 года ў г. Бабруйску. У чэрвені 2009 года скончыла Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага з чырвоным дыпломам па спецыяльнасці «Літаратурны работнік (аддзяленне прозы)». З'яўляецца аспіранткай Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага на кафедры грамадскіх навук (спецыялізацыя: філасофія і эстэтыка).

Лаўрэат прэміі альманаха маладых пісьменнікаў «Пятью пять» імя Аляксандра Філімонава, дыпламантка конкурсу Маладых пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь «Дэбют-слова.doc», аўтар празаічных зборнікаў «У зеркала» (2001), «Проща» (2009). Мае публікацыі ў часопісе «Новая Няміга Літаратурная» (Беларусь), альманаху «Пятью пять», навукова-мастацкія публікацыі ў разнастайных выданнях Масквы.

00:00

Если человеку случается в жизни прожить один день, он должен помнить о нём и отмечать его как единственное рождение.

Надышаться! Я никогда не жила раньше! Кажется – только начинаю. Я всё время оставляла жизнь назавтра, а потом я увидела это завтра на расстоянии – и испугалась. Когда будет это завтра? И будет ли?
Я начала. Живу!
6.00
Мне приснилось, что я целовала нелюбимого человека… при живом – любимом. Если приснилось, значит, думала об этом, значит, действительно, когда-то мечтала поцеловать. Мне бы не хотелось, чтобы так было. Мне не нравится, что этот сон был приятен, и я проснулась изнеженной. Не вынуждайте меня плакать в начале жизни. Не смотрите так бесчеловечно! Простите, ну, простите же!..
Что вы наделали! Я – плачу…
6.15
Я люблю становиться на утреннюю молитву. Разум спит. И он не сопротивляется. И только сердце стучит, гармонично сливаясь с ритмом молитвы. «…но страхом зовём в полунощи: Свят, Свят, Свят еси, Боже, Богородицею помилуй нас…» Не все слова молитвы проникают в душу, но те, которым открывается она, – ещё долго греют меня днём. А иные – страшат… И хо-

00:00

Калі чалавеку надараецца ў жыцці пражыць адзін дзень,
ён павінен памятаць пра яго і адзначаць яго як адзінае нараджэнне.

Надыхацца! Я ніколі не жыла раней! Здаецца – толькі пачынаю. Я ўвесь час пакідала жыццё назаўтра, а потым я ўбачыла гэтае заўтра на адлегласці – і спалохалася. Калі яно будзе, гэтае заўтра? І ці будзе?
Я пачала. Жыву!
6.00
Мне прыснілася, што я цалавала нялюбага чалавека... пры жывым – каханым. Калі прыснілася, значыць, думала пра гэта, значыць, сапраўды, калісьці марыла пацалаваць. Мне б не хацелася, каб так было. Мне не падабаецца, што мне было прыемна ў гэтым сне, і я прачнулася з адчуваннем пяшчоты. Не хочацца плакаць у пачатку жыцця. Не пазірайце так бесчалавечна! Прабачце, ну, прабачце ж!..
Што вы нарабілі! Я – плачу...
6.15
Я люблю ўставаць на ранішнюю малітву. Розум спіць. І не супраціўляецца. І толькі сэрца стукае, гарманічна зліваючыся з рытмам малітвы. «...але са страхам усклікнем апоўначы: Святы, Святы, Святы Ты, Божа, праз Багародзіцу памілуй нас...» Не ўсе словы малітвы пранікаюць у душу, але тыя, якім адкры-

рошо, что – так. Когда это будет?.. «паче снега убелюся… и по сне нощнем возсияй ми день безгрешен…»?
«Врача рождшая, уврачуй души моея многолетныя страсти…
нова сотвори мя… струю давай мне слезам, Пречистая, души моея скверну очищающи». А главное: «…или хощу, спаси мя, или не хощу, Христе, Спасе мой…» Чаще всего повторяю это: «или хощу или не хощу…» – чувствую такую силу сопротивления добру. Что с ней делать? Лечить – как?
6.40
Я сегодня с особенной радостью делаю дыхательную гимнастику. Хочется набрать полной грудью воздух. Так набрать, чтобы закружилась голова. Открываю форточку и трогаю ладошкой морозный воздух. Холодно. Но иногда приятно замерзать. И сегодня – мне приятно.
7.00
Чистила зубы. Умывалась. Не смотрела в зеркало. Боялась не увидеть там ничего нового. А старое я видела в нём много раз.
7.30
Я закрыла дверь комнаты и наконец-то разглядела сапоги. Они никогда не казались мне такими рыжими, как сегодня. А сегодня они вопиюще рыжие! Как они рыже улыбаются мне! Я побежала по морозу с голой головой закрывать больничную справку.
– Какой сегодня мороз сильный! – сказала старушка, сидящая напротив меня.
– Не столько мороз – ветер сильный!
– Ветер сильный. Еле дошла!

ваецца яна, – яшчэ доўга сагравaюць мяне днём. А іншыя – страшаць... І добра, што – так. Калі гэта будзе?.. «І буду за снег бялейшай... і пасля сну начнога дай заззяць нада мною дню бязгрэшнаму...»?

«Ты, Якая Лекара нарадзіла, вылечы душы маёй шматгадовыя страсці... Новай зрабі мяне... Дай ліцца слязам маім, Прачыстая, душы маёй нечыстату ачышчаючы». А галоўнае: «…Але ці хачу, ці не хачу, спасі мяне, Хрысце Спасіцелю мой...» Часцей за ўсё паўтараю гэта: «ці хачу, ці не хачу...» – адчуваю такую сілу супраціўлення дабру. Што з ёй рабіць? Лячыць – як?

6.40

Я сёння з асаблівай радасцю раблю дыхальную гімнастыку. Хочацца набраць поўныя грудзі паветра. Так набраць, каб закружылася галава. Адчыняю фортку і кранаю далонькай марознае паветра. Холадна. Але часам прыемна мерзнуць. І сёння – мне прыемна.

7.00

Чысціла зубы. Умывалася. Не глядзела ў люстэрка. Баялася не ўбачыць там нічога новага. А старое я бачыла ў ім шмат разоў.

7.30

